
ПАТЭНЦЫЯЛ АСАБЛІВЫХ ДЗЯЦЕЙ 7

ШЧАСЛІВЫЯ ГАДЫ РАЗАНАВЫХ 11




Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

6 СНЕЖНЯ 2022 г. АЎТОРАК № 239 (29861)


## КОРАТКА

- Святочную ілюмінацыю пачнуць уключаць у Мінску з 15 снежня.
- Каля 300 удзельнікаў збярэ ў Магілёве міжнародны фестываль творчасці людзей з інваліднасцю.
- Трэць беларускіх маладзёжных грамадскіх аб'яднанняў уключана ў дабрачынную дзейнасць.

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Уладзімір АНДРЭЙЧАНКА, Старшыня Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу:**

*«Праціўнікі не шкадуюць сродкаў і намаганняў, каб затармазіць інтэграцыйныя працэсы на постсавецкай прасторы і ў рамках Вялікай Еўразіі асабліва. Іх мэта — захаваць свабодны доступ да прыродных рэсурсаў, пажадана практычна за бясплатна, як гэта было ў 90-я гады мінулага стагоддзя. ЗША і іх саюзнікі не спыняюцца ні перад чым, нават перад глабальнай катастрофай. І трэба разумець, што выстаяць у гэтай барацьбе за выжыванне можна толькі разам. Безумоўна, у кожнай з краін АДКБ ёсць свае нацыянальныя інтарэсы. Іх неабходна паважаць і ўлічваць пры выпрацоўцы сумеснай стратэгіі дзеянняў, але мы павінны бачыць і тое, што сёння пад пагрозай само існаванне нашых краін і народаў. Наша найпершая задача — не дапусціць дэстабілізацыі ў рэгіёне, дакладна вытрымліваць свае саюзніцкія абавязацельствы, адстойваць тое, у чым кроўна зацікаўлены нашы грамадзяне — мір, эканамічнае развіццё, агульныя каштоўнасці».*

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

# «ТРЭБА РЫХТАВАЦЬ У СЯБЕ ЎРАЧОЎ, ЯКІЯ БУДУЦЬ ПРАЦАВАЦЬ НА САВЮ КРАІНУ»

### Прэзідэнт заслухаў даклад міністра аховы здароўя і анансаваў праверку бальніц у рэгіёнах


Фота БелТА.

**Рабочы тыдзень у Палацы Незалежнасці пачаўся з абмеркавання пытанняў, якія датычацца кожнага, — з аховы здароўя. Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка прыняў з дакладам міністра аховы здароўя Дзмітрыя Піневіча. На парадку дня — самыя вострыя праблемы. Але перш чым да іх перайсці, кіраўнік дзяржавы падзякаваў беларускім медыкам за барацьбу з каранавірусам, да гэтай тэмы ён неаднойчы ўжо вяртаўся. «Мая падзяка сістэме аховы здароўя і дактарам не за тое, што яны лячылі, а за тое, што, не ведаючы, як лячыць, навучыліся. Сёння мы ўжо можам сказаць, што ніхто так у свеце не справіўся з гэтай праблемай, як гэта было зроблена ў Беларусі. Не толькі таму што ў нас сістэма аховы здароўя правільна сарыентавалася. Гэта яшчэ раз гаворыць аб тым, што пад кантролем жорсткім і ціскам сістэма аховы здароўя працуе», — сказаў Прэзідэнт.**

СТАР. 2

Размова па сутнасці

# БАЦЬКІ І ДЗЕЦІ. ВЕРСІЯ 2.0

### Ці ёсць у пакалення «Z» будучыня?

**Тэма ўзаемаадносін пакаленняў старая як свет. Кожны раз старэйшыя знаходзяць, чым папракнуць маладых. Тым, што не шануюць традыцыі, напрыклад. Кожны раз малодыя гавораць, што яны нясуць новыя ідэі, якія старэйшым проста не зразумець... А праз дваццаць гадоў гэтыя самыя маладыя ўжо павучаюць і папракаюць сваіх дзяцей... Так было, ёсць, так, напэўна, і будзе надалей. Адзін з трывалых законаў светаўладкавання...**

**Але, пагадзіцеся, яшчэ ніколі разрыў паміж пакаленнямі не быў такі відавочны. Сённяшнія маладыя, дзеці ўжо XXI стагоддзя, — нібы прышэльцы з іншай планеты з нязменным гаджэтам у руках і кліпавымі думкамі ў галаве. Што з імі рабіць — зразумець і дараваць, пусціць на самацёк, пачаць выхоўваць, нават без іх на тое жадання? Якія сёння ў іх каштоўнасці, ці ёсць у іх каштоўнасці ўвогуле? Ці ёсць у іх будучыня, урэшце?**

СТАР. 4-5



Настрой — навагодні

# Калі ласка, у белавежскую казку!

### У рэзідэнцыі беларускага Дзеда Мароза сустрэлі Снягурку


Фота БелТА.

**Падаецца, не так і даўно адкрывалі ў Белавежскай пушчы рэзідэнцыю галоўнага беларускага Дзеда Мароза, а налета будзе ўжо 20 гадоў. Каля двух мільёнаў гасцей-наведвальнікаў сустрэлі тут за гэты час. Ці справіўся б дзядуля адзін з такой работай? Мабыць, не. А стаміўся б, дык яшчэ, чаго добрага, збег ад нас на які халодны полюс... Але наш галоўны навагодні чараўнік пачувае сябе добра ў векавым лесе, бо ў яго шмат памочнікаў. І першая сярод іх — казачная ўнучка Снягурка.**

Летам яна жыве ў Антарктыдзе, а на зіму прыязджае сюды, у пушчу, каб дарыць людзям навагодні настрой і падарункі, дапамагаць разбіраць вялікую пошту. А лісты ў памесце прыносяць мяхамі. Пішуць чараўніку дзеці і дарослыя. Малыя найчасцей просяць падарункаў. Не так даўно, напрыклад, адна бадзёрая пенсіянерка прапанавала дзядулю сябе ў жонкі, пісала, што на пераезд у пушчу згодная. Давялося адпісаць, што дзед ужо каля тысячы гадоў шчаслівы ў шлюбе з Матухнай-Зімой. Дык вось...

СТАР. 3

ISSN 1990 — 763X


# Кожны дзень – з любімай «Звяздой»!

**Усім, хто падпісаўся на I квартал або I паўгоддзе 2023 г., — у падарунак чатыры календары: насценны, рэлігійны, народны і месячны.**



# «ТРЭБА РЫХТАВАЦЬ У СЯБЕ ЎРАЧОЎ, ЯКІЯ БУДУЦЬ ПРАЦАВАЦЬ НА СВАЮ КРАІНУ»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Аляксандр Лукашэнка расказаў адну гісторыю, якая, па яго словах, вельмі важная для гэтай размовы. У адну з паездак у родную вёску да кіраўніка дзяржавы проста пасярод вуліцы звярнуўся мужчына з просьбай выратаваць жанчыну, якая ляжала ў Шклоўскай бальніцы і была пры смерці. Дзякуючы ўмяшальніцтву Прэзідэнта хворую перавезлі ў Магілёў. «Практычна кожны вечар мне дакладвалі аб стане чалавека, асацыяльнага, але ўсё роўна для мяне ён чалавек. Цэлы букет хвароб і двухбаковая пнеўманія... У Шклоўскай бальніцы я яе практычна выцягнуў з морга, сёння яна адключаная ад апарата ШВЛ, дынаміка, кажуць, нядрэнная», — расказаў Аляксандр Лукашэнка.



Фота БелТА

Па словах Прэзідэнта, яго зацікавіла тая гісторыя не толькі таму, што на коне стаяла чалавечае жыццё. Кіраўнік дзяржавы вырашыў праверыць, як спрацуюць вышэйшыя ўстановы. Па словах Прэзідэнта, у сувязі з дадзенай сітуацыяй у яго ўзнікла пытанне да Дзмітрыя Піневіча. «Ці вас крыху панесла ў сістэме, і вас як міністра, і вы лечыце толькі там, дзе трэба лячыць? Ці вы будзеце лячыць людзей так, як я ад вас заўсёды патрабаваў? Мяне гэта вельмі насцярожвае. Начальнікі, яшчэ хто, ну я ў бальніцу пакуль, дзякуй богу, не езджу — вось тут вы лечыце. А людзі прасцейшыя няхай у нейкіх раённых бальніцах... Ну, ёсць там ФАП. Ходзіць фельчар, яйка дадуць, выпіць сто грамаў дадуць, як у былыя часы я гэта назіраў, добра. Не — нічога».

Кіраўнік дзяржавы папярэдзіў, што ў хуткім часе ім будзе створана мабільная група абсалютна незалежных ад Міністэрства аховы здароўя людзей, спецыялістаў, якія правераць сістэму і выбарачна нечакана правераць бальніцы. «Наракайце на сябе», — папярэдзіў Прэзідэнт адказных за ахову здароўя ўдзельнікаў нарады. «Я падумаў: Шклоўскі раён, я там бываю часта. Натуральна, калі Прэзідэнт наведвае нейкае месца, там ахова здароўя працуе з рэзервамі. Калі там так, дык вось я тыдзень не сплю і думаю: як у іншых раённых бальніцах. Вось я хачу вас перасцерагчы, што літасці вам не будзе. І ніякае лячэнне вялікіх начальнікаў вас не выратуе. Разумейце мяне, як хочаце. Адзін у адзін, што я сёння сказаў, пачуе ўся краіна і не толькі. Да нас прыкаваны погляды многіх дзяржаў, мільёны людзей гэта пачуюць. Калі ласка, зрабіце адпаведныя высновы. Схавацца камусьці за спіну кагосьці або, як я часта кажу, пад плінтус залезці не атрымаецца. Паказваць актыўную дзейнасць, што мы «вялікія» — нам гэта ў краіне не трэба. У нас дзяржава для народа, ну дык народ трэба лячыць», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка. Ён упэўнены, што ў краіне ёсць усё, каб лячыць людзей на патрэбным узроўні. І ковід паказаў, што дактары ў краіне добрыя.

Нават калі ў ВНУ ёсць недапрацоўкі па падрыхтоўцы медыкаў, то ў лячэбных установах настаўніцтва добра развітае. «Я не хачу рабіць глыбока высновы з гэтага выпадку. Але ён паводзіць на разважанні», — заўважыў кіраўнік дзяржавы і перайшоў да бягучай сітуацыі.

## «РЫХТАВАЦЦА ДА ЎСЯГО: РОЗНАЕ МОЖА БЫЦЬ»

Прэзідэнт нагадаў, што нядаўна абмяркоўвалі пытанні бяспекі нашай краіны, што вельмі важна і актуальна. Задзейнічаны былі ўсе, у тым ліку і ахова здароўя: ад медыцынскіх аптэчак да прывядзення ў нармальны стан лячэбных установаў. Падключаюцца і ваенныя медыкі. Па словах кіраўніка дзяржавы, трэба «рыхтавацца да ўсяго: рознае можа быць».

Аляксандр Лукашэнка закрануў вельмі важную тэму — рэспіраторныя інфекцыі. Па яго словах, сёння гэта актуальна як ніколі. «Як увогуле ідуць тут справы? І грыпуюць людзі, ковід яшчэ не зусім сышоў...» — адзначыў ён. З гэтага вынікае яшчэ адно пытанне — вакцыны. Прэзідэнт падзякаваў кітайскаму народу і свайму сябру Сі Цзіньпіну за дапамогу. Але свае вакцыны вырабляюцца і ў Беларусі, ствараецца свая база, каб адысці ад імпарту. Таму пытанне імпартазамяшчэння таксама мае значэнне для сістэмы аховы здароўя.

Кіраўнік дзяржавы пацікавіўся, як ідуць справы з лекавым забеспячэннем, з развіццём матэрыяльна-тэхнічнай базы. Прэзідэнт нагадаў, што ён даручаў падтрымаць медыкаў у час ковіду, наколькі магчыма, па заработнай плаце. Зрабілі, ковідныя надбаўкі перавялі ў заработную плату. Аляксандр Лукашэнка назваў такі шлях правільным, але звярнуў увагу, што не трэба забываць і пра мадэрнізацыю бальніц. «У нас нямнога засталося месцаў, дзе бальніцы ўвогуле ніякія. Вельмі мала месцаў, таму там мы павінны скончыць або мадэрнізацыю, або будаўніцтва бальніц. Трэба матэрыяльна падтрымаць тых, хто працуе. У нас ёсць нянечкі і сярэдні медыцынскі персанал, медыцынскія сёстры, у іх таксама работы вышэй галавы, і дактары. Трэба падтрымліваць і рабіць так, каб у нас не было ніякага дэфіцыту», — канстатаваў ён.

У сувязі з гэтым Прэзідэнт пацікавіўся сітуацыяй з кадрамі ў медыцыне.

«Я ведаю, вы зрабілі моцныя крокі ў плане адукацыйным. Рухаемся да таго, каб набіраць дактароў такіх, каб, калі яны скончаць вучобу, мы ведалі, куды яны паедуць без усялякага размеркавання. Яны прыйдуць і будуць ведаць, куды паедуць, таму што ў іх ёсць дагавор. Нічога страшнага. Трэба рыхтаваць у сябе ўрачоў, якія будуць працаваць на сваю краіну. Баяцца гэтага нельга», — сказаў Аляксандр Лукашэнка і пацікавіўся, якая кадравая сітуацыя ў ахове здароўя менавіта цяпер.

## «МЫ ПРЫНЯЛІ ЎСЕ ПРЭВЕНТЫЎНЫЯ МЕРЫ»

Міністр аховы здароўя Дзмітрый Піневіч далажыў, што эпідэмічная сітуацыя цалкам пад кантролем, колькасць захварэлых з каранавіруснай інфекцыяй менш за тры працэнты. «Мы сёння назіраем невялікі прырост захворвання пераважна сярод непрышчэпленых асоб, лёгкія або сярэднецяжкія выпадкі захворвання. Цяпер надыходзіць так званая трыдэмія — каранавірус, вірус грыпу і рэспіраторны вірус. Мы спакойныя ў гэтым плане, таму што супраць каранавіруснай інфекцыі ў нас прышчэплена насельніцтва — 72 працэнты. Гэта вышэй, чым у Расіі, вышэй, чым у Польшчы, чым у Балканскіх краінах. Фактычна гэта сярэднееўрапейскія паказчыкі», — сказаў ён. Міністр далажыў, што практычна 39 працэнтаў насельніцтва ўжо прышчэплена супраць грыпу. «Мы прынялі ўсе прэвентыўныя меры, не выкарыстоўваючы ніякага адміністрацыйнага ціску, — тое, што было вашым даручэннем. Комплекс медыцынскіх мерапрыемстваў праводзіцца, мы не расслабляемся. Ёсць медыкаменты, іх дастаткова», — сказаў ён.

**Валерыя СЦЯЦКО.**

### У тэму

Пасля рабочай сустрэчы з Прэзідэнтам міністр аховы здароўя Дзмітрый Піневіч растлумачыў, чаму медыкі спакойныя наконт сезонных рэспіраторных захворванняў.

«Ахопы вакцынацыі супраць каранавіруса і грыпу выкананыя, — тыя лічбы, якія мы хацелі б бачыць у якасці эпідэміялагічнага дабрабыту. Гэта дазваляе нам лічыць, што пройдзем гэты эпідэмічны сезон дастаткова спакойна», — сказаў ён. Па словах міністра, няма асаблівых праблем і з забеспячэннем лекамі і абсталяваннем. Дзмітрый Піневіч расказаў, што каля 22—25 адзінак з цяжкага медыцынскага абсталявання знаходзіцца ў рамонце: «Гэтыя лічбы характэрныя, на жаль, для 2021—2022 гадоў, яны звязаны з лагістычнымі цяжкасцямі, з пастаўкамі запасных частак. Мы праводзім дакладную пазіцыю пераарыентавання закупкі медыцынскага абсталявання з іншых рынкаў. У нас ужо з'явілася цяжкае абсталяванне высокага класа вытворчасці Кітая, і мы задаволены», — удакладніў міністр. Акрамя таго, некаторыя кампаніі з Заходняй Еўропы лакалізуюць сваю вытворчасць абсталявання і камплектуючых у індустрыяльным парку «Вялікі камень». А гэта азначае, што з часам складанасці з пастаўкамі медыцынскага абсталявання і камплектуючых будуць мінімізаваны.

Ёсць некаторыя цяжкасці з забяспечанасцю лекавымі прэпаратамі. Каля 10 пазіцый Міністэрства аховы здароўя трымае на асаблівым кантролі, гэты пералік мяняецца ад месяца да месяца. У цэлым па ўсіх пазіцыях маецца запас медыкаментаў на тэрмін ад паўтара месяца да паўтара года. Пры гэтым рост цэн на лекі з пачатку гэтага года склаў каля 4,6 %, што значна менш за інфляцыю па нехарчовай групе тавараў. Па словах Дзмітрыя Піневіча, гэта стала магчымым дзякуючы кантролю з боку міністэрства і выпрацоўцы сумесных рашэнняў з пастаўшчыкамі імпартных лекаў.

Міністр таксама падкрэсліў, што пытанне падрыхтоўкі медыцынскіх кадраў — адно з самых складаных у любой дзяржавы. Ён расказаў, якія меры для яго вырашэння прымаюцца ў Беларусі. Першая мера — практыка прымянення мэтавых набораў з асаблівым механізмам. Другая — выплата ковідных надбавак усім медыцынскім работнікам. Трэцяя мера — урадам адпрацаваны праект нарматыўнага акта аб арэндным жыллі. Спецыялісты, якія жывуць у арэндным жыллі, праз пэўны час могуць на льготных умовах яго выкупіць. Чацвёрты блок — абсталяванне працоўных месцаў, зацікаўленасць у прафесійным росце. «Зразумела, калі спецыяліст працуе з новым абсталяваннем, у новых сценах, гэта ўплывае на тое, каб ён застаўся на гэтым рабочым месцы. І шмат што залежыць ад кіраўнікоў», — падкрэсліў Дзмітрый Піневіч. Міністр звярнуў увагу, што львіная доля якасці аказання медыцынскай дапамогі — кадры. «Мы можам абсталяваць, можам зрабіць новыя сцены. Але калі доктар або медыцынскі спецыяліст не выконвае ўсё, што трэба яму выканаць, тады і атрымліваюцца такія выпадкі, пра якія гаварыў Прэзідэнт. Безумоўна, узровень аказання медыцынскай дапамогі ў абласной бальніцы павінен быць вышэйшы, чым у раённай. Але, калі ў раённай бальніцы ёсць рэанімацыя і анестэзіялогія, яны павінны выконваць свае функцыі. Праблемы ў гэтым ёсць. Таму гэта зараз будзе нашай найважнейшай задачай», — канстатаваў ён.

# «НІ ВЫ, НІ МЫ ВАЙНЫ НЕ ХАЦЕЛІ І НЕ ХОЧАМ»

## Прэзідэнт Беларусі ў суботу правёў рабочую сустрэчу з міністрам абароны Расіі Сяргеем Шайгу

**Звяртаючыся да кіраўніка абароннага ведамства суседняй краіны, Аляксандр Лукашэнка выказаў меркаванне, што міністр абароны Беларусі расказаў свайму калегу з Расійскай Федэрацыі аб сітуацыі ў нашай краіне, аб падрыхтоўцы, баявым зладжванні падраздзяленняў Беларусі і Расіі, якія прысутнічаюць на нашай тэрыторыі.**

«Павінен сказаць, што мы сур'ёзна да гэтага падышлі, — адзначыў кіраўнік дзяржавы. — І нашы, і вашы афіцэры рыхтуюць хлопцаў. І беларусаў, і расіян рыхтуюць. Для таго, каб у выпадку неабходнасці першыя шэрагі нашы — абаронцы Саюзнай дзяржавы — змаглі адбіць любую агрэсію. Ад аптэчак медыцынскіх да... Я ўжо не гавару там пра абмундзіраванне і іншае, узбраенне. Тут ніхто не дзеліцца: мы як адзіная групоўка, адзіная армія сёння рыхтуемся. Усе пра гэта ведаюць. Мы гэта не хавалі. Ды і ў сучасным свеце схаваць гэта немагчыма».

Беларускі лідар заўважыў, што нікога не збіраецца палохаць, і выказаўся наконт гатоўнасці апанентаў да ўрэгулявання сітуацыі. «Я не збіраюся тут нікога палохаць, вы — тым больш, — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. — Усе ўжо і так напалоханы-перапалоханы. Але калі яны хочуць, каб мы мірна жылі ў нашым рэгіёне, нягледзячы на тое як на гэта глядзяць з-за акіяна, і Расія, і Беларусь да гэтага гатовыя. Калі яны хочуць ваяваць да апошняга ці то ўкраінца, ці то ўжо там паляка, ці яшчэ наёмнікаў, ну гэта іх справа, гэта іх права. Пакуль, напрыклад, я і нашы спецслужбы не бачаць, каб яны былі гатовыя да паўнапраўных перагавораў і па-чалавечы дамаўляцца. Яны бачаць, на нашу думку, як прадоўжыць вайну. Ну тады спецыяльная аперацыя не спыніцца. Напэўна, вы гэта лепш ведаеце. Усё, што беларусы па адкрытым, рэальным дагаворы павінны зрабіць, мы зробім. Вы ў гэтым не сумнявайцеся».

Па словах кіраўніка дзяржавы, у кусты ніхто не хаваецца. «Мы адкрыта заявілі сваю пазіцыю, — адзначыў ён. — Ні вы, ні мы вайны не хацелі і не хочам. Добра, што зусім нядаўна (вы, напэўна, адсачылі) той прэзідэнт Парашэнка (экс-прэзідэнт Украіны Пётр Парашэнка. — **Заўв. «Зв.»**) выказаўся, навошта яму патрэбен быў «Мінск» — гэтыя перагаворы ў 2014 годзе і гэтак далей. Аказваецца, ён рыхтаваўся да вайны. Ну што тады нас абвінавачваць, што мы ў чымсьці вінаватыя... Ну рыхтаваўся да вайны, так сёння і расхлёбваюць гэтую сітуацыю».

Сяргей Шайгу падзякаваў беларускаму боку за гасціннасць, у першую чаргу ў адносінах да вайскоўцаў, якія знаходзяцца ў Беларусі ў складзе сумеснай рэгіянальнай групоўкі войск. «Яны сапраўды адчуваюць сябе тут як дома, — расказаў міністр абароны Расійскай Федэрацыі. — Гасцінны народ, які акружае іх, і, зразумела, у першую чаргу вайскоўцы, робяць усё для таго, каб з'явілася вялікая вывучка, больш баявое зладжванне. Таму дзякуй, Аляксандр Рыгоравіч. Я прыехаў з найлепшымі пажаданнямі ад нашага Прэзідэнта. Гатовы абмеркаваць тэмы, пра якія вы размаўлялі па тэлефоне, на мінулай сустрэчы».

**Паводле БелТА.**

Міжпарламенцкае ўзаемадзеянне

# НОВЫ ІМПУЛЬС СУПРАЦОЎНІЦТВА

## Парламенцкая дэлегацыя Рэспублікі Куба з афіцыйным візітам наведала Беларусь

**У рамках візіту адбылася сустрэча кіраўніцтва абедзвюх палат парламента з кубінскай дэлегацыяй на чале са старшынёй Нацыянальнай асамблеі народнай улады Хуанам Эстэбанам Ласо Эрнандэсам. Паміж Нацыянальным сходам Беларусі і Нацыянальнай асамблеяй народнай улады Кубы падпісаны мемарандум аб супрацоўніцтве.**

Як адзначыла **Старшыня Савета Рэспублікі Наталля КАЧАНАВА**, для плённага супрацоўніцтва Беларусі і Кубы ёсць усе перадумовы. «Гэта сяброўскія і добрыя адносіны, якія гістарычна склаліся і развіваюцца паміж нашымі краінамі абсалютна па ўсіх напрамках, — акцэнтавала ўвагу яна. — Вядома, вельмі важныя гандлёва-эканамічныя, палітычныя ўзаемаадносіны, добрыя адносіны паміж прэзідэнтамі нашых краін. Гэта надае танальнасць адносінам паміж парламентарыямі нашых краін. Але не менш важнае супрацоўніцтва ў гуманітарнай сферы — тое, да чаго мы падышлі ў адносінах. Для нас вельмі важна супрацоўніцтва ў сферы навукі, адукацыі, медыцыны, культуры. Гэта тое, што з'яўляецца будучым падмуркам для пакаленняў, якія ідуць за намі».

**Старшыня Палаты прадстаўнікоў Уладзімір АНДРЭЙЧАНКА** перакананы: дзвюм краінам неабходна наладзіць больш цесную каардынацыю, перш за ўсё ў міжпарламенцкіх арганізацыях. «Парламентарыі павінны адыгрываць больш значную ролю ў паглыбленні гандлёва-эканамічнага супрацоўніцтва, — падкрэсліў ён. — Нам трэба актыўна падключацца да работы беларуска-кубінскай камісіі па гандлёва-эканамічным супрацоўніцтве. Сёлета адбылося пасяджэнне гэтай камісіі ў Гаване, прынята дарожная карта. У ёй прапісаны вельмі важны напрамак аб нарошчванні ўзаемных паставак тавараў па $30 млн з кожнага боку. Парламентарыям гэта пытанне трэба ўзяць пад сур'ёзны кантроль. Гэты патэнцыял гандлёва-эканамічнага супрацоўніцтва трэба раскрываць для выхаду на рынкі трэціх краін».

У гэтым ёсць узаемны інтарэс. Для Беларусі Куба — вароты на вялікі рынак Лацінскай Амерыкі, Венесуэлы, Балівіі і іншых буйных дзяржаў. Для Кубы ж вялікую цікавасць уяўляе аб'ёмны рынак еўразійскай эканамічнай прасторы. Беларусы гатовы аказваць кубінскаму боку неабходнае садзейнічанне для нарошчвання паставак запатрабаванай кубінскай прадукцыі на рынак ЕАЭС.

**Старшыня Нацыянальнай асамблеі народнай улады Кубы Хуан Эстэбан Ласо ЭРНАНДЭС** адзначыў: «Мы як парламентарыі павінны, як ніхто іншы, разумець, што няма нічога вышэйшага за народ. І, як прадстаўнікі гэтага народа, мы павінны яму адпавядаць і знаходзіцца на тым жа ўзроўні, што і народ».

**Паводле БелТА.**

Блізкая ўлада

# Камфортнае асяроддзе і дарогі

**Структура зваротаў да кіраўніка Гродзенскай вобласці падчас прамой тэлефоннай лініі застаецца традыцыйнай. Уладзімір КАРАНІК выслухаў просьбы і прапановы жыхароў вобласці. Усяго губернатару патэлефанавала каля 30 чалавек, амаль палова — жыхары абласнога цэнтра.**



Некалькі гараджан, якія пражываюць на вуліцы Лапенкі, звярнуліся наконт вырашэння пытання па каналізацыі. А вось жыхароў мікрараёна Дзевятоўка непакоіць адсутнасць месца для выгулу сабак. Жанчына, якая патэлефанавала на прамую лінію, выказала прапанову самастойна абсталяваць тэрыторыю для гэтых мэт. Наколькі такая перспектыва магчыма, пакуль невядома, бо для яе рэалізацыі неабходна прыняць рашэнне аб выдзяленні зямлі.

У цэлым структура зваротаў застаецца традыцыйнай. Па-ранейшаму ў топе пытанні сферы ЖКГ. Жыхароў непакояць праблемы добраўпарадкавання двароў, асвятленне вуліц, якасць дарожнага пакрыцця.

**Маргарыта УШКЕВІЧ.**

# Калі ласка, у белавежскую казку!

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Апошнія гады Снягурка прыязджае ў пушчу не адна, а са світай — Матухнай-Зімой, а яшчэ з Завеяй, Сцюжай і Мяцеліцай, і ўсе яны на працягу зімовых месяцаў самааддана працуюць у памесці на карысць зімовай казы, а значыць, настрою наведвальнікаў. Вось і ў мінулую суботу доўгачаканыя госці, дзедава сямейства, завіталі ў пушчу, сустрэліся пасля доўгай разлукі з Дзядулем Марозам.

Казачны Дзед сустрэў іх каля варот сваёй рэзідэнцыі:

— Як я сумаваў без вас, як чакаў! Шматлікія госці нашы, дарослыя і дзеці, таксама чакалі. Праходзьце і далучайцеся да нашага свята!

Снягурка, якая без справы ў сваёй халоднай летняй кватэры не сядзела, а рыхтавала падарункі, адразу ўзялася за работу. Усіх сустракала, прывячала, на добрыя словы не скупілася. Свята, якое назвалі «Белавежская казка», разгарнулася па ўсім памесці. Удзельнікі фестывалю аніматараў і тэатраў гульні «Добрыя чараўнікі» сабралі мноства гледачоў, акунулі гасцей у сапраўдную навагоднюю дзею. Тут усе спявалі, танцавалі, а галоўнае, усміхаліся разам. Самадзейныя калектывы, якія выступалі ў гэты дзень, таксама задавалі святочны настрой. Парад Дзядоў Марозаў суправаджаў Брэсцкі гарадскі духавы аркестр з адмысловай зімовай праграмай.

Госці з задавальненнем гулялі па рэзідэнцыі; цуды тут чакаюць ледзь не на кожным кроку. Каля чароўнага млына можна загадаць жаданне, але перад гэтым трэба папрасіць млын перамалоць усё дрэннае. І млын паслухае і перамеле... А ўжо потым на паляне 12 месяцаў папрасіць заступніцтва ў свайго чароўнага месяца. Белавежская пушча захоўвае мноства розных таямніц і сакрэтаў, таму атмасфера ў лясным царстве асаблівая. Тут можна атрымаць падарунак, а можна і зрабіць. Тады яго размесціць у Скарбніцы, і кожны зможа ўбачыць, якія прыгожыя рэчы робяць сваімі рукамі госці ў падарунак навагодняму чараўніку, якія незвычайныя прывозяць званочкі. Дзядуля сабраў цэлую калекцыю апошніх.

Госці не толькі наведваюць усе цікавінкі рэзідэнцыі, а таксама частуюцца чаем на травах, блінамі і рознай смакатой. Пад вечар запалілі навагодні касцёр і закружылі ў карагодзе вакол самай вялікай святочнай яліны Еўропы.

Кітайскія студэнты не хавалі свайго захаплення ад свята. **Настаўніца з Брэста Вольга БАБКО**, якая прыехала з дзецьмі, сказала:

— Дзеці ў захапленні, яны чакалі сустрэчы з Дзедам Марозам і Снягуркай, мы ехалі па навагодні настрой, і мы яго атрымалі, а яшчэ зарад весялосці і бадзёрасці, нават не заўважылі ненавагодняга надвор'я.

Дарэчы, з гэтага года ў памесці паявілася новая паслуга, можна пагаварыць з Дзедам Марозам асабіста і зрабіць тое ў тронным зале Ледзянога палаца, куды раней экскурсанты не заходзілі. Паслуга платная, кошт складае пяць рублёў з аднаго чалавека за 10 хвілін экскурсіі і гутаркі. На сайце нацпарка папярэджваюць, што дзеці дашкольнага ўзросту павінны быць абавязкова ў суправаджэнні дарослых.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

Надвор'е

# СНЕГ, МОКРЫ СНЕГ І НАВАТ ДОЖДЖ

**Да гэтага немагчыма прывыкнуць. Усё з ног на галаву. У канцы лістапада было зімовае надвор'е, а ў першай палове снежня — зноў хлюпае пад нагамі. Вось і на гэтым тыдні мокры снег, які будзе пераходзіць у дождж, туман і галалёд, прагназуюць спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.**

Так, гэта так, зіма аслабіць свае пазіцыі. Франтальныя раздзелы і марскія паветраныя масы з паўднёвага захаду Еўропы абумовяць у нашай краіне воблачнасць з снегам, мокрым снегам, пры павышэнні тэмпературы паветра, пераважна па паўднёвым захадзе краіны, магчымы дождж. Пры выпадзенні дажджу на пераахаладжанай паверхні будуць утварацца галалёдныя з'явы.

А ў аўторак днём і ў цэнтральных раёнах краіны пройдуць апанкі ў выглядзе снегу, мокрага снегу і дажджу. Месцамі галалёд, слабы туман, на асобных участках дарог галалёдзіца. Максімальная тэмпература паветра будзе вагацца ад мінус 2 да мінус 8 градусаў, а па паўднёвым захадзе — мінус 1 — плюс 2 градусы.

У сераду стане яшчэ цяплей, але толькі днём. У гэтыя суткі ўначы пераважна ў заходніх і цэнтральных раёнах краіны раніцай і днём на большай частцы тэрыторыі чакаюцца апанкі ў асноўным у выглядзе снегу і мокрага снегу. Месцамі галалёд, на дарогах галалёдзіца. Тэмпература паветра ночу складзе мінус 3—10 градусаў — да мінус 13 градусаў. Днём будзе 0 — мінус 6 градусаў. Па паўднёвым захадзе ўначы чакаецца 0 — мінус 2 градусы, а ўдзень — плюс 1—2 градусы.

І ў чацвер, 8 снежня, часам пройдуць апанкі ў выглядзе снегу і мокрага снегу. Месцамі слабы галалёд. Ночу тэмпература паветра астудзіцца да 0 — мінус 6 градусаў, а днём складзе мінус 3 — плюс 2 градусы.

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных сіноптыкаў, у пятніцу месцамі па тэрыторыі краіны пройдзе кароткачасовы мокры снег, днём па паўднёвым захадзе кароткачасовы дождж. У асобных раёнах слабыя туман і галалёд, на дарогах галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы будзе вагацца ад мінус 2 да мінус 8 градусаў, а пры праясненнях — да мінус 12. Удзень чакаецца мінус 5 плюс 1 градус.

**Сяргей КУРКАЧ.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Германія сёлета прыме больш бежанцаў, чым на піку міграцыйнага крызісу ў 2015-м




ФРГ сёлета прыме каля 1,2 мільёна бежанцаў, а на піку міграцыйнага крызісу ў 2015 годзе адпаведны паказчык складаў 890 тысяч чалавек. Пра гэта паведаміў ТАСС са спасылкай на газету Welt am Sonntag. Паводле інфармацыі выдання, толькі з Украіны ў Германію прыбыло больш чым мільён чалавек. Акрамя таго, да канца кастрычніка паступіла звыш 180 тысяч запытаў аб прадастаўленні прыстанішча ад грамадзян Сірыі, Афганістана, Турцыі, Ірака і іншых краін. Улады ФРГ чакаюць, што гэтая колькасць перавысіць 200 тысяч да канца года, піша газета. Як адзначае Welt am Sonntag, у федэральных землях і камунах пашыраюцца хваляванні з-за павелічэння колькасці бежанцаў. Кіраўнік МУС Саксоніі Армін Шустэр заявіў, што рэгіёны дасягнулі мяжы ў плане магчымасці размяшчэння мігрантаў. Таго ж меркавання прытрымліваецца і кіраўнік МУС Баварыі Ёахім Херман: «У нас масавы рост нелегальнай міграцыі».

### Японія адклала павышэнне падаткаў з мэтай нарошчвання абаронных расходаў



Урад Японіі вырашыў пакуль не павышаць падаткі з мэтай атрымання дадатковых сродкаў на абаронныя выдаткі, якія ў найбліжэйшыя пяць гадоў плануецца павялічыць больш чым удвая. Аб гэтым паведаміла агенцтва Kyodo са спасылкай на ўрадавыя крыніцы. Адзначаецца, што першачарговая ўвага будзе ўдзелена скарачэнню расходаў, не звязаных з абаронай. Японскія ўлады прадоўжаць вывучаць магчымасці прыцягнення дадатковых сродкаў з мэтай пераразмеркавання іх на абаронныя патрэбы. У прыватнасці, гаворка аб лішках з рахункаў для валютных інтэрвенцый і бацьбы з пандэміяй. Частку сродкаў на абаронныя расходы мяркуецца накіраваць на развіццё магчымасцяў нанясення прэвентыўных удараў па базах патэнцыяльнага праціўніка. У прыватнасці, Японія мае намер разгарнуць балістычныя ракеты наземнага базіравання Type-12 уласнай вытворчасці далёкасцю звыш тысячы кіламетраў. Таксама разглядаецца варыянт закупкі ў ЗША да 500 крылатых ракет Tomahawk.

### Оксфардскі слоўнік абраў словам года выраз «рэжым гобліна»




Упершыню слова года абрана шляхам грамадскага галасавання, якое праходзіла анлайн. «Грамадскасць выказалася! Пасля пачатку галасавання за слова года сярод людзей, якія размаўляюць на англійскай мове, упершыню ў гісторыі за апошнія два тыдні прагаласавалі 300 тысяч чалавек», — адзначаецца ў рэлізе Оксфардскага ўніверсітэта, паведаміла РІА «Навіны». Паняцце goblin mode («рэжым гобліна») Оксфардскі слоўнік вызначае як «паводзіны, заснаваныя на бесцырымонным патуранні ўласным жаданням, ляноце, неахайнасці і прагнасці, звычайна спадарожныя адмове адпавядаць грамадскім нормам і чаканням». На старонцы конкурсу тлумачыцца, што ўпершыню дадзены выраз з'явіўся ў 2009 годзе ў Twitter, але вірусным (гэта значыць — шырока ўжываным у сетцы) стаў сёлета. Цяпер ён прымяняецца, каб апісаць настрой людзей, якія адмаўляюцца вяртацца да «нармальнага жыцця» пасля пандэміі і пратэстуюць у Сетцы супраць «недасягальных эстэтычных стандартаў». Таксама ў шорт-ліст трапілі паняцце metaverse («метасусвет») і хэштэг #IStandWith («Я падтрымліваю»).

# БАЦЬКІ І ДЗЕЦІ.

**Паразважаць над актуальнымі не толькі для нашага грамадства пытаннямі за круглым сталом у рэдакцыі «Звязды» мы запрасілі дэпутата Палаты прадстаўнікоў Сяргея СЫРАНКОВА, рэктара Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце кандыдата гістарычных навук Вячаслава ДАНІЛОВІЧА, прафесара факультэта філасофскіх і сацыяльных навук БДУ доктара гістарычных навук Ірыну КАЛАЧОВУ, сакратара ЦК БРСМ Паўла АЛЕКСУ, галоўнага рэдактара часопіса «Маладосць» Вольгу РАЦЭВІЧ, дацэнта кафедры агульнай і медыцынскай псіхалогіі факультэта філасофскіх і сацыяльных навук БДУ кандыдата псіхалагічных навук Алесю КАНЬКОВУ.**

***«Звязда»: Давайце пагаворым пра нашу беларускую моладзь, якая ўсё ж мае свае адрозненні ад равеснікаў з іншых краін. Што ўплывае на светапогляд моладзі ў сучасным грамадстве? Ступень палітычнай і грамадскай актыўнасці маладых людзей вызначаецца сеткай Інтэрнэт ці ўсё ж у нашым традыцыйным, нават, з пункту гледжання сучасных «каштоўнасцяў», патрыярхальным грамадстве ўплыў на маладыя галовы маюць і іншыя інстытуты — сям'я, школа?***

**Вячаслаў ДАНІЛОВІЧ:** У кожнай краіне моладзь мае свае асаблівасці, і іх не можа сцерці нават суцэльная глабалізацыя. У першую чаргу на выхаванне маладога пакалення ўплывае сям'я, затым — сістэма адукацыі, пачынаючы ад дзіцячага садка. У 1990-я гады вельмі актыўна «раскручваўся» пастулат, што адукацыя аказвае толькі адукацыйныя паслугі, выхаванне — не яе задача. Давайце дзецям веды, больш ад вас нічога не патрабуецца. Дзеля чаго тое было зроблена? Каб змяніць каштоўнасныя арыенціры грамадства, навязаць тое, што было нехарактэрна беларусам. І гэты працэс быў запушчаны праз сістэму адукацыі. Паралельна, вядома, працавалі і СМІ, а са з'яўленнем інтэрнэту — сацыяльныя сеткі.

Але, калі чалавека выхоўвалі ў нармальным асяроддзі, калі бацькі з маленства прывівалі ў ім шанаванне спрадвечных традыцый, любоў да Радзімы, у яго ёсць імунітэт ад шкодных уздзеянняў звонку. І ў гэтым сэнсе наша беларуская моладзь асаблівая, больш устойлівая да знешняга ўплыву. Як прыклад — 2020-ы год.

***«Звязда»: Але ж у дваццатым годзе многія маладыя людзі паддаліся менавіта знешняму ўплыву, паверыліся на заклікі...***

**Вячаслаў ДАНІЛОВІЧ:** Як гісторык скажу: гэта традыцыйная рэч — заўсёды прапановы любых радыкальных пераўтварэнняў знаходзяць водгук у маладзёжным асяроддзі. Маладыя людзі так пабудаваны і псіхалагічна, і фізіялагічна: яны заўжды прагнуць чагосьці новага, таму для іх больш успрымальныя радыкальныя перамены, чым паступовае развіццё. Але нават з гэтым пасылам паглядзіце: уся моладзь пабегла на плошчы ў 2020-м? Не. Значная частка, нават скажу ўпэўнена — большасць — не пайшла за гэтымі заклікамі. Пайшла радыкальная меншасць, якая праявілася (яна, у прынцыпе, ёсць у любым грамадстве). Чаму не падцягнулася да яе большасць, як назіралася ў многіх краінах падчас каляровых рэвалюцый? Прычына, лічу, у тым, што, нягледзячы на згаданыя ліхія 1990-я гады, дзякуючы найперш пазіцыі кіраўніка краіны мы не адмовіліся цалкам ад таго выхаваўчага фундамента, які быў закладзены ў сістэме адукацыі. Пастаянна гаварылася на самым высокім узроўні і пра ідэалогію, і пра традыцыйныя каштоўнасці. І тое, што мы пастараліся гэта захаваць, у выпрабавальны для дзяржаўнасці момант адыграла сваю станоўчую ролю.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Пры ўсіх мінусах, якія, несумненна, ёсць, большасць нашай моладзі нармальна, правільна арыентуецца. І падзеі 2020-га года дапамаглі маладым людзям вызначыцца і ўсвядоміць, чаго яны хочуць ад жыцця. Магу сказаць пра сваю навучальную ўстанову. У апошнія два гады да нас паступаюць маладыя людзі, якія адрозніваюцца не тое што матывацыяй — адказнасцю. Яны актыўныя ў плане стваральных ініцыятыў. Яны ўсім цікавяцца, ім усюды хочацца ўдзельнічаць: ад спартыўных секцый і гурткоў самадзейнасці да студатрадаў і валанцёрскіх суполак...

**Ірына КАЛАЧОВА:** «На нашым факультэце ў плане прыкладной навукі сёння распрацоўваецца нямала цікавых тэм. Я, напрыклад, займаюся тэмай гістарычнай памяці як базавай каштоўнасці ў сістэме міжпакаленных адносін, з'яўляюся кіраўніком навуковага калектыву. Для даследавання мы ўзялі чатыры пакаленні: пасляваеннае (1943—1963 год), савецкае (1963—1983), пакаленне перабудовы (1983—2003) і так званае пакаленне «Z» (з 2003). Апытвалі па анкеце, праводзілі зададзеныя дыялогі ў фокус-групах. Вынікі атрымаліся вельмі цікавыя, вельмі шмат сабрана матэрыялаў, якія яшчэ патрабуюць апрацоўкі. Але некаторыя прыкладаў прывяду.

Вось адносіны да інфармацыі і да карыстання інтэрнэт-крыніцамі. Жанчына з савецкага пакалення падзялілася сваімі назіраннямі з дзіцячага летняга лагера, дзе абмежавана карыстанне гаджэтамі. Яна нават пазапісвала выказванні пакалення «Z» з гэтай нагоды: «У мяне нельга забіраць тэлефон, бо ён — працяг маёй рукі». А калі маладым задавалі пытанне пра тое, чаму яны аддадуць перавагу: гаджэту ці бібліятэцы, — гучаў адказ: «У бібліятэку ж трэба збірацца, ісці, траціць час, а тут пару раз на экран націснуў — і чытай». «Гэта немагчыма — вярнуцца ў жыццё без тэлефона, гэта быў бы поўны рэгрэс. Я нават гадзіну не магу пражыць без гаджэта», — яшчэ адно красамоўнае выказванне. Падобныя думкі гучаць найперш ад самай маладой групы.

**Павел АЛЕКСА:** Вядома, маладыя людзі не могуць быць у ізаляцыі ад глабальных працэсаў. Таму нават у самых разумных і патрыятычна настроеных вы будзеце назіраць і кліпавасць мыслення, і спажывецкія інтарэсы. Гэта не добра і не дрэнна, новае пакаленне проста іншае. Зрэшты, нават у самых старажытных пісьмовых крыніцах можна знайсці нараканні старэйшых у адрас маладых: маўляў, усё робяць па-свойму, зусім не шануюць традыцыі...

**Сяргей СЫРАНКОЎ:** Сённяшняя моладзь адрозніваецца ад учарашняй тым, што яшчэ тыя, каму сёння плюс-мінус сорак, паэтапна выбудоўвалі стратэгію свайго жыцця, ставілі мэты, задачы, якія належыць рашыць, і крок за крокам накіравана ішлі да здзяйснення запаветнай мары. Цяпер жа моладзь хоча ўсё і адразу, тут і цяпер, лічачы, што, каб не адстаць ад жыцця, трэба браць ад яго ўсё імгненна, не адкладваючы на потым. Ці маюць яны рацыю ў гэтым максімалізме? Улічваючы тэмп сучаснага жыцця і дынамічнасць грамадска-палітычных працэсаў наогул ва ўсім свеце, іх складана тут абвінавачваць. У сувязі з гэтым і наладжваць работу з моладдзю мы павінны ў анлайн-рэжыме, а не ў якойсьці светлай будучыні.

**Ірына КАЛАЧОВА:** У нашым даследаванні было пытанне аб каштоўнасцях. Некаторыя базавыя каштоўнасці для моладзі застаюцца тымі ж, і гэта радуе. Здароўе фізічнае і ментальнае і сям'я, пераемнасць пакаленняў. Але што адрознівае іх ад старэйшых пакаленняў, для якіх характэрнае менавіта каштоўнаснае асэнсаванне жыцця, ёсць у прыярытэце маладых яшчэ адно паняцце — мэта. А мэта якая — матэрыяльная. Добрая работа, высокая зарплата, уласная кватэра, машына... Ну, што ж, такое ў нас цяпер грамадства — спажывецкае. Але радасна чытаць менавіта ад маладых такія выказванні: «Для мяне галоўная каштоўнасць — любоў, яна выратуе свет...», «Для мяне вельмі важныя мае блізкія людзі, мае сябры...», «Лічу важным узаемадапамогу, прыносіць карысць людзям, прыстойнасць...», «Я б вылучыла для сябе сваю краіну, сябе і сям'ю...» Іх ніхто не прымушаў гаварыць так. Але, трапіўшы ў поле ацэньвання і асэнсавання, яны задумаліся, што для іх насамрэч важна.

А вось што гаварылі самыя маладыя аб сабе самых. «Мы адчуваем сябе больш свабоднымі, талерантнымі ў параўнанні са старэйшым пакаленнем, у прыватнасці з пакаленнем перабудовы...» «Наша пакаленне больш смелае ў самавыяўленні...» «Наша пакаленне вельмі таленавітае, гэта самародкі, новыя людзі з новымі ідэямі...» І тое, што яны такія — самародкі — здорава. Пытанне — як іх утрымаць такімі, як ім не даць расчаравацца ў рэальным жыцці.



Алеся КАНЬКОВА.



Вольга РАЦЭВІЧ.



Вячаслаў ДАНІЛОВІЧ.

***«Звязда»: Тут варта было б адказаць штосьці пра ролю арганізацыйнай работы, грамадскіх арганізацый. Але ж нашы апаненты тут жа пачнуць гаварыць: маўляў, усё ідзе пад прымусам, моладзь на мерапрыемствы заганяюць...***

**Павел АЛЕКСА:** Ну, мы чулі тое неадночы. На гэта ёсць што адказаць. Як старшыня Беларускага камітэта маладзёжных арганізацый магу сказаць, што 2020-ы год сапраўды паўплываў на грамадзянскую актыўнасць нашай моладзі, прытым зусім не так, як хацелася б нашым апанентам. Калі казаць юрыдычнай мовай — і тое пацвердзіць Міністэрства юстыцыі, з якім мы цесна працуем, — намецілася вялікі ўсплёск колькасці маладзёжных грамадскіх арганізацый і аб'яднанняў, што падаюць заяўкі на рэгістрацыю. У моладзі наспела патрэба рэалізаваць свае інтарэсы менавіта шляхам членства ў той ці іншай суполцы. І маецца на ўвазе не толькі БРСМ. Падзеі, якія ўскалыхнулі наша грамадства, а дзесьці і падзялілі яго аднасна меркаванняў і поглядаў на тое, што адбываецца, паказалі ў тым ліку і маладым людзям, наколькі важная грамадзянская актыўнасць, наколькі згубная пасіўнасць і назіранне збоку. Як вынік — на сёння ў Беларусі зарэгістравана 186 маладзёжных аб'яднанняў. Разам з тым, калі я называю такую лічбу, выступаючы перад якой-небудзь аўдыторыяй, людзі вельмі здзіўляюцца: ніхто не думае, што іх так шмат. Не кажучы ўжо пра тое, што мала хто ведае аб іх дзейнасці... Дрэнна гэта ці добра, што не ведаем? Гэта факт, які маем сёння. Можа, не вельмі актыўна пазіцыянуюць сябе тыя арганізацыі. А можа, яшчэ патрэба грамадства не выйшла на той узровень, каб цікавіцца і валодаць такой інфармацыяй.

Наконт «заганяюць» з поўнай адказнасцю магу сказаць, што гэта памылкова. Ён сфарміраваўся, напэўна, у тым ліку і таму, што падобны стэрэатып быў і аб камсамоле, прынамсі, у апошнія гады яго існавання, калі арганізацыя ўжо страчвала свае ідэалы і пазіцыі... Наша арганізацыя самадастатковая ды шматлікая — каля 350 тысяч. І актыўных маладых людзей, якіх не трэба «заганяць», у нас сапраўды хапае. Больш за тое — яны і самі, з'яўляючыся сапраўднымі лідарамі, прыцягваюць моладзь да сябе як магніт і акумулююць ідэі і ініцыятывы.

**Вячаслаў ДАНІЛОВІЧ:** Стэрэатып, што нібыта ўся моладзь у Савецкім Саюзе была ў камсамоле, таксама памылковы. Толькі на фінальным этапе, у брэжнеўскія часы, працэс уступлення ў камсамол пачаў набываць фармальны характар. Гналіся за колькасцю, а не за якасцю. Але ж так было не заўсёды. Працуючы над доктарскай дысертацыяй, я даследаваў удзел беларускай моладзі ў грамадска-палітычным, сацыяльна-эканамічным і культурным жыцці Савецкай Беларусі ў 20—30-я гады мінулага стагоддзя. Дык вось, у той час колькасць камсамольцаў сярод юнакоў і дзяўчат, абраных у мясцовыя Саветы, не перавышала трыццаці працэнтаў. Таму і сёння той жа БРСМ варта лічыць пляцоўкай менавіта для актыўнай моладзі, якая хоча весці стваральную работу і падаваць прыклад іншым маладым людзям. І, на мой погляд, фактычна так у нас і ёсць. Самае галоўнае — каб не было фармальнага падыходу...

***«Звязда»: Але 186 арганізацый на такую невялікую краіну — ці не ёсць гэта той самы падыход?***

**Сяргей СЫРАНКОЎ:** Калі іх столькі — значыць, ёсць запыт грамадства. Калі яны канструктыўныя, трымаюцца нармальных агульначалавечых каштоўнасцяў, не ідуць у супярэчнасць з нашымі законамі — чаму б і не 186?

На прыкладзе нашага партыйнага маладога крыла — Лігі камуністычнай моладзі магу сказаць, што мы ніякім чынам не гонімся за колькасцю і нікога не заганяем, бо гэта не самамэта. Члены ЛКМ — сацыялістычна матываваныя маладыя людзі, якія асэнсавана зрабілі свой выбар і прыйшлі ў арганізацыю, каб унесці асабісты ўклад у будаўніцтва грамадства сацыяльнай справядлівасці і прагрэсу. Дарэчы, ідэі сацыялізму зноў становяцца ўсё больш папулярнымі ў грамадстве, асабліва сярод моладзі...

Яшчэ неабходна адзначыць, што падчас шматлікіх дыялогавых пляцовак, на якіх абмяркоўваліся змяненні ў Канстытуцыю, ад многіх маладых людзей даводзілася чуць: у нас столькі талковых ініцыятыў. А чаму ў нас не створана сістэма іх дзяржаўнага стымулявання? Гэта заўвага была зафіксавана, і дзякуючы падтрымцы нашага Прэзідэнта цяпер ініцыятывы і праекты адсочваюцца на рэспубліканскім узроўні, удзельнічаюць у конкурсах, перамагаюць і, адпаведна, арганізацыйна і матэрыяльна стымулююцца з бюджэту. Увогуле, моладзі трэба больш давяраць і верыць, але пры гэтым ускладаць на яе пэўны ўзровень адказнасці. Маладыя людзі павінны ведаць, што калі дзяржава давярае і выдаткоўвае на нейкі праект сродкі, то не на спантанныя ідэі або чыесьці «хацелкі», а на карысную для мясцовай суполкі ініцыятыву, якую потым самі маладыя людзі, што яе прапанавалі, і будуць рэалізоўваць... Тут трэба глядзець і на замежны вопыт. Напрыклад, расіяне ўжо каторы год праводзяць конкурс «Лідары Расіі», падчас якога праводзіцца надзвычай сур'ёзны адбор і адпаведная работа з перспектыўнай у кадравым плане моладдзю. Дзякуючы яму, маладыя людзі, якім крыху за трыццаць, маюць рэальныя шанцы стаць, напрыклад, губернатарам альбо міністрам. А змена пакаленняў менавіта ў дзяржкіраванні — тэма сёння надзвычай актуальная для любой краіны.

***«Звязда»: Але ці варта моладзь, якая, як вы сказалі, хоча ўсё і адразу, дапускаць да дзяржаўнага кіравання? Ці не наламае яна дроў?***

**Сяргей СЫРАНКОЎ:** Калі яна разумее, чаго хоча не толькі для сябе, але і для краіны, калі для яе гэта «ўсё і адразу» выключна ў канструктыўным рэчышчы — чаму і не? А наша задача, людзей дарослых, вопытных, той канструктыў і здаровыя амбіцыі своечасова заўважыць і развіць.

**Вячаслаў ДАНІЛОВІЧ:** Маладыя людзі ад пачатку энергічныя, і наша задача — накіроўваць іх энергію ў канструктыўнае рэчышча. Я абсалютна згодзен з тым, што важна не толькі чуць і мець на ўвазе ідэі маладых, але і саміх маладых усяляк, падключаць да рэалізацыі задум.

# ВЕРСІЯ 2.0



Ірына КАЛАЧОВА.



Павел АЛЕКСА.



Сяргей СЫРАНКОЎ.

Летась мы сумесна з гарвыканкамам адрадзілі праект «Мінская змена». Маладыя людзі прапаноўваюць варыянты ўдасканалення гарадскога асяроддзя, прэзентуюць свае ідэі, і гарвыканкам на конкурснай аснове адбірае тыя, якія падтрымае, у тым ліку і фінансава. Пачыналі мы толькі са студэнтаў ВНУ, летась было 47 удзельнікаў, а зараз далучылася і працоўная моладзь, зацікавіліся прадпрыемствы... І заявак ужо больш чым 240.

***«Звязда»: Дык усё-ткі зацікавіліся прадпрыемствы ці моладзь, якая там працуе?***

**Вячаслаў ДАНІЛОВІЧ:** А без моладзі нічога б не атрымалася. Калі чалавека прымушаць, нават калі ён падасць заяўку, ён усё роўна ўрэшце займацца рэалізацыяй гэтага праекта не будзе... Я не магу сказаць пра ўсе дзвесце сорак з нечым заявак, як і ў якіх умовах яны падаваліся. Але многае давялося бачыць непасрэдна, і зацікаўленасць маладых людзей відавочная. Зрэшты, калі кагосьці на прадпрыемстве і падштурхнулі — у гэтым я таксама не бачу нічога дрэннага, калі ў чалавека знойдзецца водгук. Лічыш, што нешта трэба мяняць, — не толькі дэкларуй, а прыдумай, як зрабіць гэта, і зрабі — вось што павінна быць галоўным. Важна падтрымаць творчы пачатак і дапамагчы ў ажыццяўленні задуманага.

Вось, напрыклад, у нашай акадэміі студэнты нядаўна самі выйшлі з ідэяй стварыць студэнцкае навуковае таварыства. Мы гэту ідэю з задавальненнем падтрымалі. Спачатку ў ім было сорак чалавек, цяпер ужо — 120.

**Вольга РАЦЭВІЧ:** А ў лінгвістычным універсітэце ёсць гуртох, у якім студэнты займаюцца перакладам мастацкіх твораў з англійскай мовы на беларускую. Мы пазнаёміліся з імі і публікуем іх пераклады. А яны зацікаўленыя, каб убачыць запатрабаванасць сваёй працы, яшчэ і атрымаць матэрыяльнае заахвочванне ў выглядзе ганарару.

***«Звязда»: Але ж менавіта творчая моладзь заўсёды лічыцца менш кіраванай і больш пратэснай...***

**Вольга РАЦЭВІЧ:** Магчыма, у мяне нейкае такое вясёлкавае ўяўленне аб нашай моладзі... Аўтары часопіса «Маладосць» — маладыя людзі, старэйшыя за 15 гадоў. Натхнёныя, творчыя, зацікаўленыя. Мне здаецца, што моладзь, якая прыходзіць да нас у рэдакцыю, ніколі не пойдзе «на плошчу» — яны ў іншай тэме... Прыходзяць да нас са сваімі спробамі пяра самі, кагосьці прыводзяць бацькі ці настаўнікі.

Калі казаць пра ўплыў інтэрнэту — ён, вядома, моцны, але, пакуль дзіцяці не споўнілася 12-13 гадоў, думаю, галоўным чынам уплываюць на яго бацькі і школа, у тым ліку і ажыццяўляючы кантроль кантэнту, які дзіця праглядае ў сецыве. Інтэрнэт — гэта, канешне, сметніца, але ж у ім шмат і карыснага. Мы, напрыклад, таксама ладзім свае прэзентацыі, у тым ліку ў анлайн-фармаце.

***«Звязда»: А на афлайн-прэзентацыі моладзь не зганяюць?***

**Вольга РАЦЭВІЧ:** Не, што вы. Нядаўна ладзілі прэзентацыю «Маладосці», куды прыйшлі дваццаць чалавек аўтараў і выступоўцаў. Людзі, якія прысутнічалі на сустрэчы ў якасці гледачоўслухачоў, пасля яе падыходзілі і казалі: «Нам таксама хочацца пісаць»... Пакуль ёсць такія зацікаўленыя маладыя людзі, іх зацікаўленыя настаўнікі, — не думаю, што ўсё страчана...

**Вячаслаў ДАНІЛОВІЧ:** А на такія мерапрыемствы, якія носяць духоўна-асветніцкі характар, не заганна будзе і арганізавана накіраваць студэнтаў. Не кожны напачатку ўспрыме і зразумее, але, калі мерапрыемства будзе падрыхтавана, пройдзе цікава, малады чалавек пасля яшчэ і «дзякуй» скажа. Моладзі пэўны час патрэбны штуршок... Зноў прывяду паралель з 20-30-і гадамі XX стагоддзя. «Тыя ж самыя» пісьменнікі-«маладнякоўцы» ездзілі па прадпрыемствах, выступалі перад моладдзю, якая была нават не заўсёды пісьменнай. І гэта было і ўспрымалася нармальна. Бо тое, што спрые духоўнаму і культурнаму росту маладога чалавека, ніколі яму не зашкодзіць.

**Вольга РАЦЭВІЧ:** Нават калі на нашы сустрэчы кагосьці і прыводзяць, я бачу ў гэтых маладых людзей інтарэс, ім цікава. Мы заўсёды на гэтых сустрэчах раім студэнтам і школьнікам як мага больш чытаць: тады і гаварыць будуць правільна, і думаць самастойна. І, мне здаецца, многія прыслухоўваюцца.

***«Звязда»: Мы вось тут агульнымі намаганнямі намалявалі даволі аптымістычную карціну... Але, згадзіцеся, разрыў паміж пакаленнем «Z» і іншымі значна большы, чым было дагэтуль... І гэта датычыцца ў тым ліку традыцыйных, базавых каштоўнасцяў нашага грамадства...***

**Алеся КАНЬКОВА:** Каштоўнасці, правілы і нормы ўвогуле перадаюцца па вертыкалі — ад бацькоў дзецям, і гэта характэрна для любога грамадства. Але дзіця можа засвойваць штосьці ад іншага чалавека толькі тады, калі яно па-сапраўднаму да яго прывязана. Калі ж гэтай прывязанасці з бацькамі не здараецца — у жыццё дзіцяці ці маладога чалавека прыходзяць канкурэнтныя людзі і суполкі (равеснікі, групы ў сацыяльных сетках), і ўжо яны ўплываюць на яго свядомасць і светапогляд. Гэта як птушаня, якое, прабіваючы шкарлупіну яйка, запамінае вобраз мамы-птушкі і капіруе яе паводзіны. Калі ж мамы побач не аказваецца, яно будзе хадзіць следам за тым, хто апынецца побач, — чалавекам, сабакам, механічнай цацкай, — і капіраваць іх паводзіны. Толькі наўрад ці ад гэтага яму будзе карысць... Таму сувязь з бацькамі, са старэйшымі пакаленнямі сям'і вельмі важная. Калі фундамент — сям'я — трывалы, любая надбудова над ім будзе правільнай.

**Ірына КАЛАЧОВА:** Падчас даследавання мы задавалі пытанне: як ваша пакаленне ставіцца да гасцявых грамадзянскіх шлюбаў, аднаполых саюзаў, сем'яў чайлдфры (тыя, што свядома жывуць без дзяцей). Калі ў старэйшых пакаленняў адказы ў большасці адмоўныя (чым старэйшыя — тым больш катэгарычныя), дык у самых маладых часта сустракаліся адказы накшталт: «Хай робяць усё, што захочуць, мне ўвогуле без розніцы», «Толькі б не чапалі мяне, увогуле без розніцы», «Калі гэтыя каштоўнасці не прапагандуюцца ў радыкальнай форме, то ў прынцыпе яны могуць існаваць», «Калі людзям камфортна, хай яны робяць што хочуць». Да сем'яў без дзяцей многія з апытаных ставяцца «нейтральна» і «нармальна». Карацей, талерантна. А што такое талерантнасць у гэтым выпадку? Раўнадушша, інертнасць, адсутнасць уласнага меркавання...

Атрымліваецца, што часта нашай моладзі нават не задумваецца аб тым, каб ствараць паўнавартасную сям'ю. І тут вымалёўваецца яшчэ адна праблема для старэйшых: многія з пакалення перабудовы могуць увогуле не дачакацца ўнукаў. Функцыя гэтых людзей будзе не завершана, парушыцца спрадвечны ўклад жыцця чалавека ў пажылым узросце...

**Вячаслаў ДАНІЛОВІЧ:** Увогуле, тэрмін «талерантнасць» нам падкінулі ў 90-я гады, і мы за яго радасна ўхапіліся, зрабіўшы ледзь не нацыянальнай рысай, хоць абазначае ён найперш абыякавасць. Гэта ўвогуле медыцынскі тэрмін, які першапачаткова абазначае няздольнасць арганізма супрацьстаяць шкоднаму знешняму ўплыву... І вельмі добра, што мы перастаём лічыць сябе талерантнымі, што нават у Канстытуцыі прапісалі: шлюб — гэта саюз мужчыны і жанчыны.

**Алеся КАНЬКОВА:** І даследаванні паказваюць, што каштоўнасць сям'і і шлюбу для нашай моладзі вельмі важная. 80 працэнтаў ад апытаных маладых людзей ва ўзросце да 30 гадоў хочуць жыць у доўгіх, трывалых адносінах. І жыць шчасліва.

***«Звязда»: У беларускім менталітэце заўсёды былі моцныя сямейныя традыцыі і лічыліся асноўным фактарам яднання пакаленняў. Але гэта повязь, здаецца, цяпер становіцца ўсё танейшай. Прычын шмат, але адна з асноўных — урбанізацыя. Няма ў моладзі вясковых бабуль — няма ў кога вучыцца традыцыям, мове, культуры паводзін...***

**Вячаслаў ДАНІЛОВІЧ:** Так, тут вы маеце рацыю. Горад усё ж — штучнае асяроддзе. Калі былі дзядулі-бабулі ў вёсцы, нават у гарадскога дзіцяці была магчымасць убачыць ужывую, адкуль бярэцца ежа на стале, колькі ў гэта ўкладаецца сіл... Мы сёлета адпраўлялі студэнтаў «на яблыкі». Яны пытаюць: навошта нам? Адказваем: паедзьце, паглядзіце, зразумейце, што яны не ў краме выраслі.

**Алеся КАНЬКОВА:** А я лічу, што незалежна ад месца пражывання ў бабуль і дзядуляў сапраўды ў сям'і асаблівая роля — як захавальнікаў сямейных традыцый.

**Вольга РАЦЭВІЧ:** Да мяне кожны год на Каляды прыходзяць дзеці-калядоўшчыкі. І гэта ў сталіцы. Моладзь зацікаўленая нашымі традыцыямі, імкнецца іх захоўваць, нават з гарадскімі бабулямі. А колькі маладых краязнаўцаў, якія цікавяцца гісторыяй родных мясцін...

***«Звязда»: І ўсё ж гэтых самых маладых мы называем пакаленнем «Z», не задумваючыся асабліва, што гэта апошняя літара лацінскага алфавіта. Мы павінны нешта рабіць, каб яны не сталі сапраўды апошнім пакаленнем? Ці ўсё працей: ідзе спрадвечны натуральны працэс «Бацькі і дзеці», у які не варта і бескарысна ўмешвацца?***

**Ірына КАЛАЧОВА:** А пакаленне «Z» — гэта ўжо студэнты 4-5 курсаў, якія заўтра прыйдуць у прафесійныя сферы. І з гэтай групы, пагадзіцеся, няма ніводнага, у каго б у руцэ пастаянна не быў засцісныты смартфон. І менавіта ён вызначае не проста частку жыцця маладых людзей — фактычна ўсё іх жыццё... І гэта трэба мець на ўвазе, і, думаць, якая сёння павінна ў нас быць сістэма адукацыі, як працаваць з дыстанцыйным спосабам адукацыі.

Мы павінны сёння вучыць бацькоў, а тыя, у сваю чаргу, вучыць сваіх дзяцей, як абыходзіцца з гаджэтамі. Не забіраць, не забараняць — менавіта вучыць. Нават тэрмін для гэтага ёсць асаблівы — кібер-адукаванасць. Памятаеце, як гадоў дзесяць назад пра фінансавую адукаванасць многія гаварылі «навошта», а цяпер гэта бясспрэчная дзенасць нашага жыцця. Так і тут павінна быць. Прычым з самага ранняга ўзросту, як толькі ў дзіцяці ў руцэ з'яўляецца гаджэт, які сам па сабе моцны інструмент, у тым ліку і маніпулявання свядомасцю.

Калісьці інфармацыйныя тэхналогіі — радыё, тэлебачанне — не былі так уключаны ў асобу. Яны спрыялі фарміраванню асобы, а не разбуралі яе, што можна назіраць сёння.

**Вячаслаў ДАНІЛОВІЧ:** І мы павінны разумець, што гэта залежнасць выкарыстоўваецца апанентамі нашай дзяржавы ў пэўных мэтах. Гаджэты — інструмент татальнага кантролю над грамадствам, яго падзелу. Гаджэт атупляе, ізалюе і кантралюе. Калі карыстацца ім, як ужо сказана, без той самай кібердукаванасці. Сістэма адукацыі не павінна імкнуцца да лічбавізацыі. У элітных школах на Захадзе гаджэты наогул забаронены. Трэба вучыць дзяцей камунікаваць з людзьмі ўжывую... Лічбавізацыя добра для кіберадукаванага грамадства. Нам над гэтым яшчэ шмат працаваць.

А таксама моладзь трэба вучыць пераадольваць цяжкасці, выпраўляць памылкі. Бо, калі будзем ім толькі расказваць, якія яны самыя лепшыя, — нічога добрага не атрымаецца.

**Алеся КАНЬКОВА:** На жаль, сёння дзеці прыходзяць у свет, дзе ім нярэдка няма належнай увагі з боку сям'і. Бацькі шмат працуюць, арыентаваныя на матэрыяльны дабрабыт, мала ўдзельнічаюць у жыцці дзяцей. У школе нярэдка тое самае — настаўнікі не праяўляюць асабістай зацікаўленасці ў жыцці дзяцей. Прычым гэта датычыцца менавіта маладых настаўнікаў — яны проста зарабляюць грошы.

**Вольга РАЦЭВІЧ:** Так, ад настаўнікаў таксама вельмі многа залежыць. Для прыкладу раскажу эпізод. Вяртаюся нядаўна і бачу: ідуць нашы дзеці са школы. І спяваюць... гімн Беларусі. Ведаю, што ўрок музыкі ў іх быў першым. Гэта ж як трэба зацікавіць дзяцей! Дарэчы, мая дачка, калі ў яе добры настрой, таксама спявае гімн. Я пытаюся: «Чаму?» — «А надта ж прыгожа спявае яго настаўніца», — адказвае...

**Алеся КАНЬКОВА:** Я ўвогуле вельмі люблю нашу моладзь. Яна рэфлексуе, уражваецца... Бацькі заўсёды хочуць, каб дзеці падзякавалі, а дзеці заўсёды хочуць, каб у іх папрасілі прабачэння — і нярэдка гэтыя, па сутнасці, узаемавыключныя патрабаванні і ёсць прычыны непаразуменняў паміж бацькамі і дзецьмі. Дык вось сучасныя маладыя людзі стараюцца знайсці выйсце: яны нават прыводзяць бацькоў на сумесны сеанс псіхатэрапіі, яны гатовы дамаўляцца, яны шукаюць сувязь з бацькамі... Нашы дзеці павінны быць падобнымі на нас, але не такімі ж, як мы.

**Павел АЛЕКСА:** Трэба з маладымі працаваць і пры гэтым усведамляць, што выхаваўчы працэс не дасць імгненных вынікаў. Гэта можа здавацца складаным і нават дарэмным, але дзеля перспектывы трэба рабіць. А яшчэ для маладых патрэбныя лідары думак менавіта з іх маладога асяроддзя. І для пошуку і вылучэння такіх лідараў і неабходныя грамадскія маладзёжныя аб'яднанні.

**Ірына КАЛАЧОВА:** У нашай краіне шмат зроблена для моладзі, росквіту яе талентаў і развіцця. Але шмат добрых спраў яшчэ наперадзе. Неабходна мацаваць сувязі паміж пакаленнямі, улічваць запыты прадстаўнікоў розных узроставых груп, бо толькі ў дыялогу і паразуменні мы зможам дасягнуць прагрэсу. Выключная роля ў гэтым адводзіцца адукацыі і, вядома, сям'і і бацькам.

**Вячаслаў ДАНІЛОВІЧ:** Гэта наша моладзь, нашы дзеці і ўнукі, з імі трэба працаваць, каб яны і праўда не сталі апошнім пакаленнем беларусаў. Мы павінны займацца з імі, трансліраваць нашы традыцыйныя духоўныя каштоўнасці, падтрымліваць іх ідэі, далучаць да стваральнай працы на карысць грамадства. І тут, лічу, перспектывы ў нас ёсць. І 2020-ы год — таксама сведчанне таго, што перспектывы не згубленыя. Самае галоўнае, што і на самым высокім дзяржаўным узроўні ў нас гэтыя праблемы ўсведамляюцца. Z — апошняя літара не нашага алфавіта. Няхай яна ў іх будзе апошняя. У нас свой алфавіт і шмат цікавых літар наперадзе.

**Сяргей СЫРАНКОЎ:** Наша першапачатковая задача як дарослых — моладзь накіроўваць. І таму, як бы гэта недэмакратычна з маіх вуснаў ні гучала, — на мерапрыемствы патрыятычныя, выхаваўчай, духоўнай накіраванасці будзем і «заганяць», калі трэба. І накіроўваць у патрэбнае рэчышча, каб не быць у гэтым выпадку «талерантнымі», у сэнсе абыякавымі, да іх лёсу і будучыні нашай краіны.

**Круглы стол правяла Алена ЛЯЎКОВІЧ.**
**Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.**

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5, корп. 2, пом. 1703. УНП 191224638 |
| **Продавец** | ЧТУП «СТАРОВЕР», г. Фаниполь, ул. Заводская, 94, каб. 84. УНП 690714533 |
| **Ликвидатор** | ООО «Правовая компания «Делегат», УНП 192660284 (+375 17 397-97-79-375) |

**Предмет аукциона** (одним лотом)

## Деревообрабатывающее оборудование и пиломатериалы в составе 24 единиц:

**аспирац. оборудование Nestro, станок строгальный WEINING Unimat U, ленточный делительный станок RAIMANN DVK, станок заточной Winter, инженерные доски** 642,953 кв. м, **столы,** 2 шт., **тумбы,** 2 шт., **шкафы,** 4 шт., **сегмент, погрузчик GABELSTAP-LER SID, штакетник** (лиственница) 0,33 куб. м, **колья** (лиственница) 6,75 куб. м. Полный перечень с указанием размеров см. на сайте организатора аукциона **ipmtorgi.by**.

Местоположение **– г. Фаниполь, ул. Заводская, 9а**

**Начальная цена лота (с НДС 20 %) – 103 833,14 бел. руб.** (снижена на 37 %)
Шаг аукциона – 5 191,66 бел. руб.

**Демонтаж, разборка, погрузка и транспортировка предмета аукциона** проводятся за счет покупателя. Продавец и организатор аукциона не оказывают услуг по демонтажу и вывозу предмета аукциона

**Порядок ознакомления:** в рабочие дня по предварительному согласованию +375 (29) 6979776 Антонов В.Н.

**Порядок оформления участия в аукционе и результатов торгов:** аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке продажи имущества ликвидир. юридич. лица с публич. торгов, утвержденным постановлением Совмина РБ от 8 января 2013 г. № 16 «О некоторых вопросах продажи имущества ликвидир. юридич. лица».
С подробной информацией можно ознакомиться на сайте организатора аукциона **ipmtorgi.by**

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на р/с BY92BELB3012 0048350080226000 в ОАО «Банк БелВЭБ», БИК BELBBY2X; УНП 191224638; получатель платежа – ООО «ИПМ-Консалт оценка»

**Срок подписания договора купли-продажи – 10 (десять) дней** после проведения аукциона

**Срок оплаты предмета аукциона:** не позднее **10 (десяти) календарных дней** со дня проведения аукциона

Победитель аукциона либо единственный участник, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %, обязан возместить затраты на организацию и проведение аукциона, а также оплатить вознаграждение организатору аукциона в размере **5 %** от цены продажи лота в течение 5 (пяти) дней со дня проведения аукциона

Предыдущее извещение опубликовано в газете «Звязда» 16.11.2022

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

**Дата и время проведения аукциона: 19.12.2022 в 13.00** по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, оф. 4б.
**Прием заявлений с 09.00 06.12.2022 до 17.00 16.12.2022** по тому же адресу

**Контактные телефоны: +375 17-280-36-37; +375 44-704-92-06.**
**E-mail: auction@ipmconsult.by**

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

**Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению ликвидатора ОАО «Передвижная механизированная колонна № 32»** (222310, Минская обл., г. Молодечно, ул. Молодежная, 2Б) **проводит открытый аукцион**

## ПО ПРОДАЖЕ ЗДАНИЯ КОНТОРЫ с инв. № 630/С-47139

***(составные части и принадлежности: бетонная площадка, противопожарный резервуар, сети водоснабжения, сети водоотведения, сети электроснабжения)*, общей площадью 385,8 кв. м, адрес: Минская область, Молодечненский район, Тюрлевский с/с, д. Носилово, ул. Школьная, 30 (далее – Объект).**

**Объект расположен на земельных участках с кадастровым номером 623884308601000407 (право постоянного пользования) площадью 1,9100 га, 623884308601000758 (право постоянного пользования) площадью 0,0002 га,** *который имеет ограничения в использовании: водоохранная зона реки, водоема – р. № 1, пл. 0,0002 га.*

**Начальная цена** с НДС (20 %) **– 59 520,00,00** бел. руб.

Задаток 10 % от начальной цены – **5 952,00** бел. руб.

**Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082 600169330000 в ОАО «Сбер Банк», г. Минск, ул. Чкалова, 18/1, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, код платежа – 40901, код категории платежа – OTHR, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».**

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объекта производится в течение 30 (тридцати) банковских дней со дня заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи.

Победитель аукциона (единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет торгов по начальной цене, увеличенной на 5 %) (покупатель) **возмещает затраты на организацию и проведение аукциона.**

Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах регламентирован Положением о порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.01.2013 № 16, размещенным на сайте организатора торгов **www.rlt.by.**

Аукцион состоится **06.01.2023 в 14.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324.**

Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **05.01.2023** до **16.00** по указанному адресу.

**Тел.: (8017) 516-80-65, 516-80-64, (8029) 102-21-17, телефон для осмотра 8 (029) 351 10 33.**

УНП 600077220

У **суд Фрунзенскага раёна горада Мінска** паступіла заява Сянько Міхаіла Уладзіміравіча аб прызнанні памерлым СТАРЧЭВОГА Аляксандра Сцяпанавіча 24 верасня 1955 года нараджэння, ураджэнца горада Мінска, апошняе вядомае месца знаходжання: г. Мінск, вул. Адоеўскага, д. 71, кв. 8.

Просьба да ўсіх грамадзян і юрыдычных асоб, якія маюць звесткі аб А. С. Старчэвым, паведаміць іх суду Фрунзенскага раёна г. Мінска на адрас: г. Мінск, вул. Дуніна-Марцінкевіча, 1, корп. 2 на працягу двух месяцаў з дня апублікавання аб'явы.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

## ОТКРЫТОЕ АКЦИОНЕРНОЕ ОБЩЕСТВО «ДОРОЖНО-СТРОИТЕЛЬНЫЙ ТРЕСТ № 3»

**21 декабря 2022 года в 11.00** проводит повторный открытый аукцион по продаже имущества

| № п/п | Сведения о предмете аукциона | Стоимость с учетом снижения на 30 %, без НДС | Сумма задатка, бел. руб. |
|---|---|---|---|
| Лот № 1 | автомобиль «VAZ-21150», тип ТС – легковой специальный седан (SEDAN), номер кузова (vin) XTA21150033475295, цвет – серебристо-желто-зеленый, год выпуска – 2003, регистрационный знак 5540 ВВ-6, инвентарный номер 2052 | 840,00 | 84,00 |
| Лот № 3 | автомобиль «GAZ-3110», тип ТС – легковой специальный седан (SEDAN), номер кузова (vin) XTH31100031164782, цвет – серебристый металлик, год выпуска – 2003, регистрационный знак 5481 TAI, инвентарный номер 1305 | 770,00 | 77,00 |
| Лот № 4 | автомобиль «SKODA OCTAVIA A5», тип ТС – легковой седан (SEDAN), номер кузова (vin) TMBBK41Z282202054, цвет – серебристый металлик, год выпуска – 2008, регистрационный знак 3658 ВВ-6, инвентарный номер 859 | 4 970,00 | 497,00 |
| Лот № 5 | автомобиль «CHEVROLET NIVA 212300-55», тип ТС – легковой автомобиль внедорожник-универсал (SUV UNIVERSAL), номер кузова (vin) X9L212300C0414126, цвет – светло-серебристый металлик, год выпуска – 2012, регистрационный знак 9593 ЕВ-6, инвентарный номер 861 | 5 250,00 | 525,00 |
| Лот № 6 | автомобиль «UAZ 31519», тип ТС – легковой автомобиль внедорожник-универсал (SUV UNIVERSAL), номер кузова (vin) XTT31519040576923 (31510040594871), цвет – темно-зеленый, год выпуска – 2004, регистрационный знак 2754 ЕВ-6, инвентарный номер 860 | 2 310,00 | 231,00 |
| Лот № 7 | автомобиль «CITROEN C5», тип ТС – легковой специальный хэтчбек, номер кузова (vin) VF7DCRHZB76067682, цвет – серебристый, год выпуска – 2001, регистрационный знак 9737 АТ-6, инвентарный номер 820 | 4 060,00 | 406,00 |
| Лот № 9 | автомобиль «GEELY EMGRAND X7», тип ТС – легковой специальный универсал (UNIVERSAL), номер кузова (vin) Y4K8762ZXFB009446, цвет – черный, год выпуска – 2015, регистрационный знак 0664 ЕТ-6, инвентарный номер 4251 | 13778,93 | 1377,89 |
| Лот № 10 | автомобиль «GEELY EMGRAND X7», тип ТС – легковой внедорожник-универсал (SUV UNIVERSAL), номер кузова (vin) Y4K8762Z6FB009430, цвет – черный, год выпуска – 2015, регистрационный знак 9058 ЕС-6, инвентарный номер 632 | 8 468,92 | 846,89 |
| Лот № 11 | Автомобиль «KIA SPORTAGE», тип ТС – легковой специальный внедорожник-универсал (suv universal), год выпуска – 1997, регистрационный знак – 0268 ЕТ-6, кузов (рама) № KNEJA5535V5416442, цвет ТС – темно-зеленый, инвентарный номер 14930 | 1 680,00 | 168,00 |

1. Наименование продавца – организатора аукциона, его место нахождения и контактные телефоны: ОАО «ДСТ № 3», г. Могилев, ул. Космонавтов, 23, тел. 802220712424.

2. Дата, время и место проведения аукциона: **21 декабря 2022 года в 11.00** по адресу: г. Могилев, ул. Космонавтов, 23, конференц-зал.

3. Порядок, в соответствии с которым проводится аукцион: Положение о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества, находящегося в собственности ОАО «ДСТ № 3» (утвержденное приказом генерального директора № 5 от 03.01.2022).

4. Участник аукциона за 3 рабочих дня до проведения аукциона должен подать заявление на участие в аукционе, подписать с ОАО «ДСТ № 3» соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона, а также перечислить организатору аукциона задаток в размере 10 % от первоначальной стоимости без НДС.

*Реквизиты текущего (расчетного) счета, на который должна быть перечислена сумма задатка: р/с BY54BPSB30121192410119330000, код BPSBBY2X в ОАО «Сбер Банк», УНП 700049607.*

5. Место, дата и время окончания приема заявлений на участие в аукционе с прилагаемыми к ним документами: 212022, г. Могилев, ул. Космонавтов, 23, кабинет 33; **дата: 15.12.2022 г., время: 17.00**.

6. Срок возможного снятия имущества с аукциона: за 3 дня до даты проведения аукциона.

7. Сроки подписания договора купли-продажи: договор купли-продажи имущества должен быть подписан победителем аукциона (претендентом на покупку) в редакции организатора аукциона после возмещения затрат на организацию и проведение аукциона и предоставления организатору аукциона копий платежных документов, но не позднее 5 рабочих дней.

8. Возмещение затрат на организацию и проведение аукциона: в течение 10 рабочих дней после утверждения протокола.

9. Извещение о проведении открытого аукциона по продаже имущества ОАО «ДСТ № 3» размещено в газете «Звязда» на сайте ОАО «ДСТ № 3».

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

## ОТКРЫТОЕ АКЦИОНЕРНОЕ ОБЩЕСТВО «ДОРОЖНО-СТРОИТЕЛЬНЫЙ ТРЕСТ № 3»

**22 декабря 2022 года в 11.00** проводит повторный открытый аукцион по продаже имущества

| № п/п | Сведения о предмете аукциона | Начальная цена продажи без НДС, бел. руб. | Сумма задатка, бел. руб. |
|---|---|---|---|
| Лот № 1 | Трактор К-701, заводской номер 8702588, год выпуска – 1987, регистрационный знак ТВ-6 9978, инвентарный номер 873 | 16200,00 | 1620,00 |
| Лот № 2 | Автогрейдер ДЗ-98 В 7.2, заводской номер 3150СП, год выпуска – 2001, регистрационный знак 9188 БЮ, инвентарный номер 383 | 33400,00 | 3340,00 |

1. Наименование продавца – организатора аукциона, его местонахождение и контактные телефоны: ОАО «ДСТ № 3», г. Могилев, ул. Космонавтов, 23, тел. 802220712424.

2. Дата, время и место проведения аукциона: **22 декабря 2022 года в 11.00** по адресу: г. Могилев, ул. Космонавтов, 23, конференц-зал.

3. Местонахождение имущества: лот № 1 – г. Костюковичи, ул. Кулешова, 17А, лот № 2 – г. Кричев, ул. Комсомольская, 126.

4. Порядок, в соответствии с которым проводится аукцион: Положение о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества, находящегося в собственности ОАО «ДСТ № 3» (утвержденное приказом генерального директора № 5 от 03.01.2022).

5. Участник аукциона за 3 рабочих дня до проведения аукциона должен подать заявление на участие в аукционе, подписать с ОАО «ДСТ № 3» соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона, а также перечислить организатору аукциона задаток в размере 10 % от первоначальной стоимости без НДС.

*Реквизиты текущего (расчетного) счета, на который должна быть перечислена сумма задатка: р/с BY54BPSB30121192410119330000, код BPSBBY2X в ОАО «Сбер Банк», УНП 700049607.*

6. Место, дата и время окончания приема заявлений на участие в аукционе с прилагаемыми к ним документами: 212022, г. Могилев, ул. Космонавтов, 23, кабинет 33; дата: **16.12.2022 г., время: 17.00**.

7. Срок возможного снятия имущества с аукциона: за 3 дня до даты проведения аукциона.

8. Сроки подписания договора купли-продажи: договор купли-продажи имущества должен быть подписан победителем аукциона (претендентом на покупку) в редакции организатора аукциона после возмещения затрат на организацию и проведение аукциона и представления организатору аукциона копий платежных документов, но не позднее 5 рабочих дней.

9. Возмещение затрат на организацию и проведение аукциона: в течение 10 рабочих дней после утверждения протокола.

10. Ссылка на ранее опубликованное извещение о проведении открытого аукциона по продаже имущества ОАО «ДСТ № 3» в газете «Звязда» от 29.09.2022, а также на сайте ОАО «ДСТ № 3».

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

## ОТКРЫТОЕ АКЦИОНЕРНОЕ ОБЩЕСТВО «ДОРОЖНО-СТРОИТЕЛЬНЫЙ ТРЕСТ № 3»

**26 декабря 2022 года в 11.00** проводит повторный открытый аукцион по продаже имущества

| № п/п | Сведения о предмете аукциона | Стоимость с учетом снижения на 20 %, без НДС | Сумма за-датка, бел. руб. |
|---|---|---|---|
| Лот 1 | Автомобиль «GAZ-5201», тип ТС – грузовой специальный, цистерна, номер кузова (vin) 0906663, цвет – голубой, год выпуска – 1986, инвентарный № 2101 | 3920,00 | 392,00 |
| Лот 2 | Автомобиль «ZIL-431412», тип ТС – грузовой специальный, цистерна, номер кузова (vin) XTZ431412R3392697, цвет – белый, год выпуска – 1994, инвентарный № 2039 | 5040,00 | 504,00 |
| Лот 3 | Автомобиль «MAZ 5337», тип ТС – грузовой специальный, машина дорожная комбинированная, номер кузова (vin) Y3M533700Y0037768, цвет – белый, год выпуска – 2000, инвентарный № 1967 | 8000,00 | 800,00 |
| Лот 4 | Трактор бульдозер Б 10М, заводской номер машины – 40920, год выпуска – 2008, инвентарный номер 4090 | 24160,00 | 2416,00 |
| Лот 5 | Каток «Амкодор 6223А», заводской (серийный, идентификационный) номер – 0506003, год выпуска – 2006, инвентарный номер 4030 | 16320,00 | 1632,00 |
| Лот 6 | Автогрейдер ГС-14.02, заводской номер – 070090, год выпуска – 2007, инвентарный номер 1415 | 51680,00 | 5168,00 |

1. Наименование продавца – организатора аукциона, его место нахождения и контактный телефон: ОАО «ДСТ № 3», г. Могилев, ул. Космонавтов, 23, тел. 802220712424.

2. Дата, время и место проведения аукциона: **26 декабря 2022 года в 11.00** по адресу: г. Могилев, ул. Космонавтов, 23, конференц-зал.

3. Местонахождение имущества: г. Могилев, Славгородский проезд, 17.

4. Порядок, в соответствии с которым проводится аукцион: Положение о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества, находящегося в собственности ОАО «ДСТ № 3» (утвержденное приказом генерального директора № 5 от 03.01.2022).

5. Участник аукциона за 3 рабочих дня до проведения аукциона должен подать заявление на участие в аукционе, подписать с ОАО «ДСТ № 3» соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона, а также перечислить организатору аукциона задаток в размере 10 % от первоначальной стоимости без НДС.

*Реквизиты текущего (расчетного) счета, на который должна быть перечислена сумма задатка: р/с BY54BPSB30121192410119330000 код BPSBBY2X в ОАО «Сбер Банк», УНП 700049607.*

6. Место, дата и время окончания приема заявлений на участие в аукционе с прилагаемыми к ним документами: 212022, г. Могилев, ул. Космонавтов, 23, кабинет 33; дата: **20.12.2022 г., время: 17.00.**

7. Срок возможного снятия имущества с аукциона: за 3 дня до даты проведения аукциона.

8. Сроки подписания договора купли-продажи: Договор купли-продажи имущества должен быть подписан победителем аукциона (претендентом на покупку) в редакции организатора аукциона после возмещения затрат на организацию и проведение аукциона и представления организатору аукциона копий платежных документов, но не позднее 5 рабочих дней.

9. Возмещение затрат на организацию и проведение аукциона: в течение 10 рабочих дней после утверждения протокола.

10. Ссылка на ранее опубликованное извещение о проведении открытого аукциона по продаже имущества ОАО «ДСТ № 3» – в газете «Звязда» 09.07.2022, 12.10.2022, а также на сайте ОАО «ДСТ № 3».

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона, оператор ЭТП** | **ООО «Расантехторг», г. Минск, ул. Беды, 33, помещение 339. Адрес ЭТП: www.torgi24.by** |
| **Продавец** | **ООО «Яркида» Минская область, г. Минск, ул. Попова, 26, к. 14** |

**Предмет электронных торгов:**

| Лот | Наименование (назначение), инвентарный номер | Начальная цена без НДС (бел. руб.) |
|---|---|---|
| 905 | Погрузчик «АМКОДОР» 342С4 № 1858 | 39 360,00 |
| 907 | Бетононасос, инвентарный № 000000308 | 56 960,00 |
| 908 | Кран башенный ВСТ-140 № 140007 | 148 800,00 |

**расположенный по адресу (лот 905 и 907):**
Минская обл., Минский р-н, д. Каралино, ул. Лесная, 33
**расположенный по адресу (лот 908):**
г. Минск, квартал застройки Минск-Мир, жилой дом № 7.3 по г. п.

**Размер шага** составляет **5 %** от начальной цены лота

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета электронных торгов в белорусских рублях (**для каждого лота**) перечисляется на р/с BY56UNBS30 120893600010000933 в ЗАО «БСБ Банк», код UNBSBY2X, г. Минск, пр-т Победителей, 23/3, УНП 191514793, получатель: ООО «Расантехторг»

**Срок подписания договора купли-продажи: 5** (пять) рабочих дней после электронных торгов

**Условия оплаты предмета электронных торгов**

Победитель торгов (претендент на покупку) обязан оплатить предмет аукциона в соответствии с договором купли-продажи, но не позднее 30 (тридцати) дней со дня проведения торгов, если иной срок не установлен собранием (комитетом) кредиторов

Победитель аукциона (претендент на покупку) обязан возместить затраты на проведение торгов и оплатить вознаграждение организатору аукциона в размере **10 %** от цены продажи лота в течение 5 (пяти) дней со дня проведения аукциона.
Затраты на организацию и проведение электронных торгов составили: по лоту (для каждого лота) – не более **1 500,00 бел. руб.**

**Начало торгов: 23.12.2022 г. в 09.00 до 16.00**

Для участия в торгах, необходимо подать заявку и пройти регистрацию в качестве участника торгов на торговой площадке: **www.torgi24.by**.
Прием документов на участие в торгах осуществляется организатором торгов ООО «Расантехторг» на электронную почту: **info@torgi24.by**.
Срок приема заявлений на участие в торгах и оплаты задатка – **с 06.12.2022 по 21.12.2022 с 9.00 до 17.00**

**Контактные данные: +375 (29) 607-79-50; +375 (29) 607-22-87.**
**E-mail: info@torgi24.by**

# Не хворыя, а АСАБЛІВЫЯ

## Аўтызм як выклік ключавым прынцыпам біямедыцынскай этыкі

**Наконт аўтызму ў грамадстве існуе шмат міфаў. Між іншым, даныя апошніх папуляцыйных даследаванняў сведчаць пра няўхільны рост распаўсюджанасці расстройстваў аўтыстычнага спектра (РАС). Паводле звестак, апублікаваных Цэнтрам па кантролі захваральнасці (ЗША) у снежні 2021 года, РАС сустракаюцца ў аднаго з 44 дзяцей ва ўзросце васьмі гадоў. Прычым сярод хлопчыкаў у сярэднім у 4,2 раза часцей, чым сярод дзяўчынак. Колькасць пастаўленых дыягназаў непасрэдна карэлюе з дасведчанасцю прафесійнай супольнасці аб прыкметах расстройстваў аутыстычнага спектра, а таксама з колькасцю падрыхтаваных спецыялістаў і наяўнасцю працэдур скрынінгу і дыягностыкі... Пра аўтызм па-ранейшаму ведаюць няшмат і педагогі, і медыкі, а тым больш простыя людзі, таму і рэакцыя на дзяцей з аўтыстычнымі расстройствамі часцей за ўсё бывае неадэкватнай.**

### Трывожныя сігналы

У рамках праекта «Біяэтычны ўніверсітэт», які ажыццяўляе Рэспубліканскі цэнтр біяэтыкі пры падтрымцы ЮНЕСКА і пад патранатам Нацыянальнай камісіі па справах ЮНЕСКА, **Юлія ВІШНЕЎСКАЯ, кіраўнік цэнтра дзённага знаходжання для дзяцей з аўтызмам, сертыфікаваны спецыяліст DIR/floortime, ABA-тэрапіст, дэфектолаг** і маці дзвюх асаблівых дзяўчынак падзялілася сваім прафесійным і асабістым вопытам работы з асаблівымі дзецьмі.

«Да сутыкнення з аўтызмам я працавала ў сферы біямедыцынскай этыкі, але з прычыны жыццёвых акалічнасцяў мне давялося змяніць прафесійную дзейнасць, і на сённяшні дзень у мяне ўжо 12 гадоў вопыту работы з аўтызмам і больш за 50 уласных вучняў, з якімі я правяла вельмі шмат часу, — расказала Юлія. — Самаму старэйшаму вучню, з якім працавала з ранняга ўзросту, споўнілася ўжо 15 гадоў. Я вельмі шмат бачыла, аналізавала і склала ўласнае меркаванне па дадзеным пытанні. Таму прапаную паглядзець на аўтызм як на з'яву, якая праяўляе сябе ў самых розных сферах: медыцынскай, педагагічнай, этычнай і сацыяльнай. Калі ў сям'і з'яўляецца асаблівае дзіця, мы не можам адразу здагадацца, што маем справу з аўтызмам. Была здаровая цяжарнасць, нармальныя роды... Нішто ў першы год жыцця дзіцяці нас не насцярожвае. І часцей за ўсё перад фактам, што з малым штосьці не так, мы аказваемся ва ўзросце год і два месяцы — год і шэсць месяцаў, калі ў дзяцей пачынаюць праяўляцца сацыяльныя здольнасці. І вось тут высвятляецца, што ў равесніка твайго дзіцяці гэтыя здольнасці ёсць, а ў яго яны адсутнічаюць. Часта бацькі апісваюць такую сітуацыю як рэгрэс, ім здаецца, што раней усё ішло нармальна, дзіця развівалася, а вось цяпер пачаўся адкат назад. Насамрэч яны маглі і не заўважаць трывожных сімптомаў. Ім здавалася, што немаўля рэагуе на маці, а яно магло рэагаваць, напрыклад, на яе яркі халат.

Даслоўна ў перакладзе з лацінскай мовы «аўтыст» значыць «паглыблены ў сябе». Аўтызм — парушэнні ў развіцці, якія характарызуюцца адхіленнямі ў паводзінах, зносінах і сацыяльным узаемадзеянні. Дзецям з аўтызмам праблематычна наладжваць кантакты з іншымі людзьмі, яны не разумеюць сацыяльныя заканамернасці, не рэагуюць на сацыяльныя з'явы, часта ў іх назіраюцца цяжкасці з маўленнем, ім вельмі складана кантраляваць і праяўляць свае пачуцці, ім уласцівыя рухі, якія паўтараюцца. «Аўцяты» выбудоўваюць сваю сэнсарную сістэму так, каб максімальна мінімізаваць кантакты з навакольным светам. А іх імпульсіўнасць выклікана звышадчувальнасцю да розных сэнсарных раздражняльнікаў».



### Інфармаваная згода

«Паведамленне, што тваё дзіця — не такое, як усе, бацькі ўспрымаюць як гром сярод яснага неба. У іх былі сумесныя планы на будучыню, але ім паведамілі пра аўтызм. Гарызонт планавання жыцця разбураецца. І ў гэты момант яны аказваюцца ў пекле. Знаходзіцца побач з дзіцем, якое не дае ніякай эмацыянальнай зваротнай сувязі, 24 гадзіны на суткі — надзвычай складана, — падкрэслівае Юлія. — Да таго ж і бацькоўскія паводзіны нішто не падтрымлівае: ты не можаш пагуляць з дзіцем, узяць яго на рукі. У малога столькі асаблівасцяў у сэнсарнай сістэме, што ўвогуле немагчыма зразумець, як да яго падступіцца. Ён можа дрэнна рэагаваць нават на ваш голас. Бацькі спрабуюць раз за разам наладзіць камунікацыю, а потым кідаюць тыя спробы. Дарэчы, як і іх дзіця, якое дарослыя не разумеюць. З боку малога можа быць агрэсія, самаагрэсія, самапашкоджанне. Дзеці ўчыняюць істэрыкі, плачуць, крычаць. Дарослыя баяцца выйсці з дому, баяцца чымсьці справакаваць такія паводзіны. Фарміруецца заганнае кола: мы няправільна разумеем малога, а яно няправільна разумее нас. Сям'я самастойна не спраўляецца. Даволі часта бацька сыходзіць з сям'і і ўвесь цяжар выхавання кладзецца на маці. Да мяне, як правіла, прыходзяць бацькі ўжо з глыбокай псіхалагічнай траўмай. У такіх сем'ях высокія паказчыкі суіцыдаў, прычым маці прымае такое рашэнне і за сябе, і за сваё дзіця.

Калі дзіця з расстройствам аўтыстычнага спектра не навучаць камунікацыі, яно застаецца на стадыі выкарыстання дарослага як прадмета. Будзе весці бацьку ці маці за руку і тыцкаць пальцам (калі ўказальны жэст у яго сфарміраваўся) або проста штурхаць у бок жаданага прадмета ці аб'екта».

«У Беларусі няма сістэмы дапамогі такім сем'ям, — канстатуе Юлія Вішнеўская. — Ёсць спецыялісты, якія маглі б дапамагчы дзіцяці — медыкі, лагапеды, педагогі... Але ў сям'і праблема не вырашаецца, і мой прафесійны досвед сведчыць, што дапамогу дзіцяці трэба распачынаць з дапамогі яго бацькам. Ім трэба працаваць з псіхатэрапеўтамі і псіхолагамі над тым, як перажыць гэту траўму. Таму што ўсе наступныя рашэнні, якія датычацца дзіцяці (якая дапамога будзе яму аказвацца, дзе, кім і ў якім аб'ёме), будуць прымаць яго бацькі. Адзін з найважнейшых прынцыпаў біяэтыкі — павага да асобы — у дадзеным выпадку азначае атрыманне інфармаванай згоды ад бацькоў на ўсё, што будзе далей адбывацца з дзіцем. Так вось можа здарыцца, што чалавека, здольнага прымаць узважаныя рашэнні своечасова, побач можа не аказацца, і ўсё, што мы будзем казаць бацькам, будзе імі ўспрымацца праз прызму псіхалагічнай траўмы.

А далей дзіця сутыкаецца з сістэмамі адукацыі і медыцынскай дапамогі, якія таксама не гатовыя працаваць з такімі дзецьмі. Педагогам, напэўна, не хапае нейкіх адукацыйных момантаў. А што датычыцца медыцынскай дапамогі, тут праблемы ўзнікаюць нават не ў плане дыягностыкі, а таму, што дзіця адчайна супраціўляецца, яно вельмі баіцца і не разумее, чаго ад яго хочуць. У выніку яно аказваецца па-за сістэмай медыцынскай дапамогі.

Пакуль дзіця малое, у бацькоў яшчэ хапае фізічных сіл яго ўтрымліваць, вазіць да ўрачоў, але далей тое становіцца немагчымым. Практычна кожны з маіх вучняў рана ці позна аказваўся без медыцынскай дапамогі. І тут узнікае яшчэ адна этычная праблема: а што рабіць, ці можам мы ў такой сітуацыі прымяняць да дзіцяці фізічную сілу? Быццам бы мы робім для яго лепш. Але ці так гэта насамрэч?

У некаторых краінах роўны доступ да медыцынскай дапамогі трактуецца наступным чынам: калі дзіця не хоча, дапамога яму не аказваецца. А дзіця можа і не хацець».

### Не ўпусціць магчымасці

«Ёсць яшчэ адзін важны нюанс, — звяртае ўвагу Юлія. — Калі мы кажам пра павагу да асобы, ці можам мы лічыць чалавека з аўтызмам асобай? Для асобы характэрная здольнасць несці адказнасць за свае ўчынкі, але ў дачыненні да чалавека з аўтызмам узнікаюць сумненні. Я лічу, мы павінны паступаць так, як паступаем з усімі дзецьмі, якім прыпісваем патэнцыял, верым, што яны могуць з цягам часу вырасці ў асобу. Але ў дачыненні да дзяцей з аўтызмам трэба не проста верыць, але яшчэ і ствараць адпаведныя магчымасці для іх развіцця і росту. А калі мы ставім перад імі нейкую планку, напрыклад навучыць завязваць шнуркі, то гэта вельмі нізкая планка. Сёння ёсць шмат эфектыўных педагагічных методык, якія маюць на ўвазе работу з сэнсарнымі магчымасцямі і дазваляюць развіваць дзіця з аўтызмам на высокім узроўні. Няправільна і неэтычна ставіць перад такімі дзецьмі нейкую планку.

Пры ўмове правільна арганізаванага суправаджэння і навучання дзяцей з аўтызмам вынікі такой работы ўражваюць. Людзі з аўтыстычнымі расстройствамі становяцца дактарамі навук, пісьменнікамі, перакладчыкамі, рэжысёрамі, музыкантамі. Яны расказваюць пра тое, як мысляць і як бачаць гэты свет. І мы ім за гэта ўдзячныя.

Ад аўтызму таблетак не існуе. Гэта павінны ведаць усе бацькі, у сям'і якіх з'явілася асаблівае дзіця. Усе дасягненні такіх дзяцей — гэта вынік карпатлівай работы з імі спецыялістаў. І чым раней пачнецца карэкцыя паводзін, тым лепшых вынікаў можна будзе дасягнуць і тым прасцей дзіцяці будзе адаптавацца ў грамадстве. Больш за тое, ніхто да канца не ведае біялагічнай прычыны аўтызму. У многіх краінах свету нават адзінага меркавання няма, куды аднесці гэта расстройства: у псіхіятрычную сферу ці ў неўралогію? Заўважана толькі наступная заканамернасць: найчасцей дзеці-аўтысты нараджаюцца ў сем'ях праграмістаў, на другім месцы ідуць банкаўскія служачыя, а на трэцім — педагогі».

«Калі дапамогу пачынаюць аказваць неўролагі, такія дзеці прыходзяць да мяне ўзбуджаныя прэпаратамі для актыўнасці галаўнога мозга, іх паводзіны складана карэкціраваць. І тут сферы дзейнасці педагогаў і медыкаў пачынаюць перасякацца. З пункту гледжання прафесійнай этыкі педагога я не маю права ўмешвацца ў дзеянні медыкаў, але нам усё ж такі трэба працаваць у адной камандзе, — падкрэслівае Юлія Вішнеўская. — Бацькі вельмі часта адмаўляюцца звяртацца па дапамогу да псіхіятраў, якія насамрэч могуць ім дапамагчы. Калі спецыялісты правільна падбяруць нейралептык, яго прыём можа істотна прасунуць дзіця наперад, павярнуць малое да навакольнага свету. Але тут паўстаюць этычныя пытанні. Трэба ацэньваць карысць і рызыку ад такіх прэпаратаў. Па маіх назіраннях, эфект ад іх прыёму ў нас не заўсёды адсочваецца».

### Разам ці паасобку?

А ці гатова наша грамадства да інклюзіі? Пытанне зусім не рытарычнае. Як правіла, дзеці-аўтысты вельмі дысгарманічна развітыя (яны ідуць наперадзе сваіх аднагодкаў у адной галіне, але значна адстаюць у іншых), таму для іх надзвычай актуальная праблема складання індывідуальных планаў навучання. Каб была магчымасць развівацца ў тым накірунку, які для іх найбольш перспектыўны і цікавы. Характэрнай асаблівасцю аўтызму з'яўляецца звышздольнасць чалавека канцэнтравацца на адной пэўнай ідэі, тэме ці мэце. Дзеці з расстройствамі аўтыстычнага спектра валодаюць розным узроўнем інтэлекту: ён можа быць зніжаны, на ўзроўні нормы ці быць вельмі высокім. Але ў калектыве яны не з'яўляюцца аўтсайдарамі.

«Двух аднолькавых дзяцей з аўтызмам мы не знойдзем ніколі. Іх псіхіка мае вялікія рэзервы для назапашвання самай рознай інфармацыі, вось толькі яна ніяк не размяркоўваецца імі па значнасці, уся інфармацыя для іх — аднолькава важная. Таму ў школе ім можа быць няпроста, — заўважае Юлія Вішнеўская. — Калі даюць заданне вывучыць верш — яны гэта зробяць, верш зойме пэўны аб'ём іх памяці, але дзіця пры гэтым ніколькі не прасунецца наперад у сваім развіцці. Проста зрасходуе сваю энергію, а для нас больш важна, каб яна выкарыстоўвалася для камунікацыі.

Спачатку работа з дзіцём-аўтыстам — гэта гульня ў адны вароты. Можна пераўтварыцца ў аніматара, выдаткаваць шмат сваёй энергіі і нічога не дабіцца Між іншым, сучасныя метады навучаюць нас працаваць на энергіі самога дзіцяці, ісці за яго інтарэсамі, улічваць яго асаблівасці (у гэтым адрозненне ад традыцыйнай сістэмы навучання, заснаванай на энергіі педагога). Так працаваць становіцца значна прасцей, а ККД навучання рэзка ўзрастае, у дзіцяці з'яўляецца ўласная матывацыя да навучання.

Калі мы змяшчаем асаблівае дзіця ў клас з нарматыповымі дзецьмі, гэта зусім не азначае, што інклюзія адбудзецца. Інклюзійная мадэль адукацыі прызнае, што ўсе дзеці ад прыроды розныя. Сістэма адукацыі і школа павінны імкнуцца, каб былі задаволены індывідуальныя патрэбы ўсіх вучняў без выключэння. Такім чынам, прыстасоўвацца павінен не вучань, а менавіта педагог. А вось спробы прымусіць дзіця капіраваць паводзіны звычайных аднагодкаў азначаюць, што да яго ставяцца як да праблемы, якую неабходна вырашыць, а не як да асобы, якую трэба зразумець».

«Інклюзія азначае, што абодва бакі гатовы прыняць адзін аднаго. А ў нас для таго, каб асаблівае дзіця навучалася ў адным класе са звычайнымі дзецьмі ці паехала ў аздараўленчы летнік, трэба спытаць дазвол у іншых дзяцей і іх бацькоў, — заўважае Юлія. — Калі я спрабавала знайсці сваім выхаванцам аб'яднанне па інтарэсах, то даволі часта атрымлівала адмоўны адказ. Мне праз коску называлі вельмі шмат прычын, хаваючы за «клопатам» пра гэтых дзяцей, у якіх нічога быццам бы не атрымаецца, сваё нежаданне з імі працаваць. Часцей адмаўлялі мне, калі я ішла прасіць як маці, і радзей, калі я прасіла як педагог. Напэўна, разважалі, што калі адзін педагог спраўціцца, то і я спраўлюся. А хтосьці адразу пагаджаўся. Ніхто з такіх педагогаў потым не пашкадаваў аб сваім рашэнні, таму што дзеці-аўтысты аказваюцца, як правіла, у ліку найлепшых выхаванцаў.

Мяркую, што ўсё залежыць ад нашай гатоўнасці сутыкнуцца з «іншасцю» і гатоўнасцю ці негатоўнасцю паглядзець на вучняў і выхаванцаў як на роўных нам. Шчыра скажу, што я проста захапляюся сваімі выхаванцамі. Кожны раз перад табой знаходзіцца такая загадка... І мне дастаўляюць задавальненне спробы яе разгадаць. Такія дзеці не ўмеюць ненавідзець, помсціць, зайздросціць — усё тое, што ўмеюць «звычайныя» людзі.

Дарэчы, у Амерыцы, дзе даўно дзейнічае практыка інклюзіўнай адукацыі, змаглі ацаніць яе эфект. Высветлілся, што нарматыповыя дзеці, якія знаходзіліся ў адным калектыве з асаблівымі дзецьмі, вырастаюць больш паспяховымі людзьмі: яны больш гнуткія ў стасунках з людзьмі, больш талерантныя, лягчэй знаходзяць агульную мову з кліентамі, і ў іх больш паспяхова складваецца кар'ера. Знаходзячыся з асаблівымі равеснікамі побач, звычайныя дзеці навучаюцца вельмі важным рэчам...»

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

*Поўны тэкст на zviazda.by*

# ШКЛЕНІКОВА. БОЛЬ ПРАДЗЕДАЎ І ПАМЯЦЬ СВЕДКАЎ

**Прыгожая лясная вёска Шкленікова Мядзельскага раена Мінскай вобласці была спалена разам з многімі жыхарамі 27 верасня 1943 года. У той восеньскі сонечны дзень 58 шленікоўскіх сядзіб фашысты ператварылі ў страшэннае папялішча, якое назаўжды пахавала пад сабой 15 мірных вяскоўцаў, сярод якіх быў мой прадзед Адам Сцяпанавіч. У 2023 годзе — 80-годдзе трагедыі Шкленікова.**

## Хараство даваеннага жыцця

Аповед пра гісторыю гэтай спаленай вёскі — трагічны і цяжкі, бо звязаны са смуткам і несуцешным болем, якія не праходзяць за дзясяткі гадоў і не пройдуць ніколі. Гэта радзіма маіх прадзедаў.

З дзяцінства мне шмат расказвалі пра даваеннае жыццё Шкленікова, у якім сама ніколі не жыла. Бабуля апавядала, што яно было шчаслівым, мірным і па-вясковаму прыгожым.

Цікавы факт: некалькі класаў Шкленікоўскай пачатковай школы скончыў у 20-я гады мінулага стагоддзя мой славуты зямляк, вядомы беларускі пісьменнік Максім Танк, які нарадзіўся ў вёсцы Пількаўшчына, што за некалькі кіламетраў адсюль. У гэтую школу хадзіў перад вайной і мой бацька. Дзедаўская сядзіба знаходзілася на ўскрайку вёсачкі, па-суседску з пачатковай школай.

Шкленікоўцы жылі спакойным жыццём, моладзь сустракалася на лаўцы пад маладой разгалістай ліпай (толькі яна адна ўцалела і да гэтай пары зелянее пасярод вёскі). Вяскоўцы жаніліся, стваралі сем'і, нараджалі дзяцей, гадавалі ўнукаў. А па вечарах, управіўшыся з хатнімі клопатамі, прыбраўшыся ў прыгожыя строі і павязаўшы яркія хусцінкі, збіраліся на вечарыны і спявалі, танцавалі пад гармонік. Сярод спявачак была і мая бабуля. Усе дзяліліся навінамі, якія паспелі адбыцца за дзень, простымі сямейнымі здабыткамі. І тое жыццё было такім радасным, шчасце — усёабдымным, здавалася, что яму няма канца і краю.

Бабуля расказвала, што сама яна, як і ўсе вясковыя жанчыны, зімовымі вечарамі прала і ткала пры святле газніцы. Трэба ж было сабраць у пасаг дзецям шарсцяныя ды льняныя «дываны» (пакрывалы), вышываныя ручнікі, абрусы, кашулі.

З вясны і да глыбокай восені работы на зямлі было хоць адбаўляй.



Аралі зямлю канём, сеялі збожжа і садзілі бульбу. На палетках пасвілі кароў, з малака рабілі смачныя тварог, сыры і масла. З воўны авечак стваралі прыгожыя вырабы. Жанчыны спраўна завіхаліся ў хатніх клопатах і знаходзілі гадзіну-другую ў ягады і грыбы збегаць у лес, які раскінуўся адразу за хатамі. А назад вярталіся з кошыкамі баравікоў, чарніц, брусніц, якіх, паводле аповедаў старажылаў, было тады багата.

## Суседка

Па-суседску з маімі дзядамі да вайны жыла Марыя Аляксееўна Купрэвіч (ей цяпер 95 гадоў). Яна дагэтуль добра памятае маіх прадзеда і дзеда, якія хадзілі да іх па ваду з калодзежа. Суседзі жылі як адна сям'я, шчыруючы разам па ўсіх хатніх клопатах.

Марыя Аляксееўна Купрэвіч дзеліцца ўспамінамі: «Беглі дзецьмі ў школу і па дарозе абавязкова любілі заглянуць з нейкай патрэбай да Фэлькі. Уражвалі незвычайная чысціня і ідэальны парадак ў хаце. А калі яна каля дома на вяроўку вешала саматканую льняную бялізну, старанна вымытую з самаробным драўляным валікам і пральнай дошкай, то яна, як хрустальная, вісела, роўная і прыгожая».

Дзед Валодзя быў умелым цесляром, і зробленыя ім табурэткі, сталы, дзверы ў дамах, куфэркі да гэтага часу служаць старажылам. Неяк раз ён араў зямлю і трапіў на міну часоў Першай сусветнай вайны. У выніку стаў інвалідам: пашкодзіла кісць рукі. Такое вось рэха даўніх, здавалася б, ваенных баёў.

...А затым як гром сярод яснага неба страшная навіна — ізноў вайна! Мой родны Нарачанскі край перажыў шмат у Першую сусветную, а затым і ў гады Вялікай Айчыннай вайны, якая перакрэсліла ранейшае жыццё і прынесла нечуваныя пакуты людзям.

## Карная аперацыя

Карная аперацыя, падчас якой загінула шмат жыхароў Мядзельскага раёна, праходзіла пад кодавай назвай «Фрыц». Мясцовым партызанам у 1943 годзе ўдалося адваяваць у ворага большую частку раёна, стварыць партызанскую зону, у якую не ўваходзілі толькі Свір і Крывічы, самыя крайнія пункты. І нягледзячы ні на якія намаганні карнікаў, зона ўтрымлівала свае граніцы да прыходу Чырвонай Арміі. Карная аперацыя «Фрыц» у верасні 1943-га была маштабнай — у ёй удзельнічала 70-тысячная нямецкая групоўка, якая акружыла некалькі раёнаў тагачаснай Вілейскай вобласці. Паколькі сілы былі няроўнымі, партызаны адышлі на поўнач. Усю сваю лютасць фашысты абрынулі на мірных людзей. Некалькі вёсак Сваткаўскага сельсавета было літаральна сцёрта з зямлі. Частку мясцовых жыхароў расстралялі або спалілі, многіх вывезлі на прымусовыя работы ў Германію.

## Узвіжанне, 27 верасня 1943 года

Трагічны лёс напаткаў тады і Шкленікова, жыхары якога дапамагалі партызанам. Жанчыны гатавалі для іх ежу, вязалі і шылі. Усё было дзеля агульнай перамогі. Немцы адказалі карнымі аперацыямі...

Усё пачалося 26 верасня 1943 года.

Па ўспамінах жывых сведкаў, з боку Княгініна па дарозе ў бок Мядзела рухалася калона нямецкіх салдат і паліцэйскіх.

Пачуўшы няспынны гул, многія шкленікоўцы здагадаліся, у чым справа, і хто толькі мог, у чым былі, у тым і пабеглі ў лес і на балоты, якіх наўкола было багата. Людзі сталі ўцякаць у бок балоцістай мясцовасці каля вёсак Сівыя і Нявёры. Сцежкі-дарожкі праз балоцістыя мясціны людзі ведалі выдатна, бо не раз напраскі крочылі ў іншыя вёскі.

Дома засталіся пераважна інваліды, старыя, хворыя і дзеці. Некаторыя не кінуліся ў лес, бо свята верылі, што іх, нямоглых ды калек, ніхто не кране, не па-божаму гэта...

Але карнікі прыйшлі ў вёску з жорсткімі намерамі і пакідаць у жывых нікога не збіраліся. Фашысты сагналі ў дом Рамана Місуны ўсіх, каго ўдалося знайсці ў вёсцы. Выходзіць жа забаранілі пад страхам смерці. Ноч для людзей прайшла ў жудасным чаканні і трывозе, што з імі будзе заўтра. Усе маліліся і жылі надзеяй на лепшае, што над імі злітуюцца і адпусцяць дахаты...

Раніца 27 верасня пачалася з таго, што фашысты сталі «сартаваць» людзей. Тых, хто быў стары, калека ці моцна галасіў, адвялі ў адзін бок.

Іншых, нават з маленькімі дзеткамі, прыгналі да калоны нявольнікаў — іх чакалі катаржныя работы ў Германіі.

А затым фашысты заняліся астатнімі. Людзей пад дуламі аўтаматаў разводзілі па хлявах, гумнах і ўласных хатах. Іх бязлітасна расстрэльвалі з аўтаматаў, а потым дабівалі адзінкавымі пісталетнымі выстраламі.

У хляве Віктара Чарняўскага забілі адразу некалькі чалавек з яго сям'і.

Не было жалю і да Ксеніі Глінскай, якая з маленькай дачушкай Юзэфай вярталася з суседняй вёскі Скарады і выпадкова трапіла на фашыстаў.

Да будынка школы прывялі майго прадзеда, Адама Сцяпанавіча Грышкевіча, які ўцячы не здолеў, немцы дагналі яго. Фашыст прашыў пажылога чалавека аўтаматнай чаргой, а потым паклаў на дровы і спаліў. Цяпер яго прозвішча ў жалобным спісе на абеліску. Дзякуй Богу, што здолелі тады ўратавацца яго сын Валодзя, нявестка Фэлька і ўнук Тадзік, якія разам з суседзямі пад аўтаматныя чэргі дабеглі да балот і проста цудам уцалелі.



95-гадовая Марыя Аляксееўна КУПРЭВІЧ — сведка генацыду жыхароў яе роднай вёскі Шкленікова 27 верасня 1943 года.

Людзей палілі пад жудасныя крыкі родных. Немагчыма слухаць гэтыя жахлівыя аповеды без слёз і жалю, якія працінаюць мяне кожны раз, вяртаючы ў думках у той трагічны дзень.

Вёска палала агнём і дагарала некалькі дзён.





Уладзіслава Бярняк, якая жыла за некалькі кіламетраў, у вёсцы Мацкі, успамінала, что чырвонае зарыва стаяла над Шклeніковам некалькі дзён.

Толькі адна векавая ліпа, якая і да гэтай пары шамаціць лісцем з вышыні свайго росту і ўзросту, засталася тады, як нямая сведка расправы над мірнымі вяскоўцамі.

Некаторым з вяскоўцаў удалося ўратавацца — тым, хто уцёк на лясныя балоты і хаваўся больш за тыдзень. Тых, хто быў маладзейшы, пагналі ў рабства ў Германію.

Эдмунда Сцяпанавіча Глінскага, бацьку мясцовай жыхаркі Аліны Абухавай, таксама пагналі ў Германію. Але ён з чатырма сябрамі саскочыў з цягніка пад Вілейкай і пайшоў у партызаны, а затым і на фронт. Пад Кёнігсбергам быў паранены, а ў шпіталі, дзе праходзіў лячэнне, сустрэў земляка Мікалая Чарняўскага. І ўжо разам яны вярталіся ў родны край, дзе іх сустрэла папялішча і зямлянкі, і разам адбудоўвалі вёску.

Яшчэ адна сямейная гісторыя тых часоў. Бацька мужа Ларысы Пішч застаўся сіратой, калі яму было толькі 10 дзён. У той дзень, калі хавалі памерлую ад цяжкіх родаў маці, прыйшла звестка пра загінулага бацьку.

...Праз людскія лёсы, бы чорная маланка, прайшла вайна.

## Сведка спаленай вёскі

Жыхарка Шкленікова, 95-гадовая Марыя Аляксееўна Купрэвіч, добра памятае той трагічны дзень, хоць мінула столькі часу.





У 1943-м дзяўчыне споўнілася 16 гадоў. Яна назаўжды запомніла той цёплы вераснёўскі дзень, які пад вечар стаў гарачым. За лічаныя гадзіны мірная вёсачка ператварылася ў папялішча.

Марыя Аляксееўна ўспамінае: «У страху мы беглі ў лес цераз поле, а следам даганялі кулямётныя чэргі. Калі людзі падалі на хаду, то фашысты па-зверску дабівалі іх. Хто быў маладзейшы і хутчэйшы, уцяклі... Як жудасна было. Мы з маці і татам, дзвюма сёстрамі выратаваліся. Гэта быў проста цуд».

Яе бабуля Магдалена Малько і цётка Хрысціна Малько згарэлі зажыва. У сэрцы жанчыны не загойваецца з гадамі душэўная рана і боль. Слёзы на вачах, калі яна расказвае: «Цётка Хрысціна, інвалід з маленства, схавалася ва ўласным доме пад печку, і яе жывую спалілі. Напакутавалася яна, памірала ў агні і дзікім болі. А перад гэтым яна ўгаворвала майго бацьку: заставайся са мной, немцы не пасмеюць нас крануць. Бацька ж казаў: пайшлі ў лес, памаленьку дойдзеш... Фашысты не пашкадавалі калеку, па-зверску спалілі. Адзін мой брат таксама здолеў уцячы і ваяваў потым у партызанскім атрадзе, а другі брат і дзядзька былі пагнаны ў Германію».

...На балотах людзі хаваліся каля тыдня. Быў чуваць строкат матацыклаў, гэта фашысты кінуліся шукаць у лясных мясцінах уцекачоў, але ісці ў балоты самі не адважыліся, што і ўратавала шкленікоўцаў. Страх перамешваўся з холадам, бо вераснёўскія ночы былі ўжо халодныя, а яшчэ нарастаў голад. Пяршэла ў горле ад дыму дагараючай вёскі. А ў небе стаяла страшэннае зарыва...

## На папялішчы

Адзін з мясцовых, які быў партызанам (кажуць, што Альфон Чарняўскі прыйшоў у вёску) калі пажарышча ўжо заціхла, папялішча астыла. Зусім выпадкова ён знайшоў за папялішчам уцалелы кавалачак тканіны ад кофтачкі матулі, Вінцулі Чарняўскай. Рыдаючы ад гора і нясцерпнага болю, мужчына прайшоўся па тых месцах, дзе яшчэ нядаўна стаялі хаты, і сабраў чалавечыя косці, а затым пахаваў іх там, дзе цяпер стаіць абеліск, якраз пасярод Шкленікова, якое не хутка аднавілася пасля вайны.

...Тыя, хто хаваўся ў балотах, таксама вярнуліся да родных гнёздаў, якія былі поўнасцю зруйнаваныя фашысцкімі карнікамі. Жыць не было дзе, і людзі паразыходзіліся па сваяках у суседнія вёскі.

Марыя Аляксееўна з маці і бацькам, дзвюма сёстрамі прытуліліся ў вёсцы Сівыя. І хоць у самога гаспадара свая сям'я была вялікая, дзяліліся тым, што мелі. Ложкі зладкавалі з плоту, хлеб пяклі з лебяды і верасу. Галодны быў час.

Сваякі ў Альсевічах прынялі маіх бабулю і дзядулю з сынам. Гаспадар Серафім Хіла ваяваў на фронце, а яго жонка Лёня і дачка Марыя прынялі пагарэльцаў як самых блізкіх людзей і таксама дзяліліся апошнім.

Калі скончылася вайна, то многія вярнуліся ў роднае Шкленікова. Перамога была найвялікшай радасцю на свеце. І хоць доўга жылі ў зямлянках, у беднасці, грэла надзея, што ў мірных умовах усяго можна дабіцца, усё адбудаваць. Паціху бацька Марыі Аляксееўны — ён быў добрым мулярам — пабудаваў дом на тым жа месцы, дзе стаяў даваенны. Пабудавалі дамы і іх суседзі, у тым ліку мае дзед з бабуляй. Мірнае жыццё ўваходзіла ў сваю каляіну. Але ніколі людзі не забываліся пра тое, што ім прыйшлося пераЖыць у гады вайны. І пра гэты боль яны стараліся расказваць сваім дзецям, унукам.

Выжыўшыя ў полымі вайны кажуць: «Самае галоўнае ў жыцці — мір, здароўе і каб свой век людзі ў пары жылі, у добрай дружбе і любові, спакойна і мірна».

## Абеліск

Больш за дзясятак гадоў таму ў Шкленікове ўстанавілася традыцыя: збірацца 27 верасня ўшаноўваць памяць ахвяраў генацыду. На мітынг-рэквіем прыязджае і Марыя Аляксееўна Купрэвіч. А колькі гадоў таму было некалькі чалавек — жывых сведак той трагедыі. Збіраюцца мясцовыя жыхары, сваякі загінулых, школьнікі, прадстаўнікі Мядзельскага райвыканкама, Сваткаўскага сельсавета.

І сустрэчы гэтыя заўжды напоўненыя ўспамінамі пра тых, што загінулі, — на помніку 15 прозвішчаў, але кажуць, что іх на самай справе было значна больш; размовамі пра важнасць міру.

27 верасня 1943 года толькі ў Сваткаўскім сельсавеце Мядзельскага раёна поўнасцю было знішчана восем вёсак. За гады Вялікай Айчыннай вайны ў Нарачанскім краі фашысты разбурылі і спалілі 87 паселішчаў.

У Беларусі ў выніку нацысцкай палітыкі генацыду і «выпаленай зямлі» за тры гады акупацыі знішчана больш за 2,2 млн чалавек.

...Колькі б ні мінула часу, боль трагедыі загінулых у полымі вайны сваякоў, суайчыннікаў не загоіцца. Памяць аб мінулым — як напамін будучым пакаленням шанаваць і берагчы мір на сваёй роднай зямлі.

**Аліна ГРЫШКЕВІЧ,**
**фота аўтара.**

*Праект створаны пры фінансавай падтрымцы ў адпаведнасці з Указам Прэзідэнта № 131 ад 31 сакавіка 2022 года.*

**ИНФОРМАЦИЯ**
**о проведении повторного открытого аукциона**
**по продаже недвижимого имущества, принадлежащего**

## ОАО «Химчистка и стирка белья»

**Организатор аукциона – МГ УКП «Центр по приватизации»,**
212030, г. Могилев, ул. Первомайская, 28а,
тел.: 8-0222-42-25-64, 8-029-15-15-444.

**Повторный аукцион состоится <u>21 декабря 2022 года</u> в 15.00**
**по адресу: г. Могилев, пер. Комиссариатский, 5.**

**Предмет аукциона** (наименование объекта, его местонахождение, арендуемая площадь, кв. м):

**ЛОТ № 1**

- Изолированное помещение с инв. № 700/D-152301, общей площадью 363,5 кв. м, расположенное по адресу: г. Могилев, Славгородское шоссе, 179-2;
- изолированное помещение с инв. № 700/D-152300, общей площадью 156,7 кв. м, расположенное по адресу: г. Могилев, Славгородское шоссе, 179-1;
- капитальное строение (склад) с инв. № 700/С-81484, общей площадью 78,0 кв. м; капитальное строение (склад) с инв. № 700/С-81483, общей площадью 128,0 кв. м; капитальное строение (благоустройство территории) с инв. № 700/С-106077, общей площадью 3315,4 кв. м; ворота металлические; ограждение металлическое; эстакада железобетонная, расположенные по адресу: г. Могилев, Славгородское шоссе, 159.

Начальная цена продажи – 73 352 р. 82 к. (с учетом НДС).
**Начальная цена продажи понижена на 20 %.**
Заявки принимаются ежедневно в рабочие дни с 8.00 до 17.00 (обеденный перерыв – с 13.00 до 14.00) по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 28а, каб. 407.

**Последний день приема заявлений и внесения задатка – 19 декабря 2022 года до 13.00.**
Заявления, поступившие после указанного срока, не рассматриваются.

**Информация об опубликовании извещения размещена на официальных сайтах**
Могилевского областного исполнительного комитета
**www.mogilev-region.gov.by**,
Могилевского городского исполнительного комитета
**www.mogilev.gov.by.**

## Брестский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» извещает о проведении повторного открытого аукциона по продаже права заключения договора аренды недвижимого имущества, принадлежащего РУП «Брестское отделение Бел. ж. д.»

**Наименование и местоположение объекта:**
**ЛОТ:** право заключения договора аренды имущества:
1) Капитальное строение с инв. № 100/С-27639 (наименование: гаражи; назначение: здание специализированное автомобильного транспорта) площадью 245,8 кв. м, составные части и принадлежности: уборная, покрытие, забор, забор, забор, забор, ворота, калитка;
2) Капитальное строение с инв. № 100/С-41749 (наименование: гараж; назначение: здание специализированное автомобильного транспорта) площадью 55,9 кв. м;
3) Капитальное строение с инв. № 100/С-27644 (наименование: сарай; назначение: здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ) площадью 73,7 кв. м;
4) Капитальное строение с инв. № 100/С-27640 (наименование: склад ГСМ; назначение: здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ) площадью 26,6 кв. м.
**Все объекты расположены по адресу:**
**Брестская обл., г. Брест, ул. Скрипникова, 7**

| | |
|---|---|
| **Начальная цена продажи, руб.** | **1 875,90** |
| **Срок договора аренда** | **пять лет** |

Организатор аукциона: Брестский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», 224005 г. Брест, ул. Наганова, 10-329, 80162 40 87 01.

**Аукцион состоится 16 декабря 2022 г. в 11.00**
**по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-325**

Сведения о документах, которые необходимо представить для участия в аукционе, правила проведения аукциона содержатся на сайте организатора аукциона www.ocenkabrest.by, их также можно узнать по телефонам: 8 (0162)-40-87-01, 40-87-02

Извещение о проведении аукциона размещено на сайте Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь (https://au.nca.by/auction/12598)

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

**Государственное предприятие**
**«Минский областной центр инвестиций и приватизации»**
**(организатор аукциона)**
**по поручению открытого акционерного общества**
**«Гольчицкое» (продавец) проводит открытый аукцион**

## ПО ПРОДАЖЕ КОРОВНИКА д. Аполины

***(составные части и принадлежности: склад)***
**с инв. № 640/С-114899 общей площадью 1812,8 кв. м, расположенного на земельном участке с кадастровым номером 624684800001000011** *(право постоянного пользования)* **пл. 2,3898 га, по адресу: Минская область, Слуцкий район, Первомайский с/с, 11, севернее д. Аполины.**

*Земельный участок имеет ограничения в использовании: охранная зона электрических сетей, пл. 5,2000 га; придорожная полоса автомобильных дорог, пл. 7,1000 га.*

Начальная цена с НДС – **81 835,00** бел. руб.

Задаток 10 % от начальной цены – **8 183,00** бел. руб.

**Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ОАО «Сбер Банк», г. Минск, ул. Чкалова, 18/1, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, код платежа – 40901, код категории платежа OTHR, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».**

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объекта производится в течение 30 (тридцати) банковских дней после заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи. <u>Победитель (единственный участник) аукциона оплачивает Организатору аукциона вознаграждение за организацию и проведение торгов в размере 5 (пяти) процентов от окончательной цены продажи предмета аукциона, а также возмещает Продавцу затраты на публикацию извещения о проведении торгов.</u>

Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов **www.rlt.by.**

Аукцион состоится **06.01.2023** в **12.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **05.01.2023** до **16.00** по указанному адресу **в каб. 320.**

**Тел.: (8017) 516-80-65, 516-80-64, (8029) 102-21-17, (8029) 136-31-11, тел. для осмотра: (8029) 634-69-87.**

УНП 690673295

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5, корп. 2, пом. 1703 |
| **Продавец** | ОАСО «Би энд Би иншуренс Ко», г. Минск, ул. Я. Коласа, 38. Тел. + 375 29 688-04-88 |

**<u>Предмет аукциона</u>**

**Лот № 1**
Местоположение **– г. Минск, ул. Замковая, 33**

**<u>Офисная мебель и оргтехника</u> в составе 437 единиц:** ПЭВМ, коммутаторы, кондиционеры, счетчики банкнот, копир. аппараты, пожарн. сигнализация, источники беспереб. питания, компьют. сеть, система симметрич. связи, счетно-денежн. машинки, мебель, кабельная телеф. линия, системы вентиляции и кодиционирования воздуха, сейфы, комплекты перегородок, аппарат нагрева-охлаждения воды, рольшторы (полный перечень см. на сайте организатора аукциона **ipmtorgi.by**)

**Начальная цена лота № 1 (с НДС 20 %) – 142 692,48 бел. руб.** (снижена на 30 %). Шаг аукциона – 7134,62 бел. руб.

**Лот № 2**

**<u>Помещение санитарно-бытового назначения</u>** (**1,7 кв. м,** инвент. № 500/D-7028275).
Адрес: **г. Минск, ул. Лили Карастояновой, 32-19**

**Начальная цена лота № 2 (с НДС 20 %) – 2 100,00 бел. руб.** (снижена на 30 %). Шаг аукциона – 105,00 бел. руб.

Местоположение лотов №№ 3-5 –
**Минская обл., Минский р-н, Щомыслицкий с/с, направление ТЭЦ-4, 3-й пер. Монтажников, 3**

**Лот № 3**

**Изолированные помещения: № 1** (производственное помещение, 600/D-91728) 206,3 кв. м, **№ 2** (административное помещение, 600/D-91729) 221,7 кв. м, **№ 3** (производственное помещение, 600/D-91730) 288,4 кв. м, **складское помещение (**600/D-40243) 205,2 кв. м

**Начальная цена лота № 3 (с НДС 20 %) – 1 528 800,00 бел. руб.** Шаг аукциона – 76 440,00 бел. руб.

**Лот № 4**

**Административное помещение** (этаж 3, 600/D-40239) 233,6 кв. м

**Начальная цена лота № 4 (с НДС 20 %) – 452 400,00 бел. руб.** Шаг аукциона – 22 620,00 бел. руб.

**Лот № 5**

**Административное помещение** (этаж 5, 600/D-40241) 83,9 кв. м

**Начальная цена лота № 5 (с НДС 20 %) – 176 400,00 бел. руб.** Шаг аукциона – 8 820,00 бел. руб.

Обременение: площади помещений (лоты №№ 3–5) частично сданы в аренду (с информацией можно ознакомиться на сайте организатора аукциона ipmtorgi.by)

Местоположение лотов №№ 6, 7 –
**г. Минск, ул. Замковая, д. 33-6, 33-1а**

**Лот № 6**

**Административно-торговое помещение** (500/D-7023833) 733,5 кв. м

**Начальная цена лота № 6 (с НДС 20 %) – 1 926 000,00 бел. руб.** Шаг аукциона – 96 300,00 бел. руб.

**Лот № 7**

**Кабинеты 87,9 кв. м с открытой автостоянкой пл. 523 кв. м** (500/D-708041778)

**Начальная цена лота № 7 (с НДС 20 %) – 348 000,00 бел. руб.** Шаг аукциона – 17 400,00 бел. руб.

**Порядок ознакомления:** в рабочие дня по предварительному согласованию, +375 (29) 680-80-99 (Шубко Юлия Владимировна)

**Порядок оформления участия в аукционе и результатов торгов:** аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке продажи имущества ликвидир. юридич. лица с публичных торгов, утвержденным постановлением Совмина РБ от 8 января 2013 г. № 16 «О некоторых вопросах продажи имущества ликвидируемого юридического лица». К участию в торгах допускаются лица, подавшие организатору аукциона в указанный срок заявление с приложением всех необходимых документов, зарегистрированные в журнале регистрации заявлений на участие в торгах, и заключившие с организатором торгов договор о задатке. С подробной информацией можно ознакомиться на сайте организатора аукциона **ipmtorgi.by**

В случае регистрации на аукцион одного участника предмет аукциона может быть продан данному участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 %

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на р/с BY92BELB30120048350080226000 в ОАО «Банк БелВЭБ», г. Минск, ул. Мясникова, 32; БИК BELBBY2X; УНП 191224638; ОКПО 378531865000, получатель платежа – ООО «ИПМ-Консалт оценка»

| | |
|---|---|
| **Срок подписания договора купли-продажи** | **10 (десять) рабочих дней** после проведения аукциона |

**Условия оплаты предмета аукциона:** предмет аукциона должен быть оплачен покупателем в течение **20 (двадцати) рабочих дней** со дня проведения аукциона

Победитель аукциона либо единственный участник, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %, обязан возместить затраты на организацию и проведение аукциона, а также оплатить организатору аукциона вознаграждение по лотам № 1, № 2 – 4 %, №№ 3–7 – 3 % от цены продажи в течение 5 (пяти) рабочих дней со дня проведения аукциона

Извещение о проведении предыдущего аукциона опубликовано в газете «Звязда» 12.11.2022

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

| | |
|---|---|
| **Дата и время проведения аукциона** | **22.12.2022 в 12.00** по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ООО «ИПМ-Консалт оценка» |
| **Дата и время начала и окончания приема заявлений** | **С 09.00 06.12.2022 до 17.00 21.12.2022,** по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ООО «ИПМ-Консалт оценка» |

**Контакты: +375 17-280-36-37; +375 44-704-92-06, auction@ipmconsult.by**

ЗАРЭГІСТРАВАНА
2 снежня 22

УТВЕРЖДЕНО
Решение единственного участника Общества с дополнительной ответственностью «ТУТ и ТАМ Логистикс»
18 ноября 2022 г. № 29/22

ИЗМЕНЕНИЕ 7
в Проспект эмиссии облигаций первого выпуска Общества с дополнительной ответственностью «ТУТ и ТАМ Логистикс», утвержденный решением единственного участника Общества с дополнительной ответственностью «ТУТ и ТАМ Логистикс» от 6 августа 2018 г. № 02,
с учетом изменения, утвержденного решением единственного участника Общества с дополнительной ответственностью «ТУТ и ТАМ Логистикс» от 25 февраля 2019 г. № 2/19,
с учетом изменения 2, утвержденного решением единственного участника Общества с дополнительной ответственностью «ТУТ и ТАМ Логистикс» от 7 июня 2019 г. № 11/19,
с учетом изменения 3, утвержденного решением единственного участника Общества с дополнительной ответственностью «ТУТ и ТАМ Логистикс» от 28 июня 2019 г. № 12/19,
с учетом изменения 4, утвержденного решением единственного участника Общества с дополнительной ответственностью «ТУТ и ТАМ Логистикс» от 5 августа 2019 г. № 13/19,
с учетом изменения 5, утвержденного решением единственного участника Общества с дополнительной ответственностью «ТУТ и ТАМ Логистикс» от 16 декабря 2020 г. № 16/20,
с учетом изменения 6, утвержденного решением единственного участника Общества с дополнительной ответственностью «ТУТ и ТАМ Логистикс» от 6 июля 2021 г. № 12/21

1. В таблице пункта 1.7 строку 6 изложить в следующей редакции:
«

| № п/п | Полное наименование | Место нахождения |
|---|---|---|
| 6 | Могилевский филиал ОДО «ТУТ и ТАМ Логистикс» | Могилевская обл., Могилевский р-н, Вейнянский с/с, 22/1, производственное здание ИООО «Мебелаин» в районе ОАО «Могилевхимволокно» и аг. Вейно |

».

2. Подпункт 1.8.1 пункта 1.8 изложить в следующей редакции:
«1.8.1. Сведения о членах Совета директоров Эмитента:
1. Ткачук Сергей Александрович – председатель Совета директоров.
Все занимаемые должности, в том числе вне органов управления Эмитента, в настоящее время: с 01.02.2007 по настоящее время – Начальник управления логистики ОДО «Мостра-групп». Доли в уставном фонде Эмитента не имеет.
2. Вежновец Сергей Петрович – член Совета директоров.
Все занимаемые должности, в том числе вне органов управления Эмитента, в настоящее время: с 01.12.2020 по настоящее время – Заместитель начальника управления продаж ООО «Тибетрэй». Доли в уставном фонде Эмитента не имеет.
3. Попов Леонид Константинович – член Совета директоров. Должностей, в том числе вне органов управления Эмитента, в настоящее время не занимает. Доли в уставном фонде Эмитента не имеет.
Коллегиальный исполнительный орган у Эмитента отсутствует.».
3. Подпункт 1.8.2 пункта 1.8. изложить в следующей редакции:
«1.8.2. Сведения о лице, осуществляющем полномочия единоличного исполнительного органа Эмитента
Резанов Роман Александрович.
Все занимаемые должности, в том числе вне органов управления Эмитента, в настоящее время: с 09.08.2022 по настоящее время – генеральный директор Эмитента; с 09.08.2022 по настоящее время – ведущий специалист ОДО «Мостра-групп»; с 01.06.2022 по настоящее время – ведущий специалист ОДО «Фрэшлэнд»; с 01.06.2022 по настоящее время – ведущий специалист ООО «Стима»; с 01.06.2022 по настоящее время – ведущий специалист ООО «Тибетрэй»; с 01.06.2022 по настоящее время – ведущий специалист СООО «Белвингрупп».
Доли в уставном фонде Эмитента не имеет.».
4. Подпункт 1.9.1 пункта 1.9 изложить в следующей редакции:
«1.9.1. Участник Эмитента:

| | |
|---|---|
| Компания «Полиплан Холдингс Лимитед» (Polyplan Holdings Limited) | |
| Место нахождения: Гладстонос, дом Киприану, 85, 4 этаж, квартира/офис 403, 3032, Лимассол, Кипр (Gladstonos, 85, Kyprianou building, 4th floor, flat/office 403, 3032, Limassol, Cyprus) | |
| Размер доли в уставном фонде Эмитента | 100 % |

».

Генеральный директор Общества с дополнительной ответственностью «ТУТ и ТАМ Логистикс» Р.А. Резанов

Главный бухгалтер Общества с дополнительной ответственностью «ТУТ и ТАМ Логистикс» О.В. Костылева

## Брестский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

**Предмет торгов – Лот: капитальное строение с инвентарным номером 622/С-45640 (наименование: жилой дом; назначение: здание одноквартирного жилого дома), площадью 74,2 кв. м, расположенное по адресу: Минская обл., Столбцовский р-н, г. Столбцы, ул. Калиновского, 7, на земельном участке с кадастровым номером 625450100001004459, площадью 0,0568 га (выделен на праве аренды, срок по 16.06.2063).** Составные части и принадлежности: сборно-щитовой облицованный кирпичом жилой дом А1/сщ, с дощатой верандой 1, кирпичным сараем 2, бетонным погребом (2)

| Начальная цена, руб. | 11 340,00 | Размер задатка, руб. | 1 134,00 | Шаг, руб.: | 567,00 |
|---|---|---|---|---|---|

Ознакомиться с предметом торгов можно в рабочие дни, предварительно согласовав время по тел. 8029 569 19 72. Продавец: ОАО «Столбцовский РКБО», тел./ф. 8029 569 19 72. Организатор торгов: Брестский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Брест, ул. Наганова, 10-329, 801620408701. Р/с для перечисления задатка: р/с BY32BAPB30127866600100000000, в ОАО «Белагропромбанк» ЦБУ № 116 в г. Брест, РД по Брестской области, код банка BAPBBY2X, УНП 201028245. Задаток перечисляется на расчетный счет организатора аукциона. Срок подписания договора купли-продажи: не позднее 15 рабочих дней со дня проведения аукциона. Условия оплаты: согласно подписанному договору купли-продажи в течение 30 дней с даты подписания договора купли-продажи. Условия продажи: без условий. Информация о возмещении затрат: участник аукциона, выигравший торги, в течение 3 рабочих дней со дня аукциона возмещает затраты на организацию и проведение аукциона, включающие вознаграждение Организатора аукциона. Срок возможного отказа от проведения аукциона: не позднее чем за 3 календарных дня до наступления даты проведения аукциона. Обременение: в выставляемом на торги объекте зарегистрированы и проживают граждане, в т. ч. несовершеннолетние. В случае если торги признаны несостоявшимися в связи с тем, что заявление на участие в них подано только одним участником либо для участия в них явился только один участник, предмет торгов может быть продан единственному участнику, подавшему заявление на участие в торгах, при его согласии, по начальной цене, увеличенной на 5 (пять) процентов. Ранее извещение о проведении повторного аукциона размещено в газете «Звязда» от 04.10.2022.

**Аукцион состоится 19 декабря 2022 г. в 11.00 по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-325**

Сведения о документах, которые необходимо представить для участия в аукционе, порядок оформления участия в аукционе, порядок оформления результатов торгов, а также иная информация содержатся на сайте Организатора аукциона www.ocenkabrest.by, а еще ее можно узнать по телефонам: 8 (0162) 40-87-01, 40-87-02

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-329 в рабочие дни с 9.00 до 17.00.**
**Последний день приема заявлений – 19 декабря 2022 г. до 10.00**

# «ВЕЦЕР ГАЛІНІЦЬ І ЛУЧЫЦЬ ІМЁНЫ»

**Радкі Алеся Разанава з «Паэмы раўнавагі» могуць быць ключом да скарбонкі, у якой ён зберагаў сваё разуменне шчасця. Ён не з тых паэтаў, хто выказваецца непасрэдна ці проста — усё самае дарагое пакідаў сабе, а калі казаў, то так, што свае маглі зразумець, а чужыя захапляліся дзівоснымі словамі. Спробы адчуць энергію яго слоў застануцца і пасля сыходу паэта, як і жаданне зразумець Алеся Разанава як чалавека — бо надзвычай загадкавая асоба прыйшла ў свет 75 гадоў таму 5 снежня ў вёсцы Сялец Бярозаўскага раёна. Магчыма, энергія чалавека памнажаецца энергіяй мясцін, якія яго сілкуюць, бо ў лёсе Разанава не было выпадковых пунктаў ці нязначных эпізодаў — усе ён здолеў падпарадкаваць на карысць сваёй справе — паэзіі. Калі даследаваць яго біяграфію, то ўсяго год (1970/71) пасля інстытута Разанаў працаваў настаўнікам у Камянецкім раёне. Але мала хто ведае, што менавіта гэты год вызначыў яго чалавечы лёс: там, у вёсцы Бабічы, вырасла яго будучая жонка. З Галінай Мікалаеўнай мы размаўлялі пра чалавека, з якім яна падзяліла больш за 40 гадоў жыцця. І працягвае падзяляць — калі яна гаворыць, ёсць адчуванне, што ён стаіць побач...**



***— Алесь Сцяпанавіч вельмі беражліва ставіўся да слоў, кожнае ўзважваў і прамаўляў з асаблівым значэннем. Якімі былі першыя словы, што вы ад яго пачулі?***

— Аляксандр Сцяпанавіч Разанаў прыйшоў да нас у школу настаўнікам па беларускай мове і літаратуры. Нестандартныя ўрокі, абсалютная цішыня ў класе — калі ён гаварыў, не слухаць было немагчыма. Трымаючы дыстанцыю, умеў размаўляць з вучнямі на роўных. Калі мы добра працавалі на ўроку — нас чакаў бонус: некалькі хвілін Аляксандр Сцяпанавіч чытаў вершы на памяць, а мы з захапленнем слухалі яго. Думаю, у той час вучні былі першымі слухачамі ягоных вершаў, бо ён не гаварыў, хто аўтар...

Пасля, адслужыўшы ў войску, Аляксандр Сцяпанавіч некалькі разоў наведваўся ў школу, прыходзіў да нас на ўрок беларускай літаратуры. Ужо працуючы ў Мінску, у часопісе «Родная прырода», пісаў нам лісты. Адказваць аднакласнікі даручылі мне. Я пісала настаўніку пра ягоных вучняў — хто і дзе апынуўся пасля школы. Паведаміла, куды пайшла працаваць, каб на наступны год ізноў паступаць у інстытут.

І вось аднойчы ён завітаў на нашу фабрыку разам з Міколам Пракаповічам, які працаваў на Брэсцкім тэлебачанні, — нібыта збіралі матэрыял для перадачы. Выклікалі мяне — выйшла ў хусцінцы, у рабочым халаціку, вельмі збянтэжаная...

Кожны раз, як ён прыязджаў у Брэст, імкнуўся сустрэцца са мной. Аднойчы запрасіў у рэстаран. Кажу, што прыйду з сяброўкай-аднакласніцай: ёй жа таксама будзе цікава пабачыць настаўніка. Да нашай кампаніі далучыліся Мікола Пракаповіч і Іван Арабейка. Гутарылі пра творчасць, Алесь чытаў на памяць «На куццю». Гэта было падобна на цэлы спектакль, у якім важныя і голас, і рухі, і кожнае слова. А мы слухалі і не разумелі, чаму тут апынуліся...

Аднойчы прыехаў у Брэст у камандзіроўку, завітаў на кватэру, дзе мы здымалі пакой. Мне было няёмка перад гаспадарамі, але яны, відаць, усё разумелі больш, чым я на той момант. Разам з Алесем тады быў Уладзімір Дамашэвіч, які пасля сказаў: «Дурань будзеш, калі не ажэнішся...» З 1978 года мы разам...

***— Калі вы пазнаёміліся з яго сям'ёй, ці не ўзнікла пытання: а чаму ён выбраў беларускую мову? Бо тата ў яго быў рускі, а там, дзе ён нарадзіўся, ужывалі палескую гаворку...***

— Ніколі не чула, каб ён гаварыў на дыялекце, нават калі мы прыязджалі ў Сялец. Бацькі ў яго па-руску гаварылі. А ён зрабіў свой выбар, таму што жыў не сённяшнім днём — думаў пра нешта большае. Напэўна, ён прадбачыў Беларусь і разумеў, якой яна павінна быць і якім ён будзе ёй найбольш патрэбны.

Алесь Сцяпанавіч ніколі не сказаў мне: «Гавары са мной па-беларуску». Я скончыла рускую школу, але праз месяц сумеснага жыцця нейк незаўважна для сябе ў нашых зносінах перайшла на беларускую мову. Настолькі натуральна беларуская мова ўвайшла ў жыццё нашай сям'і, што нават людзі, якія прыходзілі да нас у госці, спрабавалі гаварыць па-беларуску. Алесь ніколі не папраўляў ні мяне, ні дзяцей, ні каго іншага. Мог хіба перапытаць, ужыўшы правільна тое ці іншае беларускае слова. Настолькі далікатна і карэктна гэта рабіў — сапраўды меў талент.

Шмат што ішло ад сям'і. Яго бацька ўмеў сказаць у рыфму, хоць сам па сабе быў нешматслоўны. А маці была выдатная апавядальніца — калі распавядала пра свае сны альбо паведамляла сялецкія навіны, Алесь гатовы быў яе слухаць падоўгу. Праўда, ліставанне са свякроўкай вельмі хутка стала весці я — мы выдатна паразумеліся ў агульных клопатах.

***— У творах ён паэт-філосаф, самотнік, і здаецца, што адмяжоўваў асабістае жыццё ад творчасці...***

— ...Я неяк нават спытала: «А чаму ты пра мяне нічога не пішаш?» Ён усміхнуўся: «Чытай уважліва. У кожнай кніжцы ты прысутнічаеш».

Цяпер я перачытваю яго творы і ўспамінаю гэтыя словы. Напрыклад, «Паэма пагашаных люстэркаў», паводле крытыкаў, нібыта звязаная з Чарнобылем. Але год напісання — 1981-ы (у 1991-м ён толькі дапоўніў яе). Болем адгукаюцца ў мяне словы пра горкі хлеб і ваду — яны ў нас былі палітыя слязамі. Мы з Алесем перажылі трагедыю — не стала нашага сыночка Андрэйкі. Гэта быў надзвычай складаны час у нашых адносінах. Абое былі як аголены правады. Кожны перажываў па-свойму, я ў слязах, Алесь замкнёны ў сабе. Супакоіць, падтрымаць адно аднаго не атрымлівалася. Алег Бембель на «пабедзе» свайго бацькі гадзінамі вазіў нас па горадзе, каб не заставаліся сам-насам. Сябры заходзілі...

Калі крыху супакоіліся, сталі вельмі беражлівыя і ласкава адносіцца адно да аднаго. Алесь неяк сказаў: «Прыслухайся, як мы гаворым — малачко, вулічка, куртачка...» Да мяне ён звяртаўся тады толькі так — «Галечка». Пазней — «наша матуля», што мне таксама падабалася, бо адчувалася ў гэтых словах і любоў, і клопат, і цеплыня, і ўтульнасць. Калі казаў «Галіна Мікалаеўна», мне хацелася запытаць: «Гэта ты каго маеш на ўвазе?» Нашу сям'ю ён называў «мае людзі» — гэта толькі родныя, самыя блізкія.

***— Ці ствараліся асаблівыя ўмовы для яго творчасці дома?***

— У нас было два пакоі, калі нарадзілася дачка, і я з ёй знаходзілася ў адным пакоі, а ён працаваў у другім. Алесь тады пайшоў з «Мастацкай літаратуры»: «Не хачу больш чытаць чужыя рукапісы. Хачу працаваць над сваімі». На што жыць, невядома. «Не турбуйся. Пражывём...» Дачка вучылася поўзаць, ёй было мала месца, але тату мы стараліся не турбаваць. Маленькі сын мог адчыняць дзверы ў яго пакой у любы час, і тады тата адкладаў у бок кнігу або нататнік і пачынаў весці з ім размовы, як з дарослым.

Амаль заўсёды расклад у Алеся быў больш-менш вольны, але была даволі строгая самаарганізацыя, ленавацца сабе ён не дазваляў. Змена дзейнасці адбывалася ў межах кватэры: нататнік — камп'ютар — кніга — другая кніга — другі пакой з іншымі кнігамі. Але ў крытычныя моманты, якая б ні была важная ці тэрміновая праца, Алесь быў побач і дапамагаў: гуляў з дзецьмі, вадзіў іх у школу, дзіцячы садок, лячыў, з задавальненнем мыў дзіцячую бялізну...

***— Яго цяжка ўявіць у побытавых справах...***

— Хатнія клопаты ў большасці выпадкаў ляжалі на маіх плячах. Але муж любіў, каб усё было дасканала — і спрыяў гэтаму так, што для мяне было радасцю нешта рабіць, арганізаваць. Памятаю, як у нас на кухні паклалі плітку. Тады яшчэ разеткі абыходзілі нейкімі кавалачкамі, і гэта было навідавоку. Ён прыйшоў: не надта прыгожа. Сядзеў усю ноч, не маючы прылад, нейкім чынам вырабіў акуратненькую рамачку з пліткі, а ўнутры паставіў разетку. Цяпер гляджу: гэта ніколі ніякім іншым рамонтам немагчыма перакрыць!

Калі ён за нешта браўся, то ўсё павінна было быць ідэальна. А каб узяўся, трэба было мне прыкласці пэўныя намаганні.

***— Ці шмат было такіх людзей, якія былі сябрамі вашай сям'і?***

— Не магу сказаць, што Алесь Сцяпанавіч быў надта адкрыты для сяброўства, хутчэй выбіральны. Затое вельмі шчыры ў адносінах. З Алесем Зайкам ён быў знаёмы яшчэ са студэнцтва ў Брэсцкім педінстытуце, і на працягу многіх гадоў у іх былі сяброўскія адносіны. З ім ён дзяліўся сваімі творчымі набыткамі і планамі. Тэма краязнаўства вельмі цікавіла абодвух. Для некаторых Разанаў быў больш чым сябра — сярод іх Ніна Мацяш, Зміцер Санько, Тодар Копша, Віктар Маркавец. Вера Палтаран называла яго Алеськам і адносілася як да сына. Калі бываў у Брэсце, абавязкова наведваў шаноўных Уладзіміра Андрэевіча Калесніка, а потым і яго жонку Зосю Міхайлаўну. Падараваны імі нам на вяселле чэшскі сервіз стаў нашай сямейнай каштоўнасцю.

З усімі шматлікімі сваякамі Алесь быў у добрых адносінах — яго вельмі любілі. Наша кватэра ў Мінску была месцам, куды маглі завітаць і блізкія, і знаёмыя. Пры гэтым вялікіх «тусоўак» ці застолляў Алесь пазбягаў. Святы мы звычайна адзначалі ў вузкім сямейным асяроддзі, якое з часам станавілася ўсё большым, што моцна радавала і радуе.

***— А як жа адзначалі яго Дзяржаўную прэмію па літаратуры?***

— Вельмі сціпла. Тэлефанавалі, віншавалі. Але асаблівай радасці ў яго не памятаю, толькі паведаміў: «Вось, прагаласавалі за мяне...» Куды больш важнымі для яго былі водгукі на кнігі, публікацыі. Бо кепска, калі маўчаць, значыць, не выклікала эмоцый, на якія разлічана. Згадваў часта, як адзін крытык ухваляў паэму «Упоцемках, з ліхтаром», другі — наадварот, моцна крытыкаваў. Чытаў уважліва сваіх крытыкаў і даследчыкаў: «Вось яму ўдалося нешта намацаць...» Пры гэтым ніколі не чула, каб зняважліва выказаўся пра некага, нават калі не падабалася. Ведаў, што зразумеюць яго, магчыма, не адразу, і спакойна да гэтага ставіўся.

Некалі я купіла яму куртку з лэйбачкай «Klassik». Пасмяяўся: «О, ты мяне ў класікі запісала? А як іншыя зрэагуюць на гэта?» Яго фота ў гэтай куртачцы змешчана ў кнізе «Вастрыё стралы» — дык гэты надпіс там зарэтушыравалі... Ён сам сабе нічога не купляў: «Даваяраю твайму густу». А я атрымлівала задавальненне і асалоду ад таго, што ён мне давярае. «А чаго ты так турбуешся, каб я добра выглядаў?» — «Хачу, каб ты падабаўся не толькі мне, але і іншым...»

***— Як жа ён мог паехаць у Германію без вас?***

— З'явілася такая магчымасць. З канца 80-х гадоў узніклі сувязі, яго пачалі перакладаць. Запрасілі на праект. Здаецца, першы зборнік паэзіі беларускага аўтара ў Германіі за апошнія некалькі дзясяткаў гадоў выдалі Разанава. Для яго гэта была падзея. Мы жылі ў прадчуванні, што гэта часова — наездамі ён бываў дома. А яму было важна ведаць, што яго любяць і чакаюць.

Іван нарадзіўся якраз тады, калі Алесь Сцяпанавіч быў у Германіі. Яму трэба было паехаць на прэзентацыю сваёй кнігі на нямецкай мове, якая выйшла ў Германіі. Ну і супала. Хацеў адмовіцца. Але я кажу: «Ці ж ты мне ў гэтым дапаможаш?» Суседка забірала мяне з сынам з радзільні, а праз тры дні і ён прыехаў.

Але Алесь Сцяпанавіч мог і мяне надоўга адпусціць у камандзіроўку, а сам заставаўся з дзецьмі, яны выдатна ладзілі. У яго быў поўны давер да дзяцей, пры гэтым прывучаў іх да адказнасці. Івана тата адвёў на каратэ — хлопцу гэта падабалася, таксама навучыў яго гуляць у шахматы. А з дачкой па дарозе ў гімназію яны вучылі вершы. Любімым Таніным паэтам ужо ў пачатковых класах быў Багдановіч. Дарэчы, разам з дачкой мы ездзілі ў Аўстрыю, калі Алесю Сцяпанавічу ўручалі прэмію Гердэра. Для нас гэта было вялікай радасцю і гонарам. А яму было прыемна, што мы сустрэліся, падзяліліі з ім урачысты момант. Потым дзеці ездзілі да таты ў Берлін на канікулы.

***— Але далёка ад дома з ім здарылася бяда...***

— Быў 2004 год, мне патэлефанавалі з Бона і сказалі, што Алесь у шпіталі, стан цяжкі. Дакументы мне вырабілі імгненна. З дзецьмі засталася Алесева сястра. Тры тыдні ў рэанімацыі — мяне туды штодня на некалькі гадзін прапускалі, потым кардыялагічнае аддзяленне ўніверсітэцкай клінікі, удзень я была заўсёды побач. Аднойчы пры мне яго стан пагоршыўся — урачы замітусіліся, папрасілі пачакаць у калідоры. Панікі, адчаю, слёз не было. Калі небяспека мінула і Алеся выпісалі, тады я ўжо стрымацца не змагла...

***— Ён пасля стаў больш уважлівы да свайго здароўя?***

— Ён наогул вёў здаровы лад жыцця. Любіў цішыню, лес — мы з задавальненнем на электрычках ездзілі ў грыбы. Шмат гуляў і дыхаў паветрам, нават у Германіі штодня ездзіў на ровары. Захапляўся філасофскімі вучэннямі і адмовіўся ўжываць мяса. Тыя ж галубцы я гатавала ў двух варыянтах — для сына і для мужа. Ён быў заўсёды падцягнуты. Не давяраў медыцыне, прытым што яго мама, сястра і наша дачка з ёй звязаныя, не хадзіў да ўрачоў. Глыбока верыў у тое, што нічога не канчаецца, а чалавек пераходзіць у іншы стан. Сястры Любе казаў пра гэта незадоўга да свайго сыходу — унутрана быў гатовы. Але паспеў паняньчыць унучку і блаславіў сына на шлюб...

Мы паставілі яму сціплы помнік на Паўночных могілках у Мінску — яго там можна наведаць. Ужо падрыхтаванае грунтоўнае выданне выбраных твораў, дзе прапанаваныя ўсе жанры, якія стварыў Алесь Разанаў, яго інтэрв'ю і публікацыі крытыкаў. А мне важна, каб была жывая памяць, як жывая яго душа. Таму я сабрала ўспаміны людзей, якія яго ведалі, і хацела б выдаць іх кнігай. Гэта мая даніна глыбокай павагі чалавеку, дзякуючы якому я пражыла 43 шчаслівыя гады.

У нас было вельмі насычанае жыццё. Шчырае, удзячнае. Вялікая павага і любоў да гэтага часу ўва мне, куды б я ні ішла і што б ні рабіла, ён са мной.

**Размаўляла Ларыса ЦІМОШЫК.**

# ЦУДОЎНАЯ СЯМЁРКА

## Героіка-патрыятычную тэматыку абмеркавалі ўдзельнікі музейнага форуму

**V Нацыянальны форум «Музеі Беларусі» сабраў у адным месцы больш за сотню музеяў. Госці распавядалі пра новыя праекты, формы работы, рарытэты, якія захоўваюць. Уражвалі касцюмамі, ідэямі. Нават за кароткі час паспявалі скараць сэрцы наведвальнікаў і даказваць, што сучасныя музеі перасталі быць выключна вітрынамі з экспанатамі. Яны ператварыліся ў даследчыцкія і адукацыйна-культурныя цэнтры.**

### У РАЙСКІМ САДЗЕ

З 1980-х гадоў галоўная захавальніца фондаў Веткаўскага музея стараабрадніцтва і беларускіх традыцый Святлана Лявонцьева вывучае традыцыю кнігапісання старавераў, якіх у XVII стагоддзі прытуліла беларуская зямля:

— У гэта немагчыма не ўлюбіцца. Вы быццам трапляеце ў райскі сад. Лепш за ўсё ўпрыгожваліся пеўчыя кнігі. Гэта невыпадкова. Арнамент — як своеасаблівы камертон, які павінен вашу душу настройваць на жаданне спяваць. Людзі адкрывалі кнігу і па старажытных нотах-круках павінны былі без усякага музычнага суправаджэння пачаць спяваць. У захапленні выканаўцы хацелі спяваць не горш, чым мастак афарміў такую кнігу.

На музейным форуме Святлана прадстаўляла праект «Карані і галіны. Мастацтва рукапіснай кнігі Веткі ў кантэксце еўрапейскай культуры», на рэалізацыю якога, дарэчы, быў атрыманы грант Прэзідэнта. Музейшчыкі вывучалі рукапісныя кнігі XVIII стагоддзя, створаныя ў Ветка-Старадубінскім рэгіёне. На жаль, многія з рукапісаў сёння знаходзяцца па-за межамі краіны. Даследчыкам давялося шмат працаваць у расійскіх музеях і архівах. У выніку яны даказалі, што ў Ветцы ўзнікла і развівалася адметнае мастацтва. Яны нават увялі ў навуковы абарот такія паняцці, як веткаўская школа пісьма ікон і веткаўскі стыль упрыгожвання рукапіснай кнігі. Калі глядзіш на старонкі старажытных кніг — уражвае багацце колераў і адценняў, складаныя арнаменты і шыкоўна аздобленыя буквіцы. Сваімі адкрыццямі музей шчодра дзеліцца: свет убачылі шыкоўныя мастацкія альбомы, друкуюцца паштоўкі і маляванкі для самых юных наведвальнікаў. Так, дзеці могуць паспрабаваць расфарбаваць узоры, скапіраваныя са стараабрадніцкіх рукапісных кніг, ці самастойна зрабіць малюнкі ў тэхніцы XVIII—XIX стагоддзяў. На аснове матэрыялаў, якія захоўвае музей у Ветцы, навучэнцы Гомельскага мастацкага каледжа робяць праекты. Аказалася, што стылізаваныя арнаменты з рукапісных кніг можна выкарыстоўваць для роспісу сучаснага посуду, дрэва. А яшчэ — пераносіць на тканіны і адзенне.

### ЖАНОЧЫЯ САКРЭТЫ

Дырэктар Шклоўскага раённага гісторыка-краязнаўчага музея Ларыса Сілівестрава, старшы навуковы супрацоўнік Ірына Гапеева і наглядчык Святлана Зарубіцкая на форуме вучылі наведвальнікаў, як насіць намітку (гэта вялікі кавалак тканіны 3—5 метраў, з якога складаўся галаўны убор). Цікавімся ў іх, ці праўда, што існуе больш за сто варыянтаў завязвання. «А можа, і больш, — пацвердзілі музейшчыцы. — Як арнамент распавядае пра чалавека, адкуль чалавек, пра яго род, так і намітка ў кожнай мясцовасці завязвалася па-свойму. Калі дзяўчына маладая, пры завязванні кавалак наміткі, які звісае, павінен быць доўгі, дзякуючы чаму дзяўчаты выглядалі стройнымі. Па намітцы можна было даведацца пра ўзрост жанчыны, яе сацыяльнае становішча, статус. У багатых сем'ях наміткі нават расшывалі золатам. Намітка суправаджала жанчыну ад нараджэння да апошняга дня. У яе прымалі нованароджанага, адзявалі на вяселлі, святы. Калі жанчына памірала, намітка сыходзіла з ёй».

На жаль, вельмі многае страчана. У фондзе Шклоўскага музея захавалася толькі адна арыгінальная старая намітка, і яе прэзентавалі на форуме, а таксама жанчыны прывезлі стагадовыя лапці. У музеі ладзяцца майстар-класы па завязванні лапцей, керамікі, вырабе лялек з ільну. Сёння ў музеі працуе маладая спецыялістка, якая ўмее працаваць з глінай, і таму музейшчыкі прывезлі цікавыя вырабы і ладзілі майстар-класы. А яшчэ ў іх экспазіцыі быў старадаўні абраз апосталаў Пятра і Паўла XIX стагоддзя.



### У КРАІНЕ САКУНОЎ

Старадарожскі гісторыка-этнаграфічны музей прэзентаваў праект «Гісторыя дарог і дарожнай службы». Так, праз інтэр'ер паштовай станцыі таксама можна вывучаць гісторыю горада. Цікавыя тэматычныя фотазоны, пераапранутыя ў тэлеграфістак і паштмайстра супрацоўнікі, адпаведныя заданні дазволяць наведвальнікам перанесціся ў XIX стагоддзе. Дарэчы, у гэтым музеі ёсць яшчэ адна цікавая экспазіцыя, прысвечаная быту беларусаў-сакуноў пачатку XX стагоддзя. Тут распавядаецца пра жыхароў, якіх этнограф Ісак Сербаў назваў «сакунамі». Яго ўразіла, як месцічы ў словах, дзе ў іншых рэгіёнах чуецца мяккае «ся», гаварылі цвёрдае «са»: «наеўса», «напіўса» . Па апісаннях Сербава створана і хата беларуса-сакуна. На тэрыторыі Старадарожчыны яшчэ засталіся носьбіты гэтай гаворкі, і часам на музейных занятках такую адметную мову выкарыстоўваюць і супрацоўнікі ўстановы.



### ВОДАРЫ ЛЕСУ

Мастоўшчына — маляўнічы куточак Прынёманскага краю з унікальнай прыродай і багатымі традыцыямі. Тут знаходзіцца Лепічанская пушча, і мясцовыя бабкі-знахаркі добра навучыліся карыстацца яе дарамі. Сакрэты лекавых зёлак вывучаюць супрацоўнікі музея «Лес і чалавек». Яны нарыхтоўваюць зёлкі, вывучаюць, частуюць наведвальнікаў духмянымі напоямі. Сёлета нават правялі фэст гарбаты і гаючых траў, які хацелі б зрабіць пастаянным. Музей працуе на экалагічнае выхаванне. Распрацаваны анімацыйныя праграмы і адукацыйныя заняткі, дзеці спасцігаюць «экалагічныя» сакрэты, вучацца жыць у гармоніі з прыродай. Так, як гэта рабілі нашы продкі. Тут ёсць і свая мурашыная ферма, і вермікампост з дажджавымі чарвякамі, дзякуючы якому дзеці бачаць, як адбываецца ўтварэнне біягумусу. Апошні на музейных занятках выкарыстоўваецца для высадкі пакаёвых раслін.

### ПРЫВІТАННЕ З ПАРТЫЗАНСКАЙ РЭСПУБЛІКІ

Супрацоўнікі Цэнтра гісторыі і культуры Акцябрскага раёна Гомельскай вобласці на форум прыехалі ў прыгожых народных касцюмах — дзяўчаты прэзентавалі фестываль «Берагіня», які ў раёне ладзіцца з 1999 года. «У нас можна навучыцца, як зберагаць фальклор і традыцыі, як правільна захаваць прадметы і як праз іх нешта распавесці», — расказвае дырэктар цэнтра Ларыса Саловіч. Так, калі ў сям'і нейкая традыцыя была перарваная, усе гэтыя прабелы ўмеюць запоўніць музейшчыкі. Да іх можна прыходзіць на святы, даведвацца пра сакрэты продкаў. Але не трэба забывацца, што гэты край у гады вайны называлі партызанскай Рудабельскай рэспублікай. У музеі ёсць экспазіцыі, прысвечаныя гэтаму перыяду гісторыі. У Год гістарычнай памяці тэма раскрываецца і праз выставу «Генацыд. Без тэрміну даўнасці», на якой прадстаўлены прадметы забітых у вайну людзей, знойдзеныя зусім нядаўна падчас раскопак.




### ПРАПУСКАЕМ ПРАЗ СЭРЦА

Музейшчыкі, якія прэзентавалі мемарыяльны комплекс «Хаваншчына», што створаны на месцы базіравання Брэсцкага абласнога партызанскага злучэння, сустракалі гасцей спевамі пад гукі акардэона, частавалі палявой кухняй і ўражвалі распаведамі пра побыт партызанаў.



— Калі ўсё прапускаеш праз сваё сэрца, абавязкова зможаш данесці інфармацыю і да наведвальніка. Музейны супрацоўнік сёння павінен і спяваць, і танцаваць, і на акардэоне іграць. Так мы прыўносім эмоцыі, — упэўнена Раіса Горбач — дырэктар Івацэвіцкага гісторыка-краязнаўчага музея.

— Яшчэ ў 1944 годзе партызаны вырашылі штогод збірацца на месцы былога партызанскага лагера. А ў 1971-м па іх просьбе там быў адкрыты мемарыяльны комплекс, пры гэтым выканана ўмова, якую паставілі ветэраны: ніякіх сучасных матэрыялаў, мармуру і бетону. Сёння каля адноўленых зямлянак праходзяць інтэрактыўныя праграмы, у якіх задзейнічаны як музейшчыкі, так і ўдзельнікі рэканструктарскага клуба, што створаны пры ўстанове. Музейшчыкі сабралі ўспаміны сведкаў, і праз асабістыя гісторыі спрабуюць дастукацца да кожнага наведвальніка. Каго пакіне абыякавым гісторыя пра сужэнцаў, у якіх у лесе ў сямейным партызанскім лагеры нарадзілася двое дзетак? Юныя наведвальнікі з цікавасцю слухаюць і пра жыццё равеснікаў у гады вайны. Напрыклад, што ў лясной школе дзеці стараліся добра вучыцца, каб самастойна напісаць слова «Перамога» ці прачытаць: «Вораг будзе разбіты. Перамога будзе за намі». Расповеды, як партызаны святкавалі Новы год і ладзілі для дзяцей ёлку, паказваюць: так узмацнялася ўпэўненасць, што наступіць мірнае жыццё і трэба зрабіць усё магчымае для Перамогі. У партызанскім лагеры гучала музыка. Лясныя вяры слухалі «Вальс пад небам Парыжа» ці спявалі «Партызанскую Кацюшу», словы якой сама прыдумалі і паклалі на вядомы матыў... І такіх гісторый з побыту, з чалавечых адносін у Раісы Іванаўны багата. Яна згадвае, як яе ўразіла, што ў 2006-м Хаваншчыну наведала толькі 216 чалавек за год, а ў 2019-м тут пабывала амаль 10 тысяч. За адзінаццаць месяцаў 2022 года Хаваншчына прыняла ўжо больш за 13 тысяч наведвальнікаў.

### ЛЮБІЦЬ РОДНУЮ ЗЯМЛЮ

— Сёння музейшчык і шавец, і кравец, і каваль, і стругаль, — заўважае Вія Гапеева. — Я дырэктар музея, і мая любімая роля — Бабы Ягі. У гэтым вобразе на фальклорных фестывалях я спяваю і іграю. Музей, па сваёй сутнасці, павінен стаць цэнтрам культуры. Як тэатр пачынаецца з вешалкі, так горад павінен пачынацца з музея. А яшчэ музейшчык вучыць мясцовых людзей любіць сваю зямлю. Мы пачынаем працаваць з малымі з дзіцячага садка. У нас ёсць наведвальнікі, якія з малечай ходзяць кожны месяц, я бачу, як растуць іх дзеці.

Вія Энаўна прадстаўляе Круглянскі гісторыка-краязнаўчы музей. Адзін з яго праектаў — «Музей у кожны двор». Падчас летніх канікул, калі на вуліцы многа дзяцей, музейшчыкі ходзяць па двавых тэрыторыях горада Круглае з незвычайным чамаданам. Расказваюць гісторыю раёна, пра традыцыі бабуль і дзядуляў, а яшчэ даюць патрымаць у руках прывезеныя з сабой музейныя экспанаты, сярод якіх — музычныя інструменты, зробленыя мясцовым майстрам. Пазней, калі музейшчыкі наведваюць вучняў у школах ці калі класы самі прыходзяць да іх на экскурсіі, дзеці з радасцю пазнаюць «музейную цётку».

Калі музейны работнік ідзе па вуліцы, а з ім вітаюцца мінакі — дзеці і дарослыя, — ці не гэта адзін з найлепшых паказальнікаў эфектыўнай працы ўстановы, яе пазнавальнасці?

**Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.**
**Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.**

# ПЯЦІГОДКА ДРУЖБЫ І БРАТЭРСТВА

**У Мінску прайшла справаздачна-выбарная канферэнцыя Беларускага таварыства дружбы і культурнай сувязі з замежнымі краінамі, на якой была падсумавана дзейнасць арганізацыі за апошнія пяць гадоў.**

Тэма народнай дыпламатыі, арганізацыі зносін паміж краінамі і народамі сёння носіць надзвычай актуальны характар. І гэтае перакананне гучала асноўным лейтматывам на справаздачна-выбарнай канферэнцыі ў Доме дружбы і ў дакладзе старшыні праўлення Ніны ІВАНОВАЙ, і ў выступленнях кіраўнікоў асобных таварыстваў, а таксама кіраўнікоў абласных аддзяленняў грамадскай арганізацыі.

Сапраўды, нягледзячы на пандэмію, розныя складанасці міждзяржаўных зносін, на неспрыяльную міжнародную абстаноўку, арганізатарамі народнай дыпламатыі зроблена даволі шмат розных карысных спраў. І дзеля аздараўлення дзяцей Беларусі ў іншых краінах, і па падтрымцы айчыннай медыцыны ў частцы набыцця тэхнікі за кошт замежных партнёраў...



Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.

І ў арганізацыі культурна-асветніцкай працы па знаёмстве з гісторыяй, культурай, традыцыямі народаў іншых краін. Старшыня праўлення ў сваім дакладзе адзначыла асаблівую руплівасць такіх міжкраінавых таварыстваў, як «Беларусь — Кітай» (старшыня таварыства — дырэктар Рэспубліканскага інстытута кітаязнаўства імя Канфуцыя Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, кандыдат гістарычных навук Анатоль ТОЗІК), «Беларусь — Японія», «Беларусь — Індыя», «Беларусь — Малдова», «Беларусь — Таджыкістан», «Беларусь — Сербія», «Беларусь — Казахстан», «Беларусь — Ізраіль»...

Сваімі развагамі аб удзеле грамадскасці ў развіцці дыпламатычных зносін, ва ўмацаванні міждзяржаўных зносін падзяліліся вядомы палітык, вучоны Сяргей РАХМАНАЎ, пісьменнік, перакладчык Анатоль БУТЭВІЧ, намеснік старшыні таварыства «Беларусь — Кітай», журналістка, публіцыст, заслужаны дзеяч культуры Рэспублікі Беларусь Аліна ГРЫШКЕВІЧ, іншыя аўтарытэтныя грамадскія дзеячы. Варта зазначыць, што ў працы Беларускага таварыства дружбы і культурнай сувязі з замежнымі краінамі традыцыйна актыўны ўдзел прымаюць пісьменнікі Беларусі: шмат хто з іх удзельнічаў у рабоце канферэнцыі — драматург Аляксей ДУДАРАЎ, празаік і публіцыст Зіновій ПРЫГОДЗІЧ, паэт, перакладчык Навум ГАЛЬПЯРОВІЧ, старшыня Саюза пісьменнікаў Беларусі Алесь КАРЛЮКЕВІЧ, перакладчык, публіцыст, літаратуразнавец Іван ЧАРОТА, старшыня Мінскага гарадскога аддзялення СПБ Міхась ПАЗНЯКОЎ, літаратуразнавец, коласазнавец Марыя МІЦКЕВІЧ...

Ішла размова і пра перспектывы развіцця і ў дзейнасці таварыства, і ўвогуле ў пашырэнні дыпламатычных зносін з замежнымі краінамі. Запланавана адкрыццё новых таварыстваў дружбы, вызначаны пэўныя асветніцкія і культурныя праекты. Звернута ўвага на абсягі працы ў маладзёжным асяроддзі.

На справаздачна-выбарнай канферэнцыі выбраны новы склад праўлення, а таксама старшыня праўлення — сваю падтрымку дэлегаты канферэнцыі з розных куткоў краіны адзінагалосна выказалі Ніне Сямёнаўне ІВАНОВАЙ, адзначыўшы яе аўтарытэт, высокія арганізатарскія здольнасці, уменне выбудаваць галоўныя стратэгічныя памкненні ў сферы народнай дыпламатыі.

**Сяргей ШЫЧКО.**

# ПРАВІЛЫ ПРАВЯДЗЕННЯ РЭКЛАМНАЙ ГУЛЬНІ «ЗВЯЗДА» САГРАВАЕ!»

## I. АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

1. Рэкламная гульня пад назвай «Звязда» саграваe!» (далей — Гульня) праводзіцца на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь у адпаведнасці з гэтымі Правіламі тэрмінам з 7 снежня 2022 года па 31 сакавіка 2023 года ўключна з мэтай стымулявання росту падпіскі на газету «Звязда» на першы квартал ці першае паўгоддзе 2023 года.

2. Арганізатар Гульні — рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда» (далей — Установа), месца знаходжання: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А, УНП 100155376.

## II. ПРЫЗАВЫ ФОНД ГУЛЬНІ

3. Прызавы фонд рэкламнай гульні «Звязда» саграваe!» сфарміраваны за кошт маёмасці арганізатара гульні — рэдакцыйна-выдавецкай установы «Выдавецкі дом «Звязда» — і складаецца з наступных рэчаў:

| № п/п | Назва | Колькасць (шт.) | Цана за шт. з ПДВ, руб. кап. | Усяго з ПДВ, руб. кап. |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 1 Канвектар Ballu Enzo BEC/EZMR-500 (далей — суперпрыз) | 1 | 139,00 | 139,00 |
| 2 | Плед TexRepublic Новыя ўзоры TF FN F120 а 1520/26218 (фіялетавы/бэзавы) (далей — прыз) | 7 | 51,755 | 362,29 |

УСЯГО прызавы фонд рэкламнай гульні «Звязда» саграваe!» складае 501,29 (пяцьсот адзін) рубель дваццаць дзевяць капеек.

## III. УМОВЫ ЎДЗЕЛУ Ў ГУЛЬНІ

4. Рэкламная гульня «Звязда» саграваe!» праводзіцца з мэтай стымулявання росту падпіскі на газету «Звязда» на першы квартал ці першае паўгоддзе 2023 года.

5. Удзельнікам Гульні можа быць любы грамадзянін Рэспублікі Беларусь, які пастаянна пражывае на яе тэрыторыі і які аформіў і аплаціў падпіску на газету «Звязда» на першы квартал ці першае паўгоддзе 2023 года.

6. Падставай для ўдзелу ў Гульні з'яўляецца дасланая падпісчыкам на адрас Установы ў перыяд з 7 снежня па 16 студзеня 2023 года выразаная з газеты або з дадатковага ўкладыша запоўненая картка ўдзельніка — падпісчыка «Звязды», якая змяшчаецца ў газеце не менш чым раз на тыдзень у перыяд з 7 снежня па 10 студзеня 2023 года.

7. Адзін падпісчык можа даслаць толькі адну картку ўдзельніка. Падпісчык, які даслаў больш за адну картку ўдзельніка, выключаецца з Гульні.

8. Карткі ўдзельніка, наклееныя на паперу ці плёнку, адксеракапіраваныя або тыя, якія паступілі Установе пасля 16 студзеня 2023 года па паштовым штэмпелі атрымання, да ўдзелу ў Гульні не прымаюцца.

## IV. СКЛАД КАМІСІІ ПА ПРАВЯДЗЕННІ ГУЛЬНІ

9. Для правядзення Гульні «Звязда» саграваe!» Установа стварае камісію па правядзенні рэкламнай гульні (далей — Камісія) у наступным складзе:

Крачава Наталля Ільінічна — намеснік дырэктара рэдакцыйна-выдавецкай установы. «Выдавецкі дом «Звязда» — старшыня Камісіі.

Члены Камісіі:

Южык Жанна Міхайлаўна — галоўны таваразнавец РУП «Белдрук»;

Ганцарэвіч Святлана Міхайлаўна — загадчык аддзела рэалізацыі рэдакцыйна-выдавецкай установы «Выдавецкі дом «Звязда»;

Доўнар Валянціна Аркадзьеўна — рэдактар аддзела рэдакцыі газеты «Звязда» рэдакцыйна-выдавецкай установы «Выдавецкі дом «Звязда»;

Брашко Алег Мікалаевіч — загадчык адміністрацыйна-гаспадарчага сектара рэдакцыйна-выдавецкай установы «Выдавецкі дом «Звязда».

10. Асобы, якія ўваходзяць у склад Камісіі, не могуць быць удзельнікамі гэтай Гульні.

## V. ПАРАДАК РОЗЫГРЫШУ ПРЫЗОЎ. ПАВЕДАМЛЕННЕ ПЕРАМОЖЦАМ

11. Розыгрыш прызоў ажыццяўляецца на пасяджэнні Камісіі 20 студзеня 2023 года ў 12 гадзін у памяшканні Установы па адрасе: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А.

12. Перад пачаткам розыгрышу карткі ўдзельнікаў сартуюцца па абласцях і горадзе Мінску, змяшчаюцца ў асобныя прасторныя скрыні і старанна перамешваюцца.

13. Асобна для кожнай вобласці і для горада Мінска разыгрываюцца 7 прызоў (па аднаму для кожнага).

Затым усе карткі змяшчаюцца ў адну скрыню, перамешваюцца і сярод удзельнікаў разыгрываецца суперпрыз.

14. Пераможцам Гульні, які выйграў прыз, лічыцца ўдзельнік, чыё прозвішча напісана на дасланай ім картцы ўдзельніка, якую пры розыгрышы кожнага асобнага прыза выцягне выпадковым чынам са скрыні хто-небудзь з запрошаных удзельнікаў Гульні, прадстаўнікоў незалежных арганізацый або члены Камісіі. На кожнай такой картцы ўдзельніка надпісваецца выйграны прыз і распісваюцца члены Камісіі.

15. Вынікі розыгрышу прызоў афармляюцца пратаколам і публікуюцца да 28 студзеня 2023 года ўключна ў газеце «Звязда».

Установа ў тэрмін да 28 студзеня 2023 года дасылае пераможцам паведамленне аб выйграным прызе заказным пісьмом з указаннем тэрміну яго атрымання.

## VI. МЕСЦА, ПАРАДАК І ТЭРМІН ВЫДАЧЫ ПРЫЗОЎ

16. Умовай выдачы прызоў і суперпрыза з'яўляецца прад'яўленне пераможцам пашпарта або дакумента, які пацвярджае асобу, і арыгінала абанемента або квітанцыі аб падпісцы на газету «Звязда» на першы квартал ці першае паўгоддзе 2023 года.

Пры звяртанні па атрыманне прыза або суперпрыза прадстаўніка пераможцы ён павінен прад'явіць даверанасць на атрыманне прыза або суперпрыза, пашпарт і арыгінал абанемента або квітанцыі аб падпісцы на газету «Звязда» на першы квартал ці першае паўгоддзе 2023 года.

17. Адсутнасць у пераможцы, які выйграў прыз або суперпрыз, абанемента або квітанцыі аб падпісцы на газету «Звязда» на першы квартал ці першае паўгоддзе 2023 года з'яўляецца падставай для адмовы ў выдачы яму прыза або суперпрыза ў сувязі з тым, што ён не адпавядае патрабаванням, якія прад'яўляюцца да ўдзельніка Гульні пунктам 5 гэтых Правілаў.

18. Прызы і суперпрыз выдаюцца пераможцам у тэрмін па 31 сакавіка 2023 года ў памяшканні ўстановы па адрасе: г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А, з 9.00 да 13.00 і з 14.00 да 17.00, з панядзелка па суботу (выдачу ў суботу неабходна ўзгадніць з арганізатарам Гульні па тэлефонах: (017) 271 81 53, 311 17 40, для атрымання прапускных дакументаў). Расходы, звязаныя з прыездам пераможцаў па атрыманне прыза або суперпрыза, установа не аплачвае.

19. Выплата грашовага эквіваленту кошту рэчавага прыза або замена яго на іншы прыз не дапускаецца.

20. Пасля 31 сакавіка 2023 года выдача прызоў спыняецца і прэтэнзіі ўдзельнікаў не прымаюцца.

## VII. ЗАКЛЮЧНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

21. Пераможцы Гульні нясуць адказнасць за прадстаўленне падатковай справаздачнасці і за выплату ўсіх падаткаў, якія прадугледжаны дзейным заканадаўствам Рэспублікі Беларусь у сувязі з атрыманнем прызоў.

22. Пераможцы Гульні і іх сваякі згаджаюцца з тым, што іх імёны, прозвішчы, імёны па бацьку, фатаграфіі, лісты і інтэрв'ю могуць быць выкарыстаны Установай у любых рэкламных і/або інфармацыйных матэрыялах, якія звязаны з Гульнёй. Яны таксама згаджаюцца даваць інтэрв'ю і здымацца для рэкламных матэрыялаў у сувязі з Гульнёй без выплаты якога-небудзь дадатковага ўзнагароджання. Усе правы на такія публікацыі належаць Установе.

23. Правілы правядзення рэкламнай гульні «Звязда» саграваe!» да пачатку рэкламнай гульні будуць апублікаваны сумесна з рэквізітамі іх дзяржаўнай рэгістрацыі ў газеце «Звязда».

24. Даведкі, якія датычацца гэтай Гульні, можна атрымаць па тэлефонам: (017) 271 81 53, 311 17 40.

*Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі № 4265 ад 01.12.2022 г., выдадзена Міністэрствам антыманапольнага рэгулявання і гандлю Рэспублікі Беларусь.*

**РУП «Институт недвижимости и оценки» (Гродненский филиал)**

**информирует о проведении повторного открытого аукциона по продаже имущества, принадлежащего Гродненскому областному потребительскому обществу**

**Аукцион состоится 16.12.2022 г. в 10.00 по адресу: г. Щучин, ул. Пушкина, 26. Телефон для справок 55-87-71**

| Лот № 1 | |
|---|---|
| **Наименование, характеристика предмета аукциона, местонахождение предмета аукциона** | ЛОТ № 1: капитальное строение, инв. № 422/С-40159 (назначение – здание специализированное для производства продуктов питания, включая напитки, и табака, наименование – квасильно-засолочный склад), площадью 302,9 кв. м, расположенное по адресу: г. Щучин, ул. Пионерская, 5А (доля в праве 2/5). Лот № 1 расположен на земельном участке, кадастровый номер 425850100001000337, площадью 0,0574 га (назначение – для обслуживания квасильно-засолочного склада) по адресу: г. Щучин, ул. Пионерская, 5А (доля в праве 2/5). Земельный участок имеет ограничения (обременения) прав в использовании: земельные участки, расположенные в водоохранных зонах рек и водоемов, код – 2.4, площадью 0,0574 га; земельные участки, расположенные в охранных зонах электрических сетей, код – 5.2, площадью 0,0004 га |
| **Начальная цена продажи** | 3 900 руб. (три тысячи девятьсот рублей) с учетом НДС |
| **Сумма задатка** | 390 руб. (триста девяносто рублей) |
| **Реквизиты для перечисления задатка** | BY44BLBB30120500833225001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка BLBBBY2X, УНП 500833225 |
| **Место, дата и время окончания приема заявлений** | Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 208, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница). Обед с 12.30 до 13.18. **Последний день приема заявлений – 14.12.2022 г. до 15.00** |
| Объявление о проведении первого аукциона было размещено в газете «Звязда» от 16.12.2021 г. | |
| Порядок оформления участия в аукционе, порядок его проведения, а также определения лица, выигравшего аукцион, содержатся в информации о проведении аукциона, опубликованной на сайте Организатора аукциона – https://grino.by/auktsiony/ | |

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

**Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Уша» (продавец) проводит открытый аукцион по продаже имущества в составе:**

Лот № 1: **комбайн картофелеуборочный ПКК-2-05 «РТ 25» 2009 года выпуска, заводской номер 46, инвентарный номер 01040166, страна происхождения – Беларусь.**
**Начальная цена** с НДС (20 %) – **47 520,00** бел. руб. (задаток 10 % от начальной цены – **4 752,00** бел. руб.).

Лот № 2: **ботвоуборочная машина БМК-4-75 2010 года выпуска, инвентарный номер 01040266, страна происхождения – Беларусь.**
**Начальная цена** с НДС (20 %) – **6 000,00** бел. руб. (задаток 10 % от начальной цены – **600,00** бел. руб.).

Лот № 3: **гребнеобразователь ГР 4-02 2011 года выпуска, заводской номер 016, инвентарный номер 01040272, страна происхождения – Беларусь.**
**Начальная цена** с НДС (20 %) – **8 160,00** бел. руб. (задаток 10 % от начальной цены – **816,00** бел. руб.).

Лот № 4: **конвейер телескопический КТ-40 2011 года выпуска, инвентарный номер 01040279, страна происхождения – Беларусь.**
**Начальная цена** с НДС (20 %) – **10 320,00** бел. руб. (задаток 10 % от начальной цены – **1 032,00** бел. руб.).

Лот № 5: **стол переборочный СПР-10 2011 года выпуска, инвентарный номер 01040279, страна происхождения – Беларусь.**
**Начальная цена** с НДС (20 %) – **9 480,00** бел. руб. (задаток 10 % от начальной цены – **948,00** бел. руб.).

**Местонахождение: Минская область, Березинский район, д. Котово.**

**Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ОАО «Сбер Банк», г. Минск, ул. Чкалова, 18/1, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, ОКПО 29250255, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации», код платежа – 40901 OTHR.**

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объекта производится в течение 20 (двадцати) банковских дней со дня проведения аукциона, если иное не предусмотрено договором купли-продажи.

Победитель аукциона (единственный участник аукциона) оплачивает организатору аукциона вознаграждение за организацию и проведение торгов в следующем размере: по лоту № 1 – 5 (пяти) процентов от окончательной цены продажи предмета аукциона, по лотам №№ 2–5 – 10 (десяти) процентов от окончательной цены продажи предмета аукциона и возмещает продавцу затраты на публикацию извещения о проведении аукциона.

Электронные торги проводятся в порядке, установленном постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 12.07.2013 г. № 608 и регламентом электронной торговой площадки «TORGI.RLT.BY», размещенным по адресу: torgi.rlt.by.

Информация о проводимых электронных торгах опубликована на сайтах: **rlt.by, torgi.rlt.by.**

Электронные торги состоятся **10.01.2023** в **11.00**.

Заявления с прилагаемыми к ним документами на участие в электронных торгах принимаются не позднее **05.01.2023** до **17.00.**

**Тел.: (8017) 516-80-65, 516-80-64, (8029) 102-21-17, 136-31-11.**
**Тел. для осмотра (8044) 738-17-50.**

УНН 600036505

## ИЗВЕЩЕНИЕ О НАЛИЧИИ ОСНОВАНИЙ ДЛЯ ПРИЗНАНИЯ ЖИЛОГО ДОМА ПУСТУЮЩИМ

Богушевичский сельский исполнительный комитет извещает, что постоянно действующей комиссией по обследованию состояния жилых домов, расположенных на территории Березинского района, в ходе обследования выявлен жилой дом, расположенный по адресу: **Минская область, Березинский район, д. Якшицы, д. 24** (полный адрес указан согласно похозяйственным книгам), **имеющий основания для признания его пустующим.**

**Сведения о жилом доме (из акта):**
Наружные размеры одноквартирного жилого дома: 6,1 х 8,5 м.
Площадь: 52,1 кв. м.
Дата ввода в эксплуатацию одноквартирного жилого дома: 1992.
Материал стен: кирпич.
Этажность: одноэтажный.

На придомовой территории не осуществляются предусмотренные законодательством мероприятия по охране земель.

Не соблюдаются требования к содержанию (эксплуатации) территории.

Сведения о лицах, включая наследников, которым, предположительно, одноквартирный жилой дом принадлежит на праве собственности, хозяйственного ведения или оперативного управления, иных лицах, имеющих право владения и пользования им (ей): Мезенцева (Осмоловская) Елена Георгиевна.

Предположительный срок непроживания в одноквартирном жилом доме собственника, иных лиц, имеющих право владения и пользования этим домом: более 20 лет.

От лиц, имеющих право пользования жилым домом, в Березинский сельский исполнительный комитет не поступило уведомлений о намерении использовать такой дом для проживания.

Богушевичский сельский исполнительный комитет просит всех заинтересованных лиц в течение двух месяцев со дня опубликования извещения уведомить Богушевичский сельский исполнительный комитет о намерении использовать пустующий дом для проживания.

Телефоны для справок: 801715 6 21 40, 801715 6 20 99, 801715 6 20 98.

## О ПОИСКЕ ПРАВООБЛАДАТЕЛЕЙ ОДНОКВАРТИРНОГО ЖИЛОГО ДОМА

**д. Якшицы Березинского района Минской области**

Богушевичский сельский исполнительный комитет в целях реализации Указа Президента Республики Беларусь от 24 марта 2021 г. № 116 «Об отчуждении жилых домов в сельской местности и совершенствовании работы с пустующими домами» разыскивает собственников, наследников и лиц, имеющих право пользования жилым домом: Минская область, Березинский район, д. Якшицы, д. 24 (полный адрес указан согласно похозяйственным книгам).

Сельисполком просит граждан, располагающих информацией о собственниках, наследниках и лицах, имеющих право пользования жилым домом, о месте их фактического проживания, сообщить в Богушевичский сельисполком по телефонам: 8 01715 6 21 40, 801715 6 20 98, 801715 6 20 99 (с 8.00 до 17.00 по рабочим дням).

Также информацию можно прислать по адресу: 223311, Минская область, Березинский район, аг. Богушевичи, ул. Коваленка, 63.

Электронный адрес: boqushss@berezino.minsk-region.gov.by

## ИЗВЕЩЕНИЕ О НАЛИЧИИ ОСНОВАНИЙ ДЛЯ ПРИЗНАНИЯ ЖИЛОГО ДОМА ПУСТУЮЩИМ

Богушевичский сельский исполнительный комитет извещает, что постоянно действующей комиссией по обследованию состояния жилых домов, расположенных на территории Березинского района, в ходе обследования выявлен жилой дом, расположенный по адресу: **Минская область, Березинский район, д. Якшицы, д. 7** (полный адрес указан согласно похозяйственным книгам), **имеющий основания для признания его пустующим.**

**Сведения о жилом доме (из акта):**
Наружные размеры одноквартирного, жилого дома: 5,1 х 5,1 м.
Площадь: 25,0 кв. м.
Дата ввода в эксплуатацию одноквартирного жилого дома: 1966.
Материал стен: дерево.
Этажность: одноэтажный.

На придомовой территории не осуществляются предусмотренные законодательством мероприятия по охране земель.

Не соблюдаются требования к содержанию (эксплуатации) территории.

Сведения о лицах, включая наследников, которым, предположительно, одноквартирный жилой дом принадлежит на праве собственности, хозяйственного ведения или оперативного управления, иных лицах, имеющих право владения и пользования им (ей) отсутствуют.

Предположительный срок непроживания в одноквартирном, жилом доме собственника, иных лиц, имеющих право владения и пользования этим домом: более 22 лет.

От лиц, имеющих право пользования жилым домом, в Богушевичский сельский исполнительный комитет не поступило уведомлений о намерении использовать такой дом для проживания.

Богушевичский сельский исполнительный комитет просит всех заинтересованных лиц в течение одного месяца со дня получения или двух месяцев со дня опубликования извещения уведомить Богушевичский сельский исполнительный комитет о намерении использовать пустующий дом для проживания.

Телефоны для справок: 801715 6 21 40, 801715 6 20 99, 801715 6 20 98.

## О ПОИСКЕ ПРАВООБЛАДАТЕЛЕЙ ОДНОКВАРТИРНОГО ЖИЛОГО ДОМА

**д. Якшицы, д. № 7 Березинского района Минской области**

Богушевичский сельский исполнительный комитет в целях реализации Указа Президента Республики Беларусь от 24 марта 2021 г. № 116 «Об отчуждении жилых домов в сельской местности и совершенствовании работы с пустующими домами» разыскивает собственников, наследников и лиц, имеющих право пользования жилым домом: Минская область, Березинский район, д. Якшицы (полный адрес указан согласно похозяйственным книгам).

Сельисполком просит граждан, располагающих информацией о собственниках, наследниках и лицах, имеющих право пользования жилым домом, о месте их фактического проживания, сообщить в Богушевичский сельисполком по телефонам: 8 01715 6 21 40, 801715 6 20 98, 801715 6 20 99 (с 8.00 до 17.00 по рабочим дням).

Также информацию можно прислать по адресу: 223311, Минская область, Березинский район, аг. Богушевичи, ул. Коваленка, 63.

Электронный адрес: boqushss@berezino.minsk-region.gov.by.

## ИЗВЕЩЕНИЕ О НАЛИЧИИ ОСНОВАНИЙ ДЛЯ ПРИЗНАНИЯ ЖИЛОГО ДОМА ПУСТУЮЩИМ

Богушевичский сельский исполнительный комитет извещает, что постоянно действующей комиссией по обследованию состояния жилых домов, расположенных на территории Березинского района, в ходе обследования выявлен жилой дом, расположенный по адресу: **Минская область, Березинский район, д. Осмоловка, ул. Парковая, д. 14** (полный адрес указан согласно похозяйственным книгам), **имеющий основания для признания его пустующим.**

**Сведения о жилом доме (из акта):**
Наружные размеры одноквартирного жилого дома: 6,0 х 12,0 м.
Площадь: 72,0 кв. м.
Дата ввода в эксплуатацию одноквартирного жилого дома: 1965.
Материал стен: дерево.
Этажность: одноэтажный.

На придомовой территории не осуществляются предусмотренные законодательством мероприятия по охране земель.

Не соблюдаются требования к содержанию (эксплуатации) территории.

Одноквартирный блокированный жилой дом находится в аварийном состоянии.

Сведения о лицах, включая наследников, которым, предположительно, одноквартирный жилой дом принадлежит на праве собственности, хозяйственного ведения или оперативного управления, иных лицах, имеющих право владения и пользования им (ей) отсутствуют

Предположительный срок непроживания в одноквартирном жилом доме собственника, иных лиц, имеющих право владения и пользования этим домом: более 11 лет.

От лиц, имеющих право пользования жилым домом, в Богушевичский сельский исполнительный комитет не поступило уведомлений о намерении использовать такой дом для проживания.

Богушевичский сельский исполнительный комитет просит всех заинтересованных лиц в течение одного месяца со дня получения или двух месяцев со дня опубликования извещения, уведомить Богушевичский сельский исполнительный комитет о намерении использовать пустующий дом для проживания.

Телефоны для справок: 801715 6 21 40, 801715 6 20 99, 801715 6 20 98.

## О ПОИСКЕ ПРАВООБЛАДАТЕЛЕЙ ОДНОКВАРТИРНОГО ЖИЛОГО ДОМА

**д. Осмоловка Березинского района Минской области**

Богушевичский сельский исполнительный комитет в целях реализации Указа Президента Республики Беларусь от 24 марта 2021 г. № 116 «Об отчуждении жилых домов в сельской местности и совершенствовании работы с пустующими домами» разыскивает собственников, наследников и лиц, имеющих право пользования жилым домом: Минская область, Березинский район, д. Осмоловка, ул. Парковая, д. 14 (полный адрес указан согласно похозяйственным книгам).

Сельисполком просит граждан, располагающих информацией о собственниках, наследниках и лицах, имеющих право пользования жилым домом, о месте их фактического проживания сообщить в Богушевичский сельисполком по телефонам: 8 01715 6 21 40, 801715 6 20 98, 801715 6 20 99 (с 8.00 до 17.00 по рабочим дням).

Также информацию можно прислать по адресу: 223311, Минская область, Березинский район, аг. Богушевичи, ул. Коваленка, 63.

Электронный адрес: boqushss@berezino.minsk-region.gov.by.

## ИЗВЕЩЕНИЕ О НАЛИЧИИ ОСНОВАНИЙ ДЛЯ ПРИЗНАНИЯ ЖИЛОГО ДОМА ПУСТУЮЩИМ

Богушевичский сельский исполнительный комитет извещает, что постоянно действующей комиссией по обследованию состояния жилых домов, расположенных на территории Березинского района, в ходе обследования выявлен жилой дом, расположенный по адресу: **Минская область, Березинский район, д. Осмоловка, ул. Парковая, д. 30** (полный адрес указан согласно похозяйственным книгам), **имеющий основания для признания его пустующим.**

**Сведения о жилом доме (из акта):**
Наружные размеры одноквартирного жилого дома: 6,1 х 6,9 м.
Площадь: 42,0 кв. м.
Дата ввода в эксплуатацию одноквартирного жилого дома: 1968.
Материал стен: дерево.
Этажность: одноэтажный.

На придомовой территории не осуществляются предусмотренные законодательством мероприятия по охране земель.

Не соблюдаются требования к содержанию (эксплуатации) территории.

Одноквартирный блокированный жилой дом находится в аварийном состоянии и грозит обвалом.

Сведения о лицах, включая наследников, которым, предположительно, одноквартирный жилой дом принадлежит на праве собственности, хозяйственного ведения или оперативного управления, иных лицах, имеющих право владения и пользования им (ей) отсутствуют.

Предположительный срок непроживания в одноквартирном жилом доме собственника, иных лиц, имеющих право владения и пользования этим домом: более 30-ти лет.

От лиц, имеющих право пользования жилым домом, в Богушевичский сельский исполнительный комитет не поступило уведомлений о намерении использовать такой дом для проживания.

Богушевичский сельский исполнительный комитет просит всех заинтересованных лиц в течение одного месяца со дня получения или двух месяцев со дня опубликования извещения уведомить Богушевичский сельский исполнительный комитет о намерении использовать пустующий дом для проживания.

Телефоны для справок: 801715 6 21 40, 801715 6 20 99, 801715 6 20 98.

## О ПОИСКЕ ПРАВООБЛАДАТЕЛЕЙ ОДНОКВАРТИРНОГО ЖИЛОГО ДОМА

**д.Осмоловка Березинского района Минской области**

Богушевичский сельский исполнительный комитет в целях реализации Указа Президента Республики Беларусь от 24 марта 2021 г. № 116 «Об отчуждении жилых домов в сельской местности и совершенствовании работы с пустующими домами» разыскивает собственников, наследников и лиц, имеющих право пользования жилым домом: Минская область, Березинский район, д. Осмоловка, ул. Парковая, д. 30 (полный адрес указан согласно похозяйственным книгам).

Сельисполком просит граждан, располагающих информацией о собственниках, наследниках и лицах, имеющих право пользования жилым домом, о месте их фактического проживания, сообщить в Богушевичский сельисполком по телефонам: 8 01715 6 21 40, 801715 6 20 98, 801715 6 20 99 (с 8.00 до 17.00 по рабочим дням).

Также информацию можно прислать по адресу: 223311, Минская область, Березинский район, аг. Богушевичи, ул. Коваленка, 63.

Электронный адрес: boqushss@berezino.minsk-region.gov.by.

## ИЗВЕЩЕНИЕ О НАЛИЧИИ ОСНОВАНИЙ ДЛЯ ПРИЗНАНИЯ ЖИЛОГО ДОМА ПУСТУЮЩИМ

Богушевичский сельский исполнительный комитет извещает, что постоянно действующей комиссией по обследованию состояния жилых домов, расположенных на территории Березинского района, в ходе обследования выявлен жилой дом, расположенный по адресу: **Минская область, Березинский район, аг. Богушевичи** (д. Богушевичи – полный адрес указан согласно похозяйственным книгам), **имеющий основания для признания его пустующим.**

**Сведения о жилом доме (из акта):**
Наружные размеры одноквартирного жилого дома: 6,0 х 10,0 м.
Площадь: 60,0 кв. м.
Дата ввода в эксплуатацию одноквартирного жилого дома: 1966.
Материал стен: дерево.
Этажность: одноэтажный.

На придомовой территории не осуществляются предусмотренные законодательством мероприятия по охране земель.

Не соблюдаются требования к содержанию (эксплуатации) территории.

Сведения о лицах, включая наследников, которым, предположительно, одноквартирный, жилой дом принадлежит на праве собственности, хозяйственного ведения или оперативного управления, иных лицах, имеющих право владения и пользования им (ей): Дорожко Зинаида Павловна и Дорожко Алексей Павлович.

